Сталіца рыхтуецца да Чэмпіянату свету па хакеі

Калі настаўнік — больш чым прафесія

«Летапіс напояў»: квас, кляновік, медавуха…

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 СНЕЖНЯ 2013 г. СЕРАДА № 238 (27603) Кошт 1800 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

МС СТАР.4 СТАР.6

СУР'ЁЗНЫЯ І АДКАЗНЫЯ ЗАДАЧЫ

Прэзідэнт Беларусі для выбрання на пасаду старшыні праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў узгадніў кандыдатуру Валерыя Мікалаевіча Іванова. Аб гэтым паведаміў учора кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кабякоў, прадстаўляючы Валерыя Іванова калектыву Белкаапсаюза, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Андрэй Кабякоў нагадаў, што ў самым пачатку бягучага года прайша вялікая нарада з удзелам кіраўніка дзяржавы па пытаннях Белкаапсаюза, на якой Прэзідэнт абазначыў асноўныя праблемы, што патрабуюць павышанай увагі.

Белкаапсаюз па-ранейшаму здае шэраг пазіцый на ўнутраным спажывецкім рынку, гэта датычыцца аб'ёмаў рознічнага гандлю, прамысловай вытворчасці, нарыхтовак. Найбольш вострай праблемай застаецца якасць абслугоўвання. У глыбінцы людзі шчыра гавораць аб недахопах у рабоце сельскіх магазінаў і нарыхтоўчых прадпрыемстваў спажывецкай кааперацыі, непарадках на рынках. Значная частка тавараабароту арганізацый спажывецкай кааперацыі складваецца за кошт рэалізацыі хлеба, алкагольных напіткаў, тытунёвых вырабаў і цукру. У структуры тавараабароту невысокая доля такіх неабходных нехарчовых тавараў, як адзенне і абутак, складатэхнічныя тавары. Важнай задачай для спажывецкай кааперацыі застаецца стварэнне адзінай сістэмы аптовых закупак. Кіраўнік дзяржавы крытыкаваў і нарыхтоўчую галіну Белкаапсаюза, нагадаў Андрэй Кабякоў.

Белкаапсаюз таксама ўдзяляе недастаткова ўвагі аказанню дапамогі ў развіцці асабістых падсобных гаспадарак, забеспячэнні сельскага жыхара ўсім неабходным для вядзення гаспадаркі, перш за ўсё насеннем і інвентаром. Арганізацыі спажывецкай кааперацыі паступова страчваюць пазіцыі на рынку прамысловай прадукцыі. «Тут, як справядліва адзначаў кіраўнік дзяржавы, увагу неабходна акцэнтаваць на стварэнні і развіцці магутнасцяў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай і дзікарослай прадукцыі, якая закупляецца ў насельніцтва, — адзначыў Андрэй Кабякоў. — Прычым фінансавыя рэсурсы трэба канцэнтраваць толькі на перспектыўных канкурэнтаздольных вытворчасцях з правядзеннем іх мадэрнізацыі і істотным павелічэннем аб'ёму выручкі, заработнай платы, паляпшэннем эканамічных вынікаў».

Неабходна захаваць і развіваць магутнасці прадпрыемстваў, якія аказваюць паслугі сельгасвытворцам. Гэта датычыцца, напрыклад, жывёлабойных пунктаў, якія недастаткова загружаны, а таму неэфектыўныя, але тым не менш патрэбныя ў вёсцы.

З году ў год перад Белкаапсаюзам ставіцца задача забяспечыць рост экспарту, у першую чаргу гатовай прадукцыі, якая да канца не выканана, па-ранейшаму ў структуры экспарту пераважае сыравіна. «Кіраўнік дзяржавы настойліва патрабаваў ад вас перагледзець падыходы да рэалізацыі экспарту. Гэта, перш за ўсё, датычыцца паставак на экспарт гатовай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, пушніна-футравых вырабаў і перапрацоўкі дзікаслай прадукцыі», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

«Пытанне павышэння эфектыўнасці работы зверагадоўчай галіны павінна быць на асаблівым кантролі. У бліжэйшы год вы абавязаны завяршыць усе неабходныя мерапрыемствы па мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы зверагаспадаркі, забяспечыць максімальныя аб'ёмы вытворчасці шкурак клетачных пушных звяроў высокай якасці і пашыву гатовых вырабаў з футры для рэалізацыі на ўнутраным рынку і на экспарт», — прадоўжыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Андрэй Кабякоў адзначыў тое, што Белкаапсаюзу да гэтага часу не ўдалося дасягнуць эфектыўнасці работы, дастатковай для забеспячэння пашыранай вытворчасці. Амаль 80 працэнтаў арганізацый нізкарэнтабельныя, больш як палавіна не маюць уласных абаротных сродкаў. У гэтым напрамку неабходна прымаць комплексныя меры, накіраваныя на павелічэнне аб'ёмаў дзейнасці, даходнасці і, самае галоўнае, на зніжэнне затратнасці работы арганізацый Белкаапсаюза, падкрэсліў ён.

«Перад спажывецкай кааперацыяй стаяць вельмі сур'ёзныя і адказныя задачы, новаму кіраўніку давядзецца вельмі хутка ва ўсё ўнікаць, рабіць адпаведныя вывады», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Ён паведаміў, што новы кіраўнік павінен будзе да канца года далажыць кіраўніку дзяржавы аб стратэгіі Белкаапсаюза па выкананні неабходных задач, праінфармаваць аб ходзе правядзення аптымізацыі структуры ўсёй галіны і прапановах па яе аптымізацыі.

СТАР.2

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) **19 снежня 2013 года ў 14.00** адбудзецца пасяджэнне трэцяй сесіі Савета Рэспублікі, **20 снежня ў 15.00** — заключнае пасяджэнне трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

УВАГА! СЁННЯ!

УСЕ ПЫТАННІ ГРАШОВА-КРЭДЫТНАЙ ПАЛІТЫКІ

З 11.00 да 12.00 у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзеі Андрэеўны ЕРМАКОВАЙ**. Калі вас хвалююць пытанні стабільнасці курсу беларускага рубля, захавання ўласных зберажэнняў, працэнтаў па ўкладах і крэдытах і любыя іншыя аспекты грашова-крэдытнай палітыкі нашай краіны, — тэлефануйце!

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 287 18 66 і 8 (017) 287 18 71**.



ЛЫЖНЯ ЗДАЕ ЭКЗАМЕН

Фота БЕЛТА.

У гарналыжным цэнтры «Сілічы» стартаваў зімовы сезон. У тэставым рэжыме адкрыліся дзве з шасці трас — вучэбная і траса № 3. Плануецца, што ўсе трасы пачнуць работу ў бліжэйшы час, але ўмовы надвор'я могуць унесці свае карэкціроўкі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ:

«На сённяшні дзень праект новай рэдакцыі правіл прыёму ў ВНУ абмяркоўваецца ў Савеце Міністраў, у бліжэйшыя дні дакумент будзе перададзены ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Ніякіх навацый, якія прымусілі б абітурыентаў 2014 года мяняць свае намеры, мяняць прадметы для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання або збіраць дадатковыя даведкі, не будзе. Калі змяненні і будуць унесены, то яны будуць датычыцца наступных за 2014 годам уступных кампаній».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.12.2013 г.

Долар ЗША	9450,00	▲
Еўра	13020,00	▲
Рас. руб.	287,50	▲
Укр. грыўня	1139,31	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+2°	
Віцебск	+2°	
Гомель	+1°	
Гродна	+3°	
Магілёў	+1°	
Мінск	+1°	

■ Рэйд

ГУЛЬНЯ Ў АБЯЦАНКІ

або Камунальнікі супраць неплацельшчыкаў

На дзвярах тамбура каля нумара кватэры ашчэрваецца напісанае маркерам ад рукі папярэджанне: «Злы сабака». Званка няма, таму даводзіцца грукацца. Дзверы крыху прыадчыняюцца, і з-за іх высоўваецца ўскудлачаная галава хлопца гадоў 20—25. Зрэшты, як мне сказалі, ён ужо мае дваіх дзяцей. І тры месяцы неаплаты камунальных паслуг. «Чаму не плаціце за кватэру?» — пытаюцца супрацоўніцы разліково-даведачнага цэнтра, пакуль я стараюся сфатаграфаваць даўжніка. «Зарплату не далі», — неахвотна адгукаецца той і абяцае, што праз два дні пагасіць частку запазычанасці. Асабіста ў мяне гэтае абяцанне даверу не выклікае, але рабіць тут больш няма чаго. «Такі хлопец сімпатычны, а дзеткі такія харошанькія», — са шчырым шкадаваннем уздыхаюць жанчыны, і мы кіруемся на наступны адрас.

Дажывём да 25-га...

У рэйд па кватэрах неплацельшчыкаў Кастрычніцкага раёна сталіцы, якія адносяцца да 120-га ЖЭСа, мы выправіліся разам з супрацоўніцамі разліково-даведачнага цэнтра — **юрысконсультам Верай КРУКОЎСКАЙ** і **спецыялістам па камунальных разліках Нонай КРАЎЦОВАЙ**. Звычайна такія візіты адбываюцца па кватэрах тых, хто не аплачвае «камуналку» два і больш перыядаў (г. зн. месяцаў). «Злосныя неплацельшчыкі» амаль заўсёды адны і тыя ж, таму з маімі праважатымі знаёмыя ўжо даволі добра. Зрэшты, такое «знаёмства» ўсё ж мае свой плён: запазычанасць па ЖЭСе за апошні месяц склала крыху больш за 3%. **Начальнік разліково-даведачнага цэнтра Галіна ДЗЯМЕШЧЫК** адзначае, што гэты паказчык зусім невялікі. Але каб ён змяншаўся і далей, супрацоўнікам цэнтра даводзіцца прыкладаць вялікія намаганні. Калі гэтага не рабіць, не будзе выканання плана па аплаце паслуг, а значыць, калектыў цэнтра пазбавяць прэмій.

СТАР.6

ЖЫЛЛЕВЫ «КВАДРАТ» ПРЫВЯЖУЦЬ ДА ЗАРОБКАЎ З КАЭФІЦЫЕНТАМ 1,2

Гэтыя лічбы агучыў ў эфіры праграмы «У цэнтры ўвагі» на тэлеканале «Беларусь 1» міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Анатоль Чорны.

Нагадаю, што Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва правяло аналіз будаўніцтва жылля ў Беларусі за апошняе дзесяцігоддзе. Тады спецыялісты галіны параўналі кошт квадратнага метра ў адносінах да сярэдняй заработнай платы. У адпаведнасці з гэтым быў выведзены прымальны каэфіцыент для будаўніцтва так званага эканомнага жылля, якое ўзводзіцца з дзяржаўнай падтрымкай. Памер такога каэфіцыента склаў 1,2 за квадратны метр у дачыненні да сярэдняй заработнай платы па краіне. Паводле падлікаў экспертаў, выкарыстанне падобнага каэфіцыента да заробкаў павінна адпавядаць прагназуемаму кошту эканомжылля, па якім яно будзе ўзводзіцца ў наступным годзе. Тут гаворка ідзе аб будаўніцтве прыкладна 800 тысяч квадратных метраў па краіне. Менавіта такі аб'ём жылля плануецца пабудаваць налета з дзяржаўнай падтрымкай па дзяржзаказе.

Міністр удакладніў, што па дзяржзаказе будуць фінансавацца праз сістэму крэдытавання ўпраўленні капітальнага будаўніцтва менавіта пад узвядзенне дома. Толькі бліжэй да заканчэння ўсіх работ будзе збірацца кааператыў, калі людзі змогуць удзельнічаць у будаўніцтве і выбіраць сабе кватэры. Далей крэдыты будуць перааформлены непасрэдна на чаргавікоў-забудоўшчыкаў — такім чынам, людзі атрымаюць гатовыя кватэры, якія самі выбіралі. Кошт квадратнага метра ў гэтым выпадку бярэцца па апошнім месяцы запланаванага ўводу дома. «Усё, што «набяжыць» за час, які па-за межамі нарматыву, стане праблемай арганізацыі, якая не ўклалася ў нарматыўныя тэрміны будаўніцтва», — падкрэсліў Анатоль Чорны.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МІРНУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ ПА СІРЫІ ПЕРАНЯСУЦЬ З-ЗА ВЫСТАВЫ ДАРАГІХ ГАДЗІННІКАЎ

Прадстаўнікі ААН афіцыйна пацвердзілі, што мірная канферэнцыя «Жэнева-2» пройдзе не ў Жэневе, а ў швейцарскім горадзе Мантрэ. Прычынай пераезду стала адсутнасць гасцінічных нумароў — з-за штогадовай выставы дарагіх гадзіннікаў.

СНОЎДЭН ПАПРАСІЎ ПАЛІТЫЧНАГА ПРЫТУЛКУ Ў БРАЗІЛІІ

У абмен на яго прадастаўленне былы супрацоўнік ЦРУ прапануе аказаць ураду краіны дапамогу ў расследаванні сачэння з боку ЗША і абяцае раскрыць новыя сакрэты амерыканскай разведкі.

АНГЕЛА МЕРКЕЛЬ У ТРЭЦІ РАЗ АБРАНА КАНЦЛЕРАМ ГЕРМАНІІ

Бундэстаг у трэці раз выбраў Ангелу Меркель федэральным канцлерам Германіі. За кандыдатуру старшыні блока ХДС/ХСС прагаласавалі 462 дэпутаты з 631. Нагадаем, 59-гадовая Ангела Меркель узначальвае ўрад Германіі з 2005 года, у другі раз яна абіралася ў 2009 годзе. Сёлета ў верасні кансерватыўны блок Меркель ХДС/ХСС набраў больш за 41,5% галасоў на ўсеагульных парламенцкіх выбарах.

КЛІЧКО ЗАПАТРАБАВАЎ ПРАВЯДЗЕННЯ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ У 2014 ГОДЗЕ

Выбары прэзідэнта Украіны павінны адбыцца ў сакавіку 2014 года, гэта значыць на год раней за ўстаноўлены Канстытуцыяй тэрмін. Пра гэта, як перадае УНІАН, заявіў лідар апазіцыйнай партыі УДАР Віталь Клічко. «Мы ведаем, што сёння адзінае выйсце з палітычнага крызісу, у якім знаходзіцца краіна, — гэта датэрміновыя парламенцкія і прэзідэнцкія выбары», — падкрэсліў ён. Дзейны кіраўнік дзяржавы Віктар Януковіч, па словах Клічко, раней сцвярджаў, што не баіцца такога развіцця падзей. «Дык няхай дакажа гэта на сумленных выбарах», — падсумаваў апазіцыянер.

Заява Клічко прагучала на наступны дзень пасля таго, як ён адмовіўся ад тытула чэмпіёна свету па боксе ў цяжкай вазе па версіі WBC. Спартсмен матываваў гэтае рашэнне неабходнасцю сканцэнтраваць сваю ўвагу на палітычных падзеях ва Украіне.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

РУКА ЧАЛАВЕКА АДЛЮСТРОЎВАЕ НАЯЎНАСЦЬ РАКУ



Брытанскія медыкі зрабілі нечаканую выснову: далоні чалавека дапамагаюць дыягнаставаць набліжэнне анкалагічнага захворвання. Спецыялісты раяць звяртаць увагу на структуру самой рукі. Як паказалі даследаванні, у людзей, хворых на рак, далоні становяцца грубымі, на руцэ відаць ушчыльненні і прыпухласці, якія можна знайсці пры дэталёвым вывучэнні. Па словах экспертаў, гэта, магчыма, адны з самых першых прыкмет развіцця раку, таму да любых змен такога кшталту варта ставіцца ўважліва. Дарэчы, лічыцца, што мужчыны, у якіх безыменны палец на правай руцэ значна даўжэйшы за ўказальны, маюць у тры разы большую верагоднасць захварэць на рак прастаты. Такая фізічная асаблівасць у мужчын узнікае яшчэ ў перыяд унутрывантробнага развіцця ў выніку рэакцыі на тэстастэрон.

КАРОТКА

Паслуга электроннай рэгістрацыі, якая дае магчымасць не афармляць праязныя дакументы ў касе, стала даступнай пры аплаце білетаў на ўсе цягнікі ў прамых зносінах Беларусь — Расія праз інтэрнэт.

Больш за дзве трэці (70 працэнтаў) новых захворванняў, якія былі выяўлены ў чалавека за апошнія дзесяцігоддзі, з'яўляюцца хваробамі жывёльнага паходжання і часта звязаны з ужываннем прадуктаў харчавання.

Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» рыхтуе камплект калекцыйных DVD-дыскаў «Залаты тузін беларускіх фільмаў», выпуск якіх прымеркаваны да 90-годдзя айчыннага кіно. У ліку карцін, якія ўвойдуць у юбілейны камплект, «Белыя росы» Ігара Дабралюбава (1983), «Дзікае паляванне караля Стаха» Валерыя Рубінчыка (1979), «Прыгоды Бураціна» Леаніда Нячаева (1975).

20 снежня пачынаецца пагашэнне дзяржаўных аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, для фізічных асоб першага (серыя АА 1) і другога (серыя АБ 2) выпускаў.

■ Крэатыў

ДЗЕД МАРОЗ ПАВІНШУЕ… ПРАЗ АКНО

Унікальную і, можна сказаць, насамрэч казачную паслугу «Падарунак праз акно» прапанавалі віцебскія энтузіясты, якія займаюцца прамысловым і традыцыйным альпінізмам.

Што цікава, у гараджан і гасцей горада ёсць магчымасць не толькі заказаць віншаванне для блізкіх, калег, але і пад кантролем прафесіяналаў самім павіншаваць іх праз акно. І такім чынам паспрабаваць свае сілы ў ролі Дзеда Мароза-альпініста.

«Вы стаміліся ад банальных падарункаў? Вы хочаце здзівіць блізкага чалавека і зрабіць падарунак арыгінальным і незабыўным? Вы марыце заваяваць сэрца каханага чалавека непрадказальным учынкам? Мы спусцімся да акна любога паверха і ўручым падарунак з найлепшымі пажаданнямі ад вашага імя», — такімі словамі рэкламуюць свае паслугі крэатыўныя людзі.

Кошт, як адзначаюць альпіністы, залежыць ад вышыні дома і паверха, дзе жыве чалавек, якога трэба павіншаваць.

Дарэчы, і пасля навагодняга свята можна незвычайным спосабам здзівіць кагосьці. Напрыклад, калі ёсць смеласць, можна праз акно прызнацца ў каханні, прапанаваць руку і сэрца.

У прайс-лісце групы альпіністаў і ўручэнне праз вокны букетаў, запісак, падарункаў на дзень нараджэння, Дзень святога Валянціна, Міжнародны жаночы дзень і гэтак далей. У аўтараў ідэі ёсць старонка ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте»: Витебск «Поздравление в окно».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ISSN 1990 - 763X

СУР'ЁЗНЫЯ І АДКАЗНЫЯ ЗАДАЧЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для назначэння на пасаду старшыні канцэрна «Беллеспаперапрам» з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам узгоднена кандыдатура Юрыя Назарава, адзначыў Андрэй Кабякоў. Ён ахарактарызаваў новага кіраўніка ведамства як высокакваліфікаванага спецыяліста лесагаспадарчай і прамысловай вытворчасці, які добра валодае пытаннямі кіравання і эканомікі. «Юрый Назараў глыбока ведае развіццё лясной гаспадаркі і комплекснае выкарыстанне сыравінных рэсурсаў, таму ў вашай сферы ён чалавек не новы», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі.

«Гэтага запатрабаваў Прэзідэнт, і часткова інвентарызацыя і аптымізацыя займаемых прадпрыемствамі дрэваапрацоўкі тэрыторый ужо ідзе, але пакуль гэтага недастаткова, трэба правесці работу вельмі ўважліва», — сказаў Андрэй Кабякоў. У галіне ўдасканальваюцца тэхналогіі, укараняецца абсталяванне, і цяпер новым вытворчасцям ужо не трэба такіх вялікіх плошчаў, як былі 30-40 гадоў таму. Таму іх трэба выкарыстоўваць на іншыя мэты. «Не трымайце лішнія тэрыторыі ў сябе, іх трэба абслугоўваць, вы ведаеце, якія тут патрабаванні ставіць Прэзідэнт, таму лепш перадайце іх своечасова мясцовым выканаўчым органам улады, тым больш што яны таксама нацэлены на такую работу», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ён таксама адзначыў і іншыя важныя задачы, якія стаяць перад новым кіраўніком канцэрна «Беллеспаперапрам». У прыватнасці, максімальнае выкарыстанне лесасыравінных рэсурсаў, па аб'ёме якіх Беларусь — адна з мацнейшых у Еўропе. Праводзіцца шырокая мадэрнізацыя дрэваапрацоўчай галіны па ўсіх тэхналагічных працэсах. Новыя вытворчасці, якія ўводзяцца, будуюцца, завязаны на айчынных лесасыравінных рэсурсах. З аднаго боку, гэта вельмі добра, што ў максімальнай ступені выкарыстоўваецца тое, што ёсць у краіне і ўзнаўляецца. Ад гэтага залежыць канкурэнтаздольнасць і эфектыўнасць галіны, якая павінна забяспечвацца якаснай сыравінай і па прымальных цэнах.

Важна таксама, каб на абноўленых дрэваапрацоўчых прадпрыемствах вырабляемая прадукцыя мела адпаведныя параметры сабекошту. «Вельмі важна, каб мы правільна скарысталіся рэсурсам, які нам даецца ў рукі, правільна арганізавалі рэалізацыю прадукцыі на ўнутраным і знешнім рынках, — сказаў Андрэй Кабякоў. — Нельга дапусціць унутрыгаліновай неразумнай канкурэнцыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўкі. Таксама недапушчальна, каб ад мадэрнізацыі нажыліся пасрэднікі. Усё тое, што мы зарабілі на нашай мадэрнізацыі, павінна быць у скарбонцы нашай дзяржавы».

Ён таксама нагадаў, што на мадэрнізацыю базавых прадпрыемстваў дрэваапрацоўкі накіравана ў агульным аб'ёме прыкладна $2,5 млрд крэдытаў з улікам гарантый урада. «Гэта вельмі вялікія грошы, і ад таго, як вы будзеце разлічвацца па крэдытах, будзе ў многім залежаць і дабрабыт нашых грамадзян, і ўстойлівасць банкаўскай сістэмы», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Таму так важна забяспечыць эфектыўнасць продажаў прадукцыі дрэваапрацоўкі.

Звяртаючыся да новага кіраўніка канцэрна «Беллеспаперапрам» Юрыя Назарава, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта нацэліў яго як мага хутчэй пачаць сваю работу, «каб да канца года, ужо паглыбіўшыся ў праблему, быць на дакладзе ў кіраўніка дзяржавы са стратэгічнай лініяй далейшага развіцця галіны». У новы год канцэрну трэба ўвайсці з поўнай яснасцю, узгодненасцю дзеянняў па выкананні тых арыенціраў, на якія ўказваў Прэзідэнт, падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

■ Тры пытанні да ўлады

БІЗНЕСУ — ПАДТРЫМКА

За апошнія гады ў Іўеўскім раёне атрымалі «другое жыццё» і пачалі працаваць на эканоміку і сферу паслуг шматлікія пустуючыя аб'екты. Аб гэтым і іншых кірунках падтрымкі бізнесу «Звяздзе» расказаў старшыня Іўеўскага райвыканкама Міхаіл ВАЛЧЭЦКІ.

— Міхаіл Міхайлавіч, якія магчымасці ёсць на Іўеўшчыне для развіцця бізнесу, адкрыцця новых прадпрыемстваў?

— Прадпрымальніцтва займае трывалае месца ў структуры эканомікі нашага раёна, садзейнічае фарміраванню канкурэнтнага асяроддзя, росту вытворчасці прамысловых тавараў, развіццю сферы паслуг, стварэнню новых рабочых месцаў. Пры гэтым для развіцця малога і сярэдняга бізнесу ёсць пустуючыя будынкі, якія мы імкнёмся задзейнічаць у гаспадарчым абароце. Гэтыя пытанні трымаем на пастаянным кантролі, разглядаем на пасяджэннях райвыканкама, дэталёва абмяркоўваючы далейшы лёс літаральна кожнага пустуючага аб'екта. Сёння па некаторых аб'ектах нават 7-8 аўкцыёнаў з паніжэннем цаны не даюць плёну. Але ёсць і станоўчыя прыклады. За апошнія 5 гадоў у нашым невялікім раёне на аўкцыёнах прадалі 18 аб'ектаў. Напрыклад, у райцэнтры адкрыты гандлёвы дом «Электронік» па продажы бытавой тэхнікі, а ў будынку былога клуба-бібліятэкі ў вёсцы Ляпешкі цяпер прадуктовая крама «Гасцінец».

— Якую яшчэ падтрымку бізнесу, акрамя маёмаснай, аказвае мясцовая ўлада?

— Згодна з раённай праграмай дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва на 2013-2015 гады, таксама прадугледжаны меры інфармацыйнай, фінансавай, іншых відаў дапамогі. У прыватнасці, упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама ствараюцца ўмовы і магчымасці беспрацоўным грамадзянам для праяўлення прадпрымальніцкіх здольнасцяў. Людзі праходзяць перанавучанне, атрымліваюць субсідыі для адкрыцця ўласнай справы. Сёлета за студзень—лістапад ужо выдзелена 11 такіх субсідый. Дзякуючы гэтай падтрымцы ажыццяўляюцца паслугі аграэкатурызму, рамесніцтва, рознічны гандаль харчовымі і прамысловымі таварамі.

— А якія праекты ўжо ажыццявіліся ў сферы вытворчасці і на што разлічваеце ў перспектыве?

— Стараемся прыцягнуць і айчынныя, і замежныя інвестыцыі. На тэрыторыі раёна зарэгістраваны сумесныя прадпрыемствы «БелРасПластык», «МЦ Прадакшн», «ЛБІ Экспарт», «Расхольц», якія займаюцца вытворчасцю вырабаў са шклопластыку для патрэб машынабудавання і піламатэрыялаў. Ажыццявіўся інавацыйны і імпартазамяшчальны праект ТАА «Ромакс-касметык» па вытворчасці новых відаў касметычнай прадукцыі. Два гады таму на аўкцыёне (пры пачатковай цане, роўнай адной базавай велічыні) былі рэалізаваны пустуючыя аб'екты былога кансервавага завода, дзе новы ўласнік, лідскае ТАА «Тэхмаш», адрамантаваў будынак і арганізаваў выпуск сельскагаспадарчых машын і агрэгатаў, увёўшы ў работу падстанцыю, кацельню, каналізацыйную і водаправодную сеткі і стварыўшы 70 працоўных месцаў. У перспектыве разлічваем прадаць з аўкцыёну будынкі былога склада, якія цяпер не выкарыстоўваюцца, і стварыць там прадпрыемства па перапрацоўцы другаснай сыравіны.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

■ Фінансавы выдатнік

Кватэры «на суткі» цяпер «пасябруюць» з чэкамі і квітанцыямі

Здача жылля на кароткатэрміновы перыяд усё больш ператвараецца ў рэальны бізнес, які прыносіць нядрэнныя даходы індывідуальным прадпрымальнікам. Толькі ў бюджэт горада Мінска паступаюць падаткі ад 700 індывідуальных прадпрымальнікаў, якія здаюць жылыя памяшканні «на суткі». Штогод колькасць такіх бізнесменаў толькі павялічваецца.

Як правіла, за жыллё, што здаецца «на суткі», кліенты разлічваюцца гатоўкай. Парадак прыёму наяўных вызначаны адпаведным палажэннем, якое зацверджана пастановай Саўміна і Нацбанка № 924/16. Згодна з гэтым дакументам, індывідуальныя прадпрымальнікі пры здачы ўнаём кватэр маюць права прымаць грошы ў кліентаў без прымянення касавага абсталявання. Аднак такі парадак не вызваляе ІП ад афармлення ў адпаведнасці з заканадаўствам кожнага факта прыёму наяўных грашовых сродкаў дакументам з пэўнай ступеню абароны, інфармацыя аб вырабе і рэалізацыі бланка якой уключана ў электронны банк даных.

Да такіх дакументаў адносіцца квітанцыя аб прыёме наяўных грашовых сродкаў пры продажы тавараў (выкананні работ, аказанні паслуг) без прымянення касавых апаратаў і (або) спецыяльных камп'ютарных сістэм і плацежных тэрміналаў. Акрамя таго, у электронны банк даных уключаны касавы ордар формы КО-1. Гэты дакумент запаўняецца пры паступленні ў касу прадпрымальніка наяўных грошай у беларускіх рублях.

Такі парадак распаўсюджваецца толькі на прыём гатоўкі пры здачы «на суткі» кватэр. Пры здачы «на суткі» жылых дамоў ІП прымаюць наяўныя з выкарыстаннем касавага абсталявання. Існуе яшчэ адзін важны нарматыўны дакумент. На пачатку года многія з іх не маглі зразумець, для якіх мэт іх кліенты паведамляюць пра тое, што яны камандзіровачныя работнікі і настойваюць на выдачы ім толькі квітанцыі да прыходнага касавага ордара. Адказ быў простым.

Згодна са змяненнямі, унесенымі ў пастановы Міністэрства фінансаў № 35 «Аб устанаўленні Інструкцыі аб парадку і памерах кампенсацыі выдаткаў пры службовых камандзіроўках у межах Рэспублікі Беларусь», цяпер работніку кампенсуюцца расходы па найме жылога памяшкання па фактычных затратах на падставе сапраўдных дакументаў (чэкаў з прыкладзенымі рахункамі, а ў выпадку пражывання ў індывідуальнага прадпрымальніка — квітанцый да прыходнага касавага ордара з прыкладзеным дагаворам).

Такім чынам, ІП пры прыёме гатоўкі ад камандзіраванага работніка павінен выдаць: у выпадку здачы «на суткі» кватэры без прымянення касавага абсталявання — квітанцыю да прыходнага касавага ордара; а ў выпадку здачы «на суткі» жылога дома — чэк.

На практыцы бізнесмены, якія здаюць кватэры «на суткі», для прыёму гатоўкі выкарыстоўваюць квітанцыі. Квітанцыя і прыходны касавы ордар маюць аднолькавае значэнне і прымяненне. Таму ў выпадку выдачы ІП камандзіраванаму квітанцыі бухгалтэрыя прадпрыемства (арганізацыі) абавязана пакрыць работніку расходы па найме жылога памяшкання на падставе прадастаўленай квітанцыі.

За невыкананне патрабаванняў заканадаўства аб парадку прыёму наяўных грашовых сродкаў пры здачы жылых памяшканняў на кароткатэрміновы перыяд Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжана адміністрацыйная адказнасць. Так, калі работнік (калі такі ёсць) індывідуальнага прадпрымальніка альбо сам ІП пры здачы жылога памяшкання «на суткі» прымае ад спажыўца наяўныя грашовыя сродкі без выкарыстання касавага абсталявання або квітанцыі (прыходна-касавага ордара), то, у адпаведнасці з артыкулам 12.18 КаАП, дзеянні названых асоб прадугледжваюць папярэджанне або накладанне штрафу ад 2 да 50 базавых велічынь. Парушэнне парадку выкарыстання касавага абсталявання, а таксама адсутнасць яго пры здачы жылых дамоў «на суткі» караецца накладаннем штрафу на ІП у памеры да 100 базавых велічынь.

❐❐❐

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.

Сяргей КУРКАЧ

■

ПАПЯРЭДЖВАЦЬ НЕБЯСПЕКУ З ДАПАМОГАЙ ТЭХНАЛОГІЙ

Пра неабходнасць развіцця комплекснай бяспекі для вырашэння задач Саюзнай дзяржавы вялі размову кіраўнікі расійскіх прадпрыемстваў, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі агульнай з Беларуссю праграмы, прысвечанай распрацоўцы і стварэнню новага пакалення мікрасістэматэхнікі і ўніфікаваных інтэграваных сістэм падвоенага прызначэння.

Журналісты вядучых расійскіх і беларускіх СМІ ацанілі ход рэалізацыі саюзных навукова-прамысловых праграм у галіне высокіх тэхналогій падчас прэстура ў Санкт-Пецярбург і наведвання холдынга ААТ «Святлана», Фізіка-тэхнічнага інстытута імя А. Іоффе РАН і Навукова-тэхналагічнага цэнтра мікраэлектронікі пры ФТІ РАН, ААТ «Авангард», ААТ «Клімаў» і ЦКБ «Няптун».

Напрыклад, генеральны дырэктар холдынга ААТ «Святлана» Уладзімір Папоў адзначыў, што шматлікія найноўшыя прыборы проста забаронены законамі краін-вытворцаў для экспарту ў Расію і Беларусь:

— Зразумела, што кожны клапоціцца пра сваю канкурэнтаздольнасць. А нам застаецца толькі самім вырабляць у сябе аналагічны прадукт, бо ні за якія грошы мы яго не купім. Цяпер у рамках саюзнага праекта мы распрацоўваем прадукцыю з унікальнымі ўласцівасцямі — гэта ўжо вобласць нанаструктураваных электронікі. Мы падыходзім да таго, што самыя сучасныя мікрасхемы хутка нельга будзе ўбачыць няўзброеным вокам.

Прадпрыемства ААТ «Святлана», у адрозненне ад некаторых аналагічных структур, не затрымалася ў мінулым, а ўпэўнена асвойвае самыя найноўшыя тэхналогіі. Сёння тут займаюцца распрацоўкамі ў вобласці ЗВЧ-прыбораў, мікраэлектронікі, паўправадніковых структур на новых матэрыялах, рэнтгенаўскіх трубак, магутных вакуумных генератарных прыбораў, оптаэлектронікі і гэтак далей. Прадукцыя «Святланы» забяспечвае камплектацыю многіх абаронных сістэм. Сумесна з Інстытутам фізікі імя Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ААТ «Святлана» рэалізуе саюзную праграму «Прамень», поўная назва якой такая: «Перспектыўныя паўправадніковыя гетэраструктуры і прыборы на іх аснове». Сфера іх прымянення вельмі шырокая. Гэта як сістэмы спецсувязі, навігацыі, тэлекамунікацыі, так і вельмі дакладныя медыцынскія прыборы, цеплавізары, дальнамеры...

— Мы распрацоўваем «сэрца» прыбораў, электронную частку, а беларускі бок — канчатковую прадукцыю, — адзначае намеснік генеральнага дырэктара па навукова-тэхнічным развіцці ААТ «Святлана» Валерый Кляўцоў.

ААТ «Авангард» у праграме «Мікрасістэматэхніка» ўдзельнічае разам з беларускім аб'яднаннем дакладнага машынабудавання «Планар». Асноўным дасягненнем праграмы з'яўляецца стварэнне — упершыню за многія гады! — самага сучаснага комплексу спецыяльнага абсталявання, які забяспечвае дасягненне канкурэнтных характарыстык у параўнанні з замежнымі аналагамі. Сапраўдным прарывам з'яўляецца распрацоўка шырокага дыяпазону датчыкаў і сістэм для забеспячэння канструкцыйнай, газавай і экалагічнай бяспекі. Гэтыя інавацыі дазволяць істотна зменшыць залежнасць ад імпарту, адзначае кіраўнік «Авангарда» Валерый Шубараў.

ЗАТ «Святлана-РОСТ».

— Змена тэхналагічных пакаленняў у радыёэлектроніцы адбываецца кожныя 4-5 гадоў, і калі мы не створым уласнай канкурэнтнай тэхналогіі, то проста не зможам дагнаць вядучых сусветных вытворцаў. Гэту праблему якраз і дазваляе вырашаць саюзны праект. Калі расійскія і беларускія прадпрыемствы не будуць вырабляць радыёэлектроніку, нам будзе вельмі складана размаўляць увогуле аб развіцці эканомікі, прамысловасці. Бо сёння менавіта радыёэлектроніка вызначае магчымасці канкурэтназдольнасці іншых галін прамысловасці. Самае галоўнае — аднавіць тыя сувязі, якія былі ў нас з Беларуссю. Сёння асноўны кірунак нашай дзейнасці — прафесійная электроніка, якая дазваляе папярэджваць небяспеку як тэхнагеннай, так і тэрарыстычнай пагроз.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.
Санкт-Пецярбург.

■ Замежны вопыт

РАСІЙСКІ ВАРЫЯНТ БАРАЦЬБЫ З КАРУПЦЫЯЙ

Як вядома, карупцыя з'яўляецца адной з найбольш актуальных праблем сучаснасці. Эфектыўнасць барацьбы з ёй хістаецца ў розных краінах, прычым у некаторых рэгіёнах карупцыя настолькі працвітае, што пазбаўляе насельніцтва магчымасці атрымліваць элементарныя даброты. Такая сітуацыя сёння ў многіх краінах Афрыкі. Сустракаецца падобнае і ў Азіі, і ў Лацінскай Амерыцы. Карупцыя стала сапраўднай праблемай і ў Расійскай Федэрацыі ў 1990-я гады, калі ва ўмовах масавай прыватызацыі і лібералізацыі вялізныя дзяржаўныя актывы пераходзілі ў прыватныя рукі. Якая ж сітуацыя цяпер?

Можна з задавальненнем адзначыць, што ў нашай суседкі ў апошнія гады ў наяўнасці паслядоўнае ўзмацненне барацьбы з карупцыяй. Усё часцей сталі заводзіцца крымінальныя справы па карупцыйных праявах у дачыненні да сапраўды высокапастаўленых чыноўнікаў, якіх у 1990-я гады дзяржаўная сістэма старалася абыходзіць. Барацьба з выяўленнем карупцыйных дзеянняў спалучаецца з прафілактычнай работай. А сюды адносяць не толькі інфармаванне насельніцтва і чыноўнікаў аб разбуральнай сутнасці карупцыі і гатоўнасці дзяржавы з ёй рашуча змагацца, але і стымуляванне законапаслухмяных паводзін.

У нядаўнім інтэрв'ю ў «Комсомольской правде» кіраўнік упраўлення справамі прэзідэнта Расіі Уладзімір Кожын у гэтай сувязі нагадаў словы Аляксандра III, які казаў, што «танны чыноўнік дорага абыходзіцца дзяржаве». Ён сказаў: «калі чыноўнік высокага рангу атрымлівае мізэрную зарплату, усе нашы размовы пра барацьбу з карупцыяй, пра эфектыўнае кіраванне можна спыніць. Таму што міністры, начальнікі глаўкаў, якія прымаюць рашэнні на мільярды рублёў і атрымліваюць грашовую зарплату, — гэта абсурд».

А кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта Расіі Сяргей Іваноў і зусім лічыць, што для барацьбы з карупцыяй трэба выкарыстоўваць элементы савецкай сістэмы падрыхтоўкі кадраў. «У савецкі час была апрабавана сістэма падрыхтоўкі кадраў, яе не трэба капіраваць цалкам, але асобныя элементы падрыхтоўкі ўзяць на ўзбраенне трэба. Калі маладых людзей заўважалі — за іх актыўную пазіцыю, прыстойнасць і паводзіны, і тых, хто праяўляў лепшыя якасці, паступова прасоўвалі». Ён, дарэчы, нядаўна пракаментаваў і вынікі праверачнай кампаніі дэкларацый чыноўнікаў па 2012 годзе: «Калі мы ўпершыню ўвялі і расходы, і лічбы даволі-такі сур'ёзныя: 300 чыноўнікаў па краіне было звольнена з фармулёўкай у сувязі са стратай даверу і каля 500 дэлегатам на заняцце адпаведных пасад было адмоўлена, таму што да іх з'явіліся пытанні».

Карупцыйная праблема абмяркоўвалася і на нядаўняй прэс-канферэнцыі «Карупцыя ў Расіі як бізнес». Аляксандр Мікалаевіч Савенкаў, намеснік старшыні камітэта Савета Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве, прававых і судовых пытаннях, развіцці грамадзянскай суполкі, які браў у ёй удзел, адзначыў: «Не трэба забываць, што ў свеце рынак карупцыі ацэньваецца ў 16 трлн долараў у год, што злачыннасць транснацыянальная».

Кірыл Віктаравіч Кабанаў, старшыня Нацыянальнага антыкарупцыйнага камітэта, ацаніў аб'ём расійскага рынку карупцыі ў 300 млрд долараў у год. Як латэнтны складнік ценевага рынку, «яна значна больш, чым рынак незаконнага абароту наркотыкаў, які ацэньваецца дзесьці ў 10—15 млрд долараў у год».

Зразумела, прымем пад увагу, што ўсе гэтыя ацэнкі маюць толькі прыкладны характар. Але нават у лепшым варыянце, калі гэта лічба адпавядае рэальнасці толькі на 10 працэнтаў, эканоміка Расіі кожны год губляе 30 мільярдаў долараў. Такія грошы ні ў адной краіне свету лішнімі не будуць. Гэтым і тлумачыцца новы ўказ ад 3 снежня прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, які дапускае стварэнне ўпраўлення па супрацьдзеянні карупцыі. Новае ўпраўленне будзе функцыянаваць «у мэтах забеспячэння дзейнасці прэзідэнта Расіі па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне супрацьдзеяння карупцыі». Такім чынам, Расія атрымала новы орган, які зможа супрацьдзейнічаць найбольш небяспечнаму віду карупцыі — у вярхах дзяржаўнай машыны.

Узмацненне барацьбы з карупцыяй дазволіць Расіі лягчэй перажыць і негатыўныя наступствы дэпрэсіі ў еўрапейскім рэгіёне. Нягледзячы на тое, што акцыі на заходніх фондавых біржах штурмуюць усё новыя і новыя вышыні, сітуацыя на самой справе крайне складаная. У сувязі з гэтым тэмп росту расійскай эканомікі рэзка замарудзіўся, а золатавалютныя рэзервы ў апошнія тыдні значна скарацініліся. Садзейнічаць барацьбе з карупцыйнымі праявамі стане і пастаўленая перад найбуйнейшымі дзяржаўнымі манаполіямі задача скарачаць капітальныя і аперацыйныя выдаткі на 10% штогод ад узроўню 2012 г. на працягу пяці гадоў. Неабходнасць эканоміць скароціць магчымасці для махінацый.

Такім чынам, можна толькі вітаць новыя ініцыятывы ў Расіі, пры дапамозе якіх, хочацца спадзявацца, яна зможа ўкараніць стандарты дзяржкіравання з належнымі мерамі па супрацьдзеянні карупцыі. Гэта, дарэчы, дапаможа і працэсам еўразійскай інтэграцыі, у якіх расійская эканоміка па сваіх памерах мае вядучае значэнне.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ДРУГІ ЭНЕРГАБЛОК АЭС ЧАКАЕ ЛІЦЭНЗІІ

Аб гэтым заявіла Вольга Лугаўская, начальнік Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС Беларусі, падчас брыфінгу ў прэс-цэнтры БЕЛТА.

Іншымі словамі, Дзяржатамнагляд пачаў экспертызу дакументаў для выдачы ліцэнзіі на будаўніцтва другога энергаблока Беларускай АЭС. Паводле беларускага заканадаўства, працэдура выдачы ліцэнзіі на ўзвядзенне энергаблока АЭС адносна асноўных будынкаў і збудаванняў можа доўжыцца да года. «Улічваючы, што ў нас ужо ёсць вопыт экспертызы першага энергаблока АЭС, праца можа быць праведзена хутчэй, — удакладніла Вольга Лугаўская.

Дарэчы, акрамя экспертызы дакументаў, рэгулятар таксама ажыццяўляе праверку ліцэнзіята (дырэкцыі будаўніцтва АЭС) на адпаведнасць патрабаванням ліцэнзіі. У лістападзе на астравецкай пляцоўцы прыступілі да работ па бетанаванні падмуркаў аб'ектаў першага энергаблока. Нагадаем, што атамная станцыя будзе складацца з двух энергаблокаў сумарнай магутнасцю да 2400 (2х1200) МВт. Для яе будаўніцтва выбраны праект «АЭС-2006», які цалкам адпавядае міжнародным нормам і рэкамендацыям МАГАТЭ. Тэрміны рэалізацыі праекта адлюстраваны ў генеральным кантракце, які прадугледжвае ўвод у прамысловую эксплуатацыю першага блока атамнай станцыі ў лістападзе 2018 года.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

КНІГІ АД ТАЦЦЯНЫ ВЯДЗЕНСКАЙ

Расійская пісьменніца падарыла Магілёўскай гарадской бібліятэцы свае раманы.

Гэта адбылося падчас яе візіту ў Магілёў па запрашэнні бібліятэкі. Таццяна Вядзенская — аўтар псіхалагічных раманаў, якія карыстаюцца асаблівай папулярнасцю ў жанчын. У Магілёве адбылася яе творчая сустрэча з чытачамі, дзе яна распавяла пра сябе, свае новыя кнігі, падзялілася творчымі планамі. А падчас яе візіту ў кнігарню «Літара» пакупнікі змаглі набыць раманы пісьменніцы са зніжкай і аўтографам. Бібліятэцы яна падаравала 25 кніг, дзе сабраны ўсе яе раманы, у тым ліку і новы — «Попельны бландзін». Як адзначыла вядучы бібліятэкар Святлана Міхеенка, на гэтыя кніжкі ўжо ўтварылася чарга.

Сустрэча з пісьменніцай адбылася ў рамках праекта «Літаратурны зарапад», а спонсарскую падтрымку аказала сталічная фірма «Роднае слова». Сёлета, у адпаведнасці са статусам Магілёва як культурнай сталіцы, акцэнт рабіўся на творах пісьменнікаў беларускага паходжання. Па запрашэнні бібліятэкі ў горадзе пабывалі Віктар Казакоў, Вольга Тарасевіч, Павел Саенка і іншыя пісьменнікі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЗАТРЫМАЛІ БРАТОЎ-НАРКАМАНАЎ

Іх было трое, і яны займаліся вырабам экстракцыйнага опію. Як патлумачылі самі затрыманыя, зелле выраблялі для ўласнага спажывання.

Затрыманне правялі супрацоўнікі аддзялення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Кастрычніцкага РУУС сталіцы разам з байцамі атрада міліцыі асаблівага прызначэння ГУУС Мінгарвыканкама на кватэры па вуліцы Кіжаватава. Да слова, гэтае жыллё мела рэпутацыю прытона, дзе збіраліся асобы, што вялі асацыяльны лад жыцця. Ад суседзяў паступалі скаргі на братоў, а аднойчы тыя і ўвогуле ледзьве не спалілі жытло. Самі затрыманыя раней судзімыя за хуліганства і нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Пры правядзенні агляду ў кватэры былі знойдзены шпрыцы і пластыкавыя бутэлькі з наркатычным рэчывам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НЕ ЎТРЫМАЛІСЯ АД СПАКУСЫ

Івацэвіцкі райаддзел Следчага камітэта завёў крымінальную справу па факце незаконнай здабычы ласёў. Самку лася з двума эмбрыёнамі і самца застрэлілі паляўнічыя, якія палявалі на дзіка і казулю каля вёскі Козікі ў мінулыя выхадныя.

13 паляўнічых пад кіраўніцтвам егера Даманаўскай ваенна-паляўнічай гаспадаркі стаялі ў загоне, і тут з'явіліся ласі. Тады, паводле слоў намесніка начальніка Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Сяргея ШТЫКА, некаторыя з паляўнічых не ўтрымаліся ад спакусы і выстралілі па іх. Неразумны азарт ім абыдзецца дорага. Урон, нанесены прыродзе, ацэнены ў 380 базавых велічынь — гэта значыць, 49,4 мільёна рублёў. А за незаконнае паляванне можна наогул трапіць у турму тэрмінам да трох гадоў. Гэта ўжо вырашыць суд...

Яна СВЕТАВА.

ГІРЛЯНДА ПАДВЯЛА

Уначы здарыўся пажар у прыватным доме па сталічнай вуліцы Няжданавай. Ачаг узгарання быў на кухні...

Дзякуючы своечасоваму ўмяшанню выратавальнікаў пажар хутка ліквідавалі, не даўшы распаўсюдзіцца па іншых пакоях. Па словах гаспадыні дома, уначы яна прачнулася ад брэху сабакі, потым адчула пах дыму. Калі зайшла на кухню, унутры ўжо ўсё гарэла... Жанчына выйшла з дома і выклікала пажарных. Пазней яна прыгадала, што пакінула на ноч уключаную электрагірлянду, якая была развешана на акне кухні. Мяркуецца, што кароткае замыканне і стала прычынай пажару.

У гэтай сувязі сталічныя выратавальнікі яшчэ раз нагадваюць: ні ў якім выпадку нельга пакідаць электрапрыборы (розныя электронныя ілюмінацыйныя ўстройствы, шары, што свецяцца, міні-пражэктарныя ўстаноўкі, гірлянды, лазерныя пражэктары) без нагляду, а тым больш — на ноч. А набываць падобныя вырабы лепш у спецыялізаваных крамах і прасіць у прадаўцоў дакументы, якія пацвярджалі б бяспеку выкарыстання тавару.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АСТРАМЕЧАЎСКІ РУКАПІС — КУЛЬТУРНЫ БРЭНД РАЁНА

У Палацы культуры Астрамечава Брэсцкага раёна адбылася прэзентацыя першага ў Беларусі раённага альманаха «Астрамечаўскі рукапіс». Ужо ўбачыў свет яго чацвёрты нумар. Аўтары і ўкладальнікі часопіса расказалі пра свае задумкі і планы на наступны год, падзяліліся ўражаннямі аб цікавых сустрэчах пры падрыхтоўцы матэрыялаў альманаха.

Гэтых аўтараў нямнога, але яны сапраўдныя падзвіжнікі культурнай спадчыны свайго краю, гісторыі, народнай творчасці. Яны ідуць у вёскі, запісваюць байкі, легенды, паданні, песні, вершы, робяць здымкі скарбаў з бабуліных куфэркаў. Гэту работу ўзначальвае доктар філалагічных навук Брэсцкага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна Іна ШВЕД. Яна згуртавала вакол сябе студэнтаў-аматараў, якія з задавальненнем удзельнічаюць у фальклорных экспедыцыях. Затым матэрыял сістэматызуецца, апрацоўваецца. Нешта пазней друкуецца на старонках «Астрамечаўскага рукапісу».

Рэдактар і ўкладальнік альманаха Аляксандр ВАЛКОВІЧ паведаміў пра змест кожнай рубрыкі часопіса, расказаў, як збіраецца матэрыя па гістарычнай, літаратурнай, харэаграфічнай спадчыне рэгіёна. Усё гэта мы бачым і ў чацвёртым нумары выдання, дзе чытача, несумненна, прывабіць артыкул пра 335-годдзе царквы вёскі Вістычы, расказы пра вясельныя абрады некаторых вёсак, замалёўкі пра народных майстроў раёна.

Намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама Людміла ЖУКОВІЧ нагадала прысутным, што «Астрамечаўскі рукапіс» стаў сапраўдным культурным брэндам раёна. Альманах служыць справе па ўшанаванні памяці славутых людзей Брэстчыны, а таксама ўсяляе веру і надзею на далейшы культурны росквіт малой радзімы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

18 снежня 2013 г. № 22 (320)

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

СТАРТАВАЛА

Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў Беларусі дваццаць сёмага склікання прызначаны на 23 сакавіка 2014 года. Адпаведны ўказ № 557 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 16 снежня.

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ: новае ў фінансаванні і не толькі

Зусім нядаўна ў сілу ўступілі папраўкі ў Выбарчы кодэкс, а ўжо ў сакавіку наступнага года ў Беларусі павінны прайсці выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Чым яны будуць адрознівацца ад мінулых выбараў 2010 года? Пра гэта расказаў Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэферэндумаў.

Спыніць «вайну лістовак»?

— Большасць паправак, што ўнесены ў выбарчае заканадаўства, закранаюць у тым ліку і мясцовыя выбары, — падкрэсліў Мікалай Іванавіч. — У прыватнасці, зменіцца фінансаванне выбарчых кампаній кандыдатаў.

Так, раней для публікацыі перадвыбарных лістовак кандыдатам у дэпутаты з бюджэту выдзялялася пэўная сума грошай. Зараз яна будзе перадавацца не кандыдатам, а выбарчым камісіям. Менавіта яны будуць рыхтаваць інфармацыйны матэрыял пра ўсіх кандыдатаў, якія балатуюцца па акрузе, і разам з запрашэннем на выбары перадаваць гэтую інфармацыю выбаршчыкам.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЭКСПЕРЫМЕНТАМ — ПА ДАЎГАХ

«ТЫ Ў ЧАРЗЕ НА ВЫСЯЛЕННЕ»

Каб дастукацца да кожнага даўжніка, магілёўскія камунальнікі выкарыстоўваюць у тым ліку і нетрадыцыйныя метады

«Калі гара не ідзе да Магамета, Магамет адпраўляецца да яе сам», — па гэтым прынцыпе дзейнічаюць у Магілёве.

— Калі не дапамагае звычайнае ўздзеянне на неплацельшчыка, — такое, як наведванне на даму, тэлефоннае папярэджанне, хадайніцтва па месцы працы, адключэнне паслугі, мы ўжываем больш дзейсныя рычагі, — кажа намеснік дырэктара Магілёўскага цэнтра гарадскіх інфармацыйных сістэм (ЦГІС) Павел Жуйкоў. — Напрыклад, замест звычайнага тэлефанавання падключаем аўтаробат, які нагадвае пра доўг кожны дзень, або наклейваем на дзверы паведамленне: «Ты ў чарзе на высяленне».

І такіх метадаў у камунальнікаў дастаткова. Вядома, што калі чалавек не вылучаецца ўзорным ладам жыцця і злоўжывае алкаголем, ён не вельмі турбуецца пра тое, што ў яго не аплачана па рахунках. Але калі на бутэльках з пладова-ягадным напоем з'явіліся этыкеткі з... прапановай звярнуцца ў разліковакасавыя цэнтры, каб вырашыць пытанне па даўгах, гэта мела свой вынік. Не тое каб ва ўсіх, хто злоўжывае гарэлкай, раптам прачнулася сумленне... Але ж людзі крыху дысцыплінаваліся. Калісьці даўжнікам нават аказвалі дапамогу ў працаўладкаванні — з умовай, што пэўны працэнт з заробку будзе ўтрыманы ў кошт доўгу. У апошні час цэнтр выйшаў на новы ўзровень у сваіх эксперыментах і пачаў весці пошук неплацельшчыкаў праз сацыяльныя сеткі.

— На такі крок мы пайшлі пасля таго, як не змаглі знайсці каля 100 неплацельшчыкаў, — кажа Павел Жуйкоў. — Але пасля пошукаў у інтэрнэце трэць з іх адгукнулася. Гэта тыя, хто паехалі на працу за межы краіны і думалі, што нічога страшнага не будзе, калі разлічацца з намі пасля вяртання дадому. Людзі былі вельмі здзіўлены тым, што іх шукаюць нават праз інтэрнэт.

Вельмі карысным атрымалася і супрацоўніцтва з банкамі. Звяртаецца, напрыклад, такі неабавязковы чалавек па крэдыт, а яму кажуць: маўляў, рады былі б дапамагчы, але ж не маем магчымасці. Калі чалавек не плаціць за камунальныя паслугі, то які да яго давер?

Затое для добрасумленных плацельшчыкаў ЦГІС распрацаваў сваю сістэму заахвочванняў. Ёсць дамоўленасць з крамай бытавой тэхнікі «Догма», якая пры прад'яўленні жыроўкі па аплаце за апошні месяц дае магчымасць набыць той жа тэлевізар або халадзільнік з растэрміноўкай на некалькі месяцаў без пераплаты.

Акрамя гэтага, з 2006 года ў горадзе праводзіцца конкурс, у якім удзельнічаюць тыя, хто ў тэрмін аплачвае паслугі. А найбольш каштоўныя прызы разыгрываюцца паміж жыльцамі, якія гэта робяць да 15 числа кожнага месяца.

На жаль, зусім без даўжнікоў не абыходзіцца. На 1 лістапада ў Магілёве іх было 4827. А такіх, якія не плацяць за камуналку больш за год — 1400 чалавек. Да іх прымаюцца больш жорсткія меры. Калі чалавек не плаціць 3 месяцы, яму адключаюць, напрыклад, гарачую ваду, а калі больш — падаюць іск у натарыят або суд.

— У гэтым годзе за 10 месяцаў мы падалі 50 іскавых заяў, — адзначае Павел Жуйкоў. — Але ніводнага рашэння аб высяленні неплацельшчыкаў прынята не было. У такіх абставінах хутка знаходзяцца грошы, каб разлічыцца з намі, ці ў самога даўжніка, ці ў яго сваякоў. А вось летась аднаго даўжніка ўсё ж прыйшлося перасяліць у кватэру меншай плошчы і горшых спажывецкіх якасцяў. Падменны фонд у нас не вельмі вялікі, але яго дастаткова.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ ГОДА

Сяргей АШМЯНЦАЎ, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў:

— Галоўнай формай работы дэпутацкага корпуса Брэстчыны паступова сталі выязныя сесіі ў рэгіёнах. У працэсе работы мы з калегамі пераканаліся: лепш раз убачыць, чым сто разоў пачуць. За два апошнія скліканні дэпутаты нашага абласнога Савета пабывалі ў кожным раёне.

Так, сёлета ў Пінскім і Пружанскім раёнах мы пазнаёміліся з вопытам падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак. І пераканаліся, што Пружаншчына ў гэтым сэнсе можа служыць узорам не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы. Мясцовыя ўлады ды і суб'екты гаспадарання аказваюць людзям істотную дапамогу: забяспечваюць пашай і кармамі, апрацоўваюць прысядзібныя ўчасткі, купляюць лішкі сельгаспрадукцыі. Сістэма работы выстройвалася гадамі. Як вынік, у Пружанскім раёне адзін з лепшых паказчыкаў закупу малака на карову.

У Столінскім раёне мы разглядалі работу па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі. За апошняе дзясяцігоддзе ў вобласці прыведзены ў парадак усе раённыя цэнтры, па праграме адраджэння вёскі абсталяваны многія аграгарадкі. Але ж у гэтай справе трэба дайсці да кожнай вёскі, да кожнага кавалка зямлі.

Марына БОНДАР, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў:

— Амаль за чатыры гады працы ў дэпутацкага корпуса Гомельшчыны сфарміраваўся свой почырк. Сярод асноўных нашых накірункаў — добраўпарадкаванне, духоўна-маральнае выхаванне, фізкультурна-масавая работа і адраджэнне народных традыцый.

Імкнемся ўзаемадзейнічаць з выканаўчымі органамі ўлады. Дэпутаты ўсіх узроўняў шмат зрабілі для таго, каб населеныя пункты былі добраўпарадкаванымі. У выніку сумеснай працы на тэрыторыі вобласці даведзены да ладу ўсе помнікі і мемарыяльныя комплексы, знойдзены новыя гаспадары для 200 будынкаў, якія доўгі час не выкарыстоўваліся, знесена 6300 пустуючых хат. Менавіта з дэпутацкай ініцыятывы пачалося ўсталяванне ў сельскіх населеных пунктах дзіцячых пляцовак. Дэпутаты таксама зрабілі значны ўнёсак у самаабкладанне: і арганізацыяй гэтай працы, і асабістым прыкладам.

Надыходзячыя цудоўныя святы нясуць надзею і на новыя дасягненні, здзяйсненні, перамогі. Шчыра жадаю, каб у гэтыя святочныя дні ва ўсіх дамах панавала разуменне і цеплыня.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Барыс БАГДАНЕЦ, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:

— У мясцовых Саветаў ёсць важнае звяно сувязі з жыхарамі населеных пунктаў — старасты. Гэта, так бы мовіць, вочы і вушы сельскага выканаўчага камітэта, вялікая когорта грамадскіх актывістаў, найбольш аўтарытэтных людзей, якія дапамагаюць аднавяскоўцам і органам улады ў вырашэнні самых надзённых пытанняў. Праца старастаў быццам і непрыкметная, але вельмі важная, і гэтыя людзі павінны заахвочвацца. Прычым не толькі маральна, словамі падзякі на раённым і абласным узроўні, але і матэрыяльна. Мяркую, на Гродзеншчыне будзем рабіць гэта на пастаяннай аснове: сёлета ўжо прэміравана каля 50 старастаў.

Вельмі важная задача органаў улады пярвічнага звяна — праца па навядзенні парадку на зямлі, клопат пра лёс пустуючых дамоў, добраўпарадкаванне могілак. Нядаўна, напрыклад, па ініцыятыве мясцовага Савета добраўпарадкаваны могілкі ў пасёлку Сапоцкін, шмат у гэтым кірунку зроблена і ў іншых населеных пунктах.

Сёлета больш актыўна, на маю думку, зацікаўленыя службы і грамадскія фарміраванні працавалі ў аглядавых камісіях па выяўленні парушэнняў пажарнай бяспекі і іншых праблем у домаўладаннях, сацыяльна небяспечных сем'ях. Гэтыя пытанні, дарэчы, былі спецыяльна разгледжаны на сесіі абласнога Савета дэпутатаў.

Што датычыцца аптымізацыі сельскіх Саветаў, то гэта рабілася з выездам на месцы і тлумачэннем людзям. Ніводны работнік сельвыканкамаў, што трапілі пад скарачэнне, не застаўся без працы. Упэўнены, што органамі ўлады будзе зроблена ўсё, каб у новых адміністрацыйна-тэрытарыяльных рэаліях усе важныя для населеных пунктаў і іх жыхароў пытанні вырашаліся на належным узроўні.

Іван ЛІПНІЦКІ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў:

— З 2006 года ў нас мэтанакіравана і паступова праводзіцца работа па ўзбуйненні сельсаветаў. Сёлета ў маі завяршыўся чарговы этап аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак пярвічнага ўзроўню. Пры гэтым сачылі, каб следам за ліквідацыяй сельсаветаў не былі закрыты аб'екты інфраструктуры, не знізілася прывабнасць населеных пунктаў, развіваліся транспартныя зносіны з цэнтрамі нанова створаных сельсаветаў, а фінансавыя сродкі накіроўваліся на павышэнне якасці паслуг насельніцтву, даступнасці гандлёвых і сацыяльных аб'ектаў.

Сёлета ўпершыню пачалася распрацоўка канцэпцыі развіцця сельсаветаў і сельскіх населеных пунктаў Міншчыны на 2014-2020 гады. Раней прымаўся генеральны план у дачыненні гарадоў. Але ж не менш важна прагназаваць і развіццё сельскай мясцовасці з улікам дэмаграфічнай сітуацыі. Для таго, каб рацыянальна выкарыстоўваць жыллёвы фонд, вытворчыя і матэрыяльныя рэсурсы, эфектыўна вырашаць пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва. На тэрыторыі Мінскай вобласці налічваецца 5206 вёсак, дзе пражывае каля 610 тысяч чалавек.

У сталічнай вобласці 2013-ы быў аб'яўлены Годам навядзення парадку на зямлі і добраўпарадкавання. Шмат увагі надавалі пытанням навядзення парадку ў населеных пунктах, на тэрыторыях ляснога фонду, дарожных арганізацый, меліяраваных землях.

Актуальным застаецца такі накірунак, як выкарыстанне або знос пустуючых старых дамоў у сельскай мясцовасці, старых будынкаў, жывёлагадоўчых фермаў, іншых вытворчых пабудоў, якія прыйшлі ў непрыдатнасць і псуюць знешні выгляд вёскі. На гэтыя пытанні будзе скіравана асаблівая ўвага і ў 2014 годзе.

Раіса ЛЫЧКОЎСКАЯ, намеснік старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў:

— Гэты год быў вельмі напружаным і разам з тым плённым. На сесіях разглядаліся розныя пытанні, у тым ліку эканоміі і беражлівасці, мадэрнізацыі прадпрыемстваў, занятасці і падтрымкі моладзі, дапамогі дзецям з праблемных сем'яў, мясцовага кіравання і самакіравання. Адным з актуальных пытанняў, разгледжаных на пасяджэнні прэзідыума аблсавета, стала якасць жылля, якое будуецца ў Магілёўскай вобласці. Шмат увагі надавалі аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання вобласці: на працягу года было скасавана 20 сельсаветаў, а больш за 40 рэарганізавана з улікам інтарэсаў народнай гаспадаркі і насельніцтва, якое там жыве.

Разам з абласнымі, раённымі і сельскімі Саветамі і выканкамамі мы прымалі рашэнні па зносе трухлявага жылля, думалі, як палепшыць работу па папярэджанні гібелі людзей — ад пажараў і іншых знешніх прычын.

На міжнародным узроўні былі падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве з дэпутатамі Адэскай і Бранскай абласцей.

Шмат чаго было зроблена для моладзі. У Магілёўскай вобласці пражывае звыш 240 тысяч маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 31 года. Пытанні фарміравання здаровага ладу жыцця і прафілактыкі негатыўных з'яў сярод моладзі застаюцца актуальнымі. І тут мы працуем разам з моладзевымі арганізацыямі і выканаўчай уладай. Вось даручылі гарадскім і раённым Саветам дэпутатаў, выканаўчым камітэтам да 1 студзеня 2014 года распрацаваць пытанне стварэння моладзевых тэрытарыяльных органаў самакіравання.

ДЫЯЛОГ «МС»

Васіль ПАНАСЮК:

«ПАСТАРАЕМСЯ АПРАЎДАЦЬ ЧАКАННІ»

Нядаўна дэпутаты Мінскага гарсавета вярнуліся з Масквы з добрай навіной. Пасля 12-гадовага зацішша ў стасунках народныя выбраннікі Мінска і Масквы вырашылі пашырыць двухбаковыя сувязі ў інтарэсах жыхароў дзвюх сталіц. Пра гэта, а таксама пра падрыхтоўку да чэмпіянату свету па хакеі і гарадскі бюджэт на наступны год размаўляем са старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Васілём ПАНАСЮКОМ.

— Васіль Васільевіч, які вопыт маскоўскіх калег цікавы Мінску?

— Сур'ёзныя напрацоўкі мае Масква ў развіцці грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, а таксама ў рабоце з ветэранамі. У прыватнасці, там у кватэрах пажылых людзей усталёўваюць так званыя «кнопкі жыцця». Не сакрэт, што чалавеку ва ўзросце часам складана набраць нумар 102, «трывожная» ж кнопка дазваляе імгненна звязацца з дыспетчарам. Спадзяюся, што пакрысе і ў Мінску ўвядзём такія кнопкі. Падчас сустрэчы мы не толькі дзяліліся вопытам, але і абмяркоўвалі перспектывы далейшага ўзаемадзеяння. Спадзяюся, у наступным годзе яно ўвасобіцца ў двухбаковым пратаколе аб супрацоўніцтве.

— Ведаю, што гарадскі Савет дэпутатаў прымае непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы да чэмпіянату свету па хакеі. Да яго пачатку засталося не так шмат часу. Ці паспяваеце ўсё, што задумалі?

— Сапраўды, сёлета вельмі шмат увагі надавалася будаўніцтву аб'ектаў, прымеркаваных да майскага чэмпіянату. Для гасцей горада свае дзверы адчыняць 11 новых гасцініц рознага ўзроўню зорнасці. Акрамя таго, пасля рэканструкцыі новы воблік набудуць старыя гасцініцы, сярод якіх і «Беларусь». Завяршаецца і будаўніцтва ўнікальнага збудавання — спартыўна-забаўляльнага комплексу «Чыжоўка-Арэна». Там на малой арэне ўжо абкатваецца лёд. Практычна завершаны работы на вялікай арэне.

— Хто будзе сачыць за тым, каб уладальнікі гасцініц не павышалі кошты падчас чэмпіянату?

— Падобная ўстаноўка дадзена не толькі гасцініцам, але і пунктам грамадскага харчавання. Мы гэта пытанне будзем трымаць на асаблівым кантролі. Таксама ў страўнях стартуе праект «Нацыянальная кухня». Хочацца, каб госці, якія прыедуць з розных куткоў свету, змаглі пакаштаваць нашы нацыянальныя стравы і напоўніцу адчуць беларускі каларыт, гасціннасць. Падрыхтоўка да чэмпіянату і зараз ідзе поўным ходам. Супрацоўнікі міліцыі, персанал гасцініц і гандлёвых пунктаў інтэнсіўна займаюцца вывучэннем англійскай мовы. Для гэтых мэтаў выпушчаны адмысловыя кароткія слоўнікі. У моўным плане разлічваем і на дапамогу студэнтаў-валанцёраў з лінгвістычнага ўніверсітэта. Распрацоўваюцца экспрэс-маршруты паміж чыгункай, «Мінск-Арэнай» і «Чыжоўка-Арэнай», каб людзі адначасова без затрымкі маглі даехаць да месца прызначэння. Па ўзгодненні з ДАІ будуць арганізаваны і дадатковыя парковачныя месцы для тых, хто захоча прыехаць на матч на аўтамабілі.

— Не баіцеся, што новыя гасцініцы будуць пуставаць пасля таго, як скончыцца чэмпіянат свету?

— Мінск заўсёды вылучаўся недахопам гасцінічных месцаў. Таму чэмпіянат свету, на мой погляд, стаў добрым стымулам, каб ліквідаваць гэты недахоп. Паверце, мы цікавыя іншаземцам нават без чэмпіянату свету. Так, напярэдадні калядных святаў практычна ўсе нумары ў сталічных гасцініцах ужо забраніраваны. Я не кажу ўжо пра аграсядзібы, што за межамі Мінска.

— Як толькі зайшла да вас у кабінет, адразу ж заўважыла цікавы дакумент — бюджэт на 2013 год — на працоўным стале...

— Так, гэта настольная кніга.

— Вядома, што ад прыняцця новага бюджэту ў многім будзе залежаць наступны год мінчан. На што плануецца накіраваць бюджэтныя грошы ў 2014-м?

— Галоўная сесія года гарсавета, на якой мы будзем абмяркоўваць праект бюджэту, адбудзецца 23 снежня. У нас сацыяльна арыентаваны бюджэт: 62% з 28 трлн бюджэтных сродкаў сёлета пайшло на сацыяльныя праграмы, якіх больш за 20. У наступным годзе сацыяльная накіраванасць бюджэту адназначна захаваецца ў ранейшых прапорцыях і нават, магчыма, узмацніцца. Так, мы хочам перагледзець даходы сталічных педагагічных работнікаў. Будзем настойваць на «разняволенні» базавай: каб даплаты работнікам сістэмы адукацыі, як і раней, былі кратныя памеру базавай велічыні. Іншымі словамі, каб з ростам базавай велічыні мяняўся і памер даплаты. Для таго, каб у горадзе запрацавала гэтая норма, патрэбна каля 83 млрд рублёў. Яшчэ разглядаем пытанне, каб выдаткаваць сродкі на павелічэнне кантрактнага каэфіцыента для работнікаў устаноў адукацыі. Людзі, якія займаюцца выхаваннем нашых дзяцей, павінны быць больш сацыяльна абароненымі. Хвалюе нас і пытанне аплаты працы работнікаў аховы здароўя. Наколькі павысяцца заробкі педагогаў і медыкаў, залежыць ад таго, як стабільна і эфектыўна будзе працаваць рэальны сектар эканомікі сталіцы... Бо не сакрэт, што менавіта ён фарміруе львіную долю бюджэту горада.

— Сёння вельмі папулярная тэма — арэнднае жыллё. У Мінску, наколькі ведаю, ужо здадзены два арэндныя дамы. Як будзе развівацца арэнднае будаўніцтва ў наступным годзе?

— Да канца года плануем увесці яшчэ адзін арэндны дом. Налета — 102 тыс. кв.м арэнднага жылля. Разам з арэнднымі дамамі працягваем будаваць службовыя інтэрнаты, каб замацаваць пасля размеркавання на працоўным месцы тых жа самых настаўнікаў і ўрачоў. Не так даўно ў Мінску мы ўвялі адзін інтэрнат для медработнікаў, у бліжэйшы час плануем здаць яшчэ адзін.

— А што з «застойнымі» дамамі?

— Гэтае пытанне на жорсткім кантролі ў старшыні Мінскага гарвыканкама. І дзякуючы такому кантролю іх становіцца ўсё менш і менш. Таксама, згодна з нядаўняй нарадай у Прэзідэнта, да ліпеня 2014 года ўсе праблемныя дамы будуць уведзены ў эксплуатацыю.

— Якія сёння самыя актуальныя праблемы для жыхароў горада, акрамя жыллёвых?

— Недахоп паліклінік, дзіцячых садкоў, школ, а таксама парковак. Што тычыцца сацыяльных аб'ектаў, то гэтая праблема асабліва востра стаіць у новых жылых раёнах. У прыватнасці, у Каменнай Горцы ды мікрараёне Брылевічы адчуваецца вострая патрэба ў дзіцячай і дарослай паліклініках. І мы над гэтым пытаннем ужо працуем. Што тычыцца дадатковых парковак на ўнутрыдворовых тэрыторыях, то падключаем да гэтай справы саміх аўтаўладальнікаў. Людзі, што радуе, ахвотна адгукаюцца. Збіраюць грошы ў тым ліку і на дадатковыя дзіцячыя пляцоўкі. ЖЭС, у сваю чаргу, бярэ на сябе выдаткі на іх мантаж. Сёлета Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў новую рэдакцыю правілаў добраўпарадкавання. Стараемся, каб кожны гараджанін унёс пасільную лепту ў добраўпарадкаванне свайго горада. І як паказвае практыка, да зробленага сваімі рукамі зусім іншае, больш беражлівае, стаўленне.

— Да Новага года засталося ўсяго два тыдні. Што пажадаеце мінчанам напярэдадні гэтага казачнага свята?

— Зычу ў 2014-м моцнага здароўя, а таксама разумення, кахання і ўвагі з боку дарагіх людзей. А ўжо Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, у сваю чаргу, пастараецца і ў наступным годзе апраўдаць чаканні мінчан.

Надзея ДРЫЛА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УЛАСНЫ ПАДВОРАК

КАРОВА — УСЯГО АСНОВА

Па аб'ёмах закупленага малака Нясвіжскаму раёну практычна няма роўных. Нягледзячы нават на тое, што колькасць жывёлы штогод змяншаецца. У 2012-м жыхары раёна трымалі 647 кароў, а сёлета іх засталося 520.

— Аддадзім належнае кіраўнікам сельгасарганізацый і прадпрыемстваў, якія з асаблівай увагай ставяцца да патрэб прыватнага сектара, — кажа **старшыня Нясвіжскага раённага Савета дэпутатаў Валерый Лазюк.** — Напрыклад, пры неабходнасці людзі могуць купіць жывёлу ў гаспадарцы або замяніць яе новай. Прадпрыемствы скошваюць, сушаць і прасуюць сена, дастаўляюць яго на падворкі. Пад поўную патрэбу выдзяляецца паша — як мінімум 40 сотак, у той час як норма на карову — 35 сотак. Своечасова падкормліваецца, падкошваецца трава. У нас адпрацавана пэўная сістэма па аказанні дапамогі насельніцтву. Напрыклад, чалавеку трэба толькі 10 сотак для бульбы, а ўчастак каля дома значна большы. У такім выпадку лішак яму засяваюць збожжавымі, а затым гаспадар можа купіць гэтае збожжа па сабекошце. Сельгаспрадпрыемствы апрацоўваюць надзел каля дома па прымальнай цане за сотку, саджаюць бульбу, выдзяляюць тэхніку для іншых патрэб.

У раёне распрацаваны ўмовы аплаты за здадзенае цяля. У адных арганізацыях разлічваюцца натуральнай аплатай: сенам, саломай, камбікармамі, збожжам. У іншых — грашыма. У залежнасці ад жадання чалавека. З пачатку года ў насельніцтва закупілі звыш 340 галоў буйной рагатай жывёлы замест запланаваных 260. Сёлета ні ў райсавет, ні ў райвыканкам ніхто са скаргамі на работу сельскіх Саветаў не звяртаўся. На месцах зацікаўлены ў дапамозе нават тым, хто пайшоў на заслужаны адпачынак. Іх нельга скідваць з рахунку, паколькі пенсіянеры аддалі калгасу большую частку свайго жыцця.

Дадам, што ў шмат якіх сельсаветах і моладзь займаецца падсобнай гаспадаркай. Хтосьці вырошчвае агародніну, нехта трымае парсючкоў ці трусоў, іншы — карову.

І ўсё ж назіраецца тэндэнцыя да змяншэння колькасці пагалоўя ў падсобных гаспадарках грамадзян. Справа ў тым, што ідзе натуральнае старэнне насельніцтва, а старым не пад сілу догляд жыўнасці. З другога боку, умовы жыцця ў вёсцы «падцягваюцца» да гарадскіх, прадукты харчавання, зыходзячы з заробкаў, даступныя ўсім. Акрамя таго, многія вяскоўцы жывуць у шматпавярховых дамах, пры якіх няма падсобных памяшканняў, а значыць і ўмоў, каб абзавесціся свойскай жывёлай.

У Сейлавіцкім сельсавеце закуплена звыш 700 тон малака (4 тыс. 771 кілаграм на карову). Ёсць людзі, якія маюць па 6 кароў і здаюць дзяржаве звыш 25 тон малака за год. За збор малака ў насельніцтва адказваюць сельвыканкамы.

— Мы не хочам аддаваць гэты ўчастак камерсантам. Калі б так зрабілі, то прадпрымальнікі, напрыклад, падзялілі б тэрыторыю раёна на дваіх і атрымлівалі б чысты прыбытак ды плюс яшчэ зарплату. Збор малака — працэс працаёмкі, адказны, абы-каму не даверыш. Таму на месцах падбіраюць сумленных і працавітых людзей, — адзначыў Валерый Лазюк.

Сапраўды, збор малака ў Нясвіжскім раёне выгадны. Толькі за мінулы год чысты прыбытак ад яго рэалізацыі склаў каля 500 млн рублёў. Гэтыя грошы засталіся ў сельсаветах. Сродкі выкарыстоўваюцца на розныя патрэбы, напрыклад, на добраўпарадкаванне, рамонт памяшканняў, замену электраправодкі, лямпачак і іншае.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ:

новае ў фінансаванні і не толькі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Па словах Мікалая Лазавіка, з аднаго боку, у Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў заўважылі, што на мясцовых выбарах кандыдаты ў дэпутаты Саветаў пярвічнага ўзроўню — сельскіх і пасялковых — гэтыя грошы амаль не выкарыстоўвалі. Затое падчас перадвыбарнай кампаніі ў абласны Савет друкаваліся інфармацыйныя матэрыялы, больш за тое, — там назіралася сапраўдная «вайна лістовак»: адны кандыдаты развешваюць лістоўкі, а прыхільнікі іншых зрываюць іх і наклейваюць свае.

— Мы лічым, што змена парадку фінансавання агітацыйнай выбарчай кампаніі якраз і зможа спыніць гэтую «вайну», — адзначыў сакратар Цэнтральнай камісіі. — Але самае галоўнае тут — выбаршчыкі атрымаюць поўную інфармацыю пра ўсіх кандыдатаў у дэпутаты. Бо бывае, што людзі ведаюць пэўную інфармацыю толькі пра аднаго кандыдата. Таму ўведзена такая норма, якая будзе дзейнічаць на ўсіх узроўнях: на прэзідэнцкіх выбарах, на парламенцкіх, на мясцовых.

З другога боку, калі кандыдат, у тым ліку ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, хоча выдаць лістоўкі — яму дазваляецца сфарміраваць свой індывідуальны выбарчы фонд. Максімальная сума ўсіх выдаткаў са сродкаў выбарчага фонду кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета дэпутатаў не можа перавышаць 10 базавых велічынь.

— Цяпер любы кандыдат можа ўзяць гэтыя грошы нават з асабістай кішэні. Раней для кандыдатаў у прэзідэнты і ў Палату прадстаўнікоў сума з асабістых сродкаў абмяжоўвалася. Цяпер — калі ласка, калі маеш сродкі, то можна з гэтых грошай сфарміраваць нават цалкам суму выбарчага фонду.

Пра турму і суму

У гісторыі выбарчых кампаній розных гадоў здаралася такое, калі кандыдаты ўсвядомлення імкнуліся ўтаіць некаторыя факты сваёй біяграфіі, якія не вельмі добра іх характарызуюць, ад выбаршчыкаў. Мікалай Лазавік прыгадаў выпадак з мінулых парламенцкіх выбараў, калі двойчы судзімы грамадзянін проста замоўчваў гэты факт. Чалавек вылучыўся кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, але пра тое, што ў яго былі судзімасці, ён не сказаў. І нават калі яму задавалі прамое пытанне «Скажыце, калі і за што вы сядзелі?», ён адказваў, што не мае судзімасці.

— Сапраўды, на той час яна ўжо была пагашана, — згаджаецца сакратар Цэнтральнай камісіі, — але ж біяграфічны факт ёсць. Таму ў Законе з'явілася такая норма, згодна з якой у біяграфічных звестках грамадзянін, які балатуецца кандыдатам у дэпутаты, павінен указваць звесткі пра ранейшую судзімасць, калі яна была. Калі судзімасць знята, то гэта не будзе перашкодай для вылучэння кандыдата ў дэпутаты. Але людзі павінны ведаць, за каго яны будуць галасаваць.

Яшчэ адно новаўвядзенне, накіраванае на павышэнне інфармаванасці выбаршчыкаў, тычыцца беспрацоўных грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія вылучаюцца кандыдатамі ў дэпутаты. Закон патрабуе ад гэтых людзей паведаміць, за кошт якіх сродкаў яны жывуць.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Адзін кандыдат — адна акруга

Палата прадстаўнікоў прыняла Закон аб далучэнні да канвенцыі пра стандарты свабодных і дэмакратычных выбараў у краінах Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У гэтай канвенцыі ёсць палажэнне, што ў краінах СНД рэкамендуецца забараніць агітацыю, накіраваную на зрыў або адмену выбараў. Таму яшчэ адна змена ў Выбарчым кодэксе Беларусі тычыцца менавіта гэтай нормы.

— Яна будзе дзейнічаць і на выбарах у мясцовыя Саветы, якія маюць адбыцца, — інфармуе Мікалай Лазавік. — Забаронена агітаваць за байкот выбараў як самім кандыдатам, так і іх штабам і нават грамадзянам-выбаршчыкам.

Раней назіралася часам такая практыка, калі адзін грамадзянін вылучаўся кандыдатам адразу па некалькіх выбарчых акругах. Для яго гэта была своеасаблівая піяр-кампанія. З іншага боку, лічыць Мікалай Іванавіч, гэта быў падман выбаршчыкаў. Ужо на гэтых мясцовых выбарах пачынае дзейнічаць норма, калі кандыдат можа балатавацца ў сельскі, раённы, гарадскі і ў абласны Савет толькі ад адной акругі кожнага Савета.

— Але каб у Савет аднаго тэрытарыяльнага ўзроўню адразу па трох, чатырох або пяці акругах — такое не дапускаецца, — падкрэсліў сакратар Цэнтральнай камісіі.

Выхад з юрыдычных «тупікоў»

Да прыняцця змен і дапаўненняў у Выбарчы кодэкс на першай арганізацыйнай сесіі нанова выбранага Савета заўсёды прызнаваліся паўнамоцтвы выбраных дэпутатаў.

— Але паўнамоцтвамі дэпутатаў надзяляе не сесія, а выбаршчык, — падкрэслівае Мікалай Іванавіч. — І гэта працэдура магла ў тэорыі прывесці да такога юрыдычнага тупіка, калі нечыя паўнамоцтвы сесія магла раптам не прызнаць.

Справа ў тым, што калі дэпутат ужо выбраны ў адпаведнасці з Законам, атрымаў у акружной камісіі пасведчанне аб выбранні, то ніхто не мае права адмяніць рашэнне пра гэта. А калі сесія гэтага не прызнала, то атрымліваецца, што дэпутат выбраны, але не мае магчымасці працаваць. І юрыдычнага выйсця з гэтага становішча няма. Таму Закон цяпер адмяніў працэдуру прызнання паўнамоцтваў дэпутатаў, а на першай сесіі будуць прызнавацца паўнамоцтвы самога Савета. Так, калі дэпутатаў выбрана дастатковая колькасць, то Савет прызнаецца паўнамоцным і прыступае да выканання сваіх абавязкаў.

Ёсць яшчэ некаторыя дапаўненні, якія тычацца расшырэння правоў грамадзян, якія вылучаюцца і вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты. У прыватнасці, калі такім грамадзянам выбарчая камісія аб'явіла папярэджанне, то цяпер яны могуць аспрэчыць гэтае рашэнне не толькі ў больш высокай камісіі, але і ў судзе.

Таксама ўпарадкавана працэдура падачы скаргаў на рашэнні выбарчых камісій і на парушэнні выбарчага заканадаўства. У нас здаралася, што нават праз 2-3 гады пасля выбараў падавалі такія заявы. Цяпер іх можна падаць толькі на працягу 10 дзён пасля заканчэння галасавання. Заяву з прапановай пералічыць галасы на ўчастку можа падаць не любы грамадзянін, а толькі кандыдат у дэпутаты, які балатаваўся па гэтай выбарчай акрузе, або выбарчая камісія, якая выявіла нейкія істотныя парушэнні заканадаўства.

— Цэнтральная Камісія гатова да новай выбарчай кампаніі. Мы падрыхтавалі праекты метадычных рэкамендацый для выбарчых камісій і праекты рашэнняў па тых пытаннях, якія патрабуюць дадатковага тлумачэння, — рэзюмаваў Мікалай Лазавік.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

Стварэнне тэрытарыяльных выбаркамаў на мясцовых выбарах у Беларусі павінна адбыцца да 27 снежня. Аб гэтым учора заявіў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік на пасяджэнні ЦВК па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Беларусі 27-га склікання, перадае БЕЛТА.

Акруговыя выбарчыя камісіі павінны быць сфарміраваны да 6 студзеня, участкі — да 21 студзеня, участковыя камісіі — да 5 лютага ўключна.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў пройдзе з 12 студзеня па 10 лютага. Прэтэндэнты на дэпутацкі партфель павінны прадставіць неабходныя дакументы не пазней за гэты тэрмін.

З 11 па 20 лютага — этап рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. Камісіі разгледзяць пададзеныя дакументы, правядуць неабходныя праверкі.

Самы актыўны перыяд выбарчай кампаніі — агітацыйны — пачынаецца з моманту рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты і пройдзе па 22 сакавіка.

Датэрміновае галасаванне на выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў пройдзе з 18 па 22 сакавіка.

ПАДСОБНАЯ, АЛЕ НЕ ДРУГАРАДНАЯ

Сёння ў тых жыхароў Шаркаўшчыны, хто трымае падсобныя гаспадаркі, ва ўласнасці — каля чатырохсот трактароў. (Для параўнання, коней — 290.) А яшчэ Шаркаўшчына — адзін з лідараў вобласці па закупцы ў насельніцтва малака.

Уладзімір Шпец, старшыня раённага Савета дэпутатаў, тлумачыць гэта проста: на Шаркаўшчыне, як і ў іншых так званых «заходніх» раёнах Прыдзвінскага краю, жывуць сапраўдныя гаспадары.

— У раёне з колькасцю насельніцтва каля 17,6 тысячы і прыкладна 5,2 тысячы прыватных падворкаў налічваецца 1,8 тысячы кароў. Больш толькі ў Браслаўскім, Мёрскім і Глыбоцкім раёнах.

Затое паказчык па закупцы малака ў насельніцтва — 6187 тон — лепшы ў вобласці. Сярод здатчыкаў ёсць рэкардсмены. «Залаты прызёр» — Венядзікт Казарэвіч, які трымае пяць кароў і летась здаў 22903 кілаграмы малака. За гэта кіраўніцтва Глыбоцкага малочнаканцервавага камбіната падарыла яму электрадаілку. На другім і трэцім месцах, адпаведна, Святлана Шчабол і Ірына Мохат.

Малако ў насельніцтва збіраюць прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «МалТрансЭкспрэс» і шэсць індывідуальных прадпрымальнікаў. Згаданае прадпрыемства дзейнічае ўжо пяць гадоў — акрамя сельсаветаў Шаркаўшчынскага раёна, абслугоўвае і Браслаўскі. Нараканняў ад насельніцтва не мае. Вядома, бывае, гаспадар незадаволены тым, як ацанілі тлустасць малака. Але ў прадпрыемства ёсць сучасныя прыборы трох відаў. І з іх паказаннямі не паспрачаешся.

Няма праблем і з выпасам жывёлы. Падкормка пашы, падкос — усё право-дзяць гаспадаркі. Выпас ажыццяўляецца ў электраагароджах. Цана гэтай паслугі сімвалічная: 50—60 тысяч рублёў у месяц. Гаспадаркі за невялікую плату летам да кожнага статка арганізуюць падвоз вады...

Шаркаўшчына лідзіруе і па здачы дзяржаве насельніцтвам цялят. Сёлета такім чынам агульны дзяржаўны статак папоўніўся больш чым на тысячу жывёл. Людзям выгадна вырошчваць і здаваць маладняк, бо ўзамен яны атрымліваюць збожжавыя і сена. Участкі гаспадароў апрацоўвае тэхніка сельгаспрадпрыемстваў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Старшыня райвыканкама перад уборкай падпісвае распараджэнне аб выдзяленні тэхнікі, каб апошняя працавала на ўчастках грамадзян без спазненняў. І падчас пасяўной дзейнічаем аналагічна — сістэма адладжана. Гаспадаркі дапамагаюць людзям апрацаваць зямлю па прымальных расцэнках. Вельмі апраўдалі сябе землі так званага агульнага севазвароту. Зразумела, што сучаснай магутнай тэхніцы складана заехаць на невялічкі кавалачак зямлі на прыватным участку. Таму сёння ўсё больш ахвотных вырошчваць зерневыя на землях сельгаспрадпрыемства.

Напрыканцы нашай размовы Уладзімір Шпец расказаў аб тым, што адзін з сямі сельсаветаў раёна — Валожынскі — ліквідуецца.

— Але гэта не павінна негатыўна паўплываць на дапамогу прыватным гаспадаркам, — падкрэсліў ён.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АГОНЬ ЗАБІРАЕ ЖЫЦЦЁ

У вёсцы Мінкі Бярозаўскага раёна дом згарэў разам з гаспадыняй. Пажар распачаўся ноччу. Пакуль агонь заўважылі суседзі, пакуль прыбылі выратавальнікі, полымя бушавала ўжо ва ўсю. Калі яго ўтаймавалі, знайшлі цела 75-гадовай пенсіянеркі. Паводле папярэдняй версіі спецыялістаў, узгаранне справакавала кароткае замыканне ў праводцы.

А ў вёсцы Парэчча Пінскага раёна ў агні загінуў 38-гадовы вартаўнік мясцовага саду, які ноччу знаходзіўся ў драўлянай бытоўцы. Прычына пажару высвятляецца.

Яна СВЕТАВА.

«ШЭРЫХ» ЗАПЧАСТАК — БОЛЬШ ЧЫМ НА 1,3 МЛРД

На аўтамабільным рынку ў аграгарадку Азярцо ў Мінскім раёне праваахоўныя органы ўстанавілі факт рэалізацыі 43-гадовым індывідуальным прадпрымальнікам аўтамабільных запчастак без адпаведных суправаджальных дакументаў. Акрамя таго, на тавары, які рэалізоўваўся, адсутнічалі кантрольныя (ідэнтыфікацыйныя) знакі.

Падчас праверкі канфіскавана каля 6 тысяч адзінак аўтакамплектуючых на агульную суму больш за 1,3 мільярда рублёў. На тавар супрацоўнікамі падатковай інспекцыі накладзены арышт да рашэння суда. Сам прадавец меў тры гандлёвыя кропкі на аўтамабільным рынку, дзе прадаваў запчасткі для мікрааўтобусаў «Фольксваген» і «Мерседэс». На парушальніка складзены адміністрацыйныя пратаколы. Пакаранне за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць прадугледжвае штраф з канфіскацыяй тавару.

Сяргей РАСОЛЬКА.

САПРАЎДНЫ ЦУД

ВЫРАТАВАЛІ... ВЫРАТАВАЛЬНІКА

— Гэта здарылася а 5 гадзіне дня на возеры Лугавое. 61-гадовы мужчына вяртаўся дадому з рыбалкі і, каб скараціць шлях, вырашыў перайсці праз возера. У выніку праваліўся пад тонкі лёд. А 53-гадовы мінак, які ўбачыў гэта, паспрабаваў дапамагчы небараку, але таксама апынуўся ў вадзе, — паведаміла Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.

Крыкі аб дапамозе пачуў Алег Карака, кіроўца ПАВЧ-1 Гарадоцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. 43-гадовы выратавальнік жыве побач з возерам. Ён выратаваў пенсіянера, якога — яго з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. А іншыя выратавальнікі, якія падаспелі на дапамогу, выцягнулі з вады другога мужчыну, што няўдала паспрабаваў сябе ў ролі выратавальніка. Ад шпіталізацыі ён адмовіўся.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТЭМА ДНЯ

НЕ ЧУЖЫЯ ПРАБЛЕМЫ

У Шчучынскім раёне на ўжо традыцыйным абласным сходзе супрацоўнікаў міліцыі, старастаў населеных пунктаў і іншых прадстаўнікоў грамадскасці гаварылі пра неабходнасць сумеснай працы дзяржаўных органаў і грамадскіх фарміраванняў.

«Для мяне гэта была б катастрофа»

Кіраўнік спраў Васілішкаўскага сельвыканкама Ірына МАРКЕВІЧ на гэтай пасадзе працуе 23 гады. Называе першую прыступку ўлады «гарачай кропкай па любым кірунку работы»:

— Ад нашай працы шмат што залежыць. Бо мы непасрэдна, вочы ў вочы, сутыкаемся з людзьмі і іх праблемамі, да нас ідзе ўся інфармацыя. Іншы раз нават не трэба падымаць дакументы, каб падаць звесткі па тым ці іншым чалавеку.

Ірына Віктараўна з горыччу кажа, што так званая «цяжкая» сям'я сёння ўжо не з'яўляецца, як раней, «нонсэнсам» — бо такіх хапае. Але рукі перад гэтай бядой у Васілішках не апускаюць — супрацьстаяць ёй не толькі сельвыканкам з участковым інспектарам міліцыі, але і члены савета грамадскага пункта аховы правапарадку, агляднай камісіі, старасты, настаўнікі мясцовай школы.

— Вядзём бесперапынны ўлік сацыяльна небяспечных сем'яў, іх ледзь не штотыднёва наведвае аглядная камісія, пастаянны кантроль здзяйсняе школа. Нават забяспечваем дзяцей прадуктамі харчавання. Уважліва адсочваем, чаму дзеці не з'яўляліся на вучобу. Хвароба? Ці, можа, нешта здарылася дома?

Ірына Маркевіч не згодна з думкай, што грамадскі кантроль за людзьмі, якія ігнаруюць элементарныя нормы жыцця, — справа даволі фармальная. І прыводзіць у пацвярджэнне апошнюю сітуацыю, якая «разрульвалася» грамадскасцю:

— Жанчына, у якой ужо забіралі дзяцей згодна з прэзідэнцкім Дэкрэтам № 18, зноў зацяжарала, і трэба было кантраляваць кожны яе крок. Натуральна, паўстала пытанне, аддаваць дзіця ў гэтую сям'ю ці не. Дома ў гэтай жанчыны толькі маці пенсійнага ўзросту. І што яна зможа зрабіць у вёсцы, калі маладая мама пакіне дзіця? Усе сканцэнтраваліся на гэтай праблеме — бальніца, школа, выканкам. Было некалькі наведванняў гэтай хаты, актаў абследавання, гутарак. У выніку прынята рашэнне ўсё ж не аддаваць дзіця гэтай маці. Вельмі цяжкае рашэнне. Я сама мама, і для мяне была б катастрофа, калі б забралі дзіця. Аднак у гэтым выпадку мы былі вымушаны так зрабіць — у першую чаргу дзеля таго, каб захаваць дзіцяці жыццё, забяспечыць для яго неабходныя ўмовы.

Дапамагае «сарафаннае» радыё!

Жыццёвая пазіцыя жыхаркі Васілішак, **старшыні сельскага камітэта, старасты Яніны СЯРГЕЙ** — не заставацца абыякавай да чужога няшчасця, не замыкацца ў асабістых клопатах, не кіравацца прынцыпам «мая хата з краю». Мусіць, таму мясцовыя жыхары і лічаць яе сваім грамадскім лідарам. А Яніна Антонаўна, у сваю чаргу, ганарыцца, што аднавяскоўцы даверылі ёй прадстаўляць іх інтарэсы ў дыялогу з мясцовай уладай:

> **«У Ашмянскім раёне завялі крымінальную справу ў дачыненні да дачкі, якая бязногага бацьку на тыдзень кінула ў халодным доме.**

— Я вельмі люблю свой населены пункт, дзе, як той казаў, нарадзілася і прыгадзілася. І добра разумею, што аднаму сельвыканкаму з даволі абмежаваным штатам супрацоўнікаў нельга наладзіць эфектыўную работу без дапамогі актыўных прадстаўнікоў грамадскасці. Тым больш улічваючы нядаўняе ўзбуйненне тэрыторыі нашага сельсавета. Таму мая «місія» — своечасова выявіць праблему, праінфармаваць аб ёй старшыню сельвыканкама, участковага інспектара міліцыі, а таксама арганізаваць работу па вырашэнні тых пытанняў, якія нам, мясцовым жыхарам, па сілах. Дарэчы, як бы мы ні ставіліся да так званага «сарафаннага радыё», але часам менавіта гэтая крыніца інфармацыі дапамагае папярэдзіць правапарушэнні.

Яніна Сяргей пастаянна ўдзельнічае ў пасяджэннях сельвыканкама, у рабоце аглядной камісіі. Ды і свае настаўніцкія абавязкі, хоць ужо і не на ўроках, але выконваць працягвае:

— На жаль, і сярод маіх вучняў ёсць аматары «зялёнага змея». Бывае, сустрэнешся з імі, пагутарыш, прысароміш — іншы раз, глядзіш, гэта і паўздзейнічае.

Вельмі востра стала апошнім часам, кажа Яніна Антонаўна, праблема ўзаемаадносін паміж бацькамі-пенсіянерамі і іх дарослымі дзецьмі. Пасля няўдалых спроб уладкаваць сваё жыццё гора-нашчадкі вяртаюцца ў бацькоўскі дом, але не для таго, каб дапамагчы старым, а каб, па сутнасці, быць у іх утрыманцамі. Даводзіцца старшыні сельскага камітэта і ў вырашэнні такіх, даволі далікатных, праблем садзейнічаць — і выхаваўчымі гутаркамі, і, зразумела, інфармаваннем аб такіх фактах выканкама.

Хто каго «даглядае»?

Узнятую Янінай Сяргей тэму бацькоў і дарослых дзяцей прадоўжыў **пракурор Гродзенскай вобласці Віктар МАРОЗАЎ:**

— Запрашаем такіх працаздольных людзей у пракуратуру і нагадваем пра закон, які абавязвае клапаціцца пра бацькоў. Калі ж перакананне не дзейнічае, то мы прад'яўляем у суд іскавыя заявы аб спагнанні з такіх дзяцей аліментаў на карысць бацькоў (такую практыку пачалі першымі ў рэспубліцы). Вядома, бацькам маральна цяжка пагадзіцца на гэтыя ўмовы, але, тым не менш, так адбываецца. Больш за тое, прыкладна ў 250 выпадках ужо спынена выплата дапамогі, якую атрымлівалі п'яніцы (як правіла, сыны, а то і дочкі) — быцам бы па доглядзе пажылых людзей. Хто пра каго клапоціцца, калі бачыш 80-гадовую жанчыну каля ложка, дзе ляжыць пластом «апякун»? Дайшло да таго, што ў Ашмянскім раёне мы завялі крымінальную справу ў дачыненні да дачкі, якая бязногага бацьку на тыдзень кінула ў халодным доме. Праўда, справа да суда не дайшла: Бог жанчыну пакараў, яна сама загінула падчас пажару.

Віктар Марозаў паведаміў, што на Гродзеншчыне сёлета расце колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў. Ужо здзейснены 54 забойствы, а за мінулы год іх было 48. Злачынствы, як правіла, якія? Разам выпівалі, пасварыліся і схапіліся за нажы, сякеры. Аднаму ўчастковаму міліцыянеру без дапамогі грамадскасці, безумоўна, з гэтымі працэсамі не справіцца. Але разам з тым пракурор вобласці лічыць неабходным змяніць псіхалогію і ўчастковых інспектараў.

— Трэба нацэльваць іх не на адмову ў распачынанні крымінальных спраў, а на завядзенне крымінальных спраў — каб папярэдзіць забойства, нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Неабходна жорстка рэагаваць на сігналы, што паступаюць ад насельніцтва, аб пагрозах забойства, рукаприкладстве. Няхай мы такіх асоб пакараем за менш цяжкае злачынства, чым яны заўтра пойдуць на забойства, — лічыць Віктар Марозаў. — Сёлета мы «закруцілі гайкі» ў гэтым кірунку, прычым каля 70 крымінальных спраў завялі пракуроры. Яны зрабілі гэта, адмяніўшы пастановы аб адмове ў распачынанні крымінальных спраў, якія былі вынесены ўчастковымі інспектарамі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

УЧАСТКОВАГА ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ У ТВАР

Работу ўчастковых інспектараў Брэстчыны абмеркавалі на пашыранай нарадзе службаў унутраных спраў, якая прайшла ў Кобрыне. Як зрабіць работу ўчастковага найбольш эфектыўнай, разважалі ўдзельнікі дыскусіі. Бо першы, хто стаіць на шляху прафілактыкі бытавых злачынстваў, менавіта ўчастковы інспектар. Адзначалася, што гэтая катэгорыя міліцыянераў цяпер нядрэнна забяспечана транспартам, ім выдзяляецца па меры магчымасці службовае жыллё. На думку намесніка начальніка абласнога УУС Валерыя Вугляніцы, участковага павінны ведаць у твар жыхары гарадскога квартала або вёскі, гэта значыць, што ён мусіць жыць у сваім раёне, на сваім участку.

Падчас абмеркавання пытанняў парадку дня некаторых супрацоўнікаў службы крытыкавалі за недастаткова ўважлівае стаўленне да заяў грамадзян. Ёсць выпадкі, калі ўчастковыя адмаўлялі ў завядзенні крымінальнай справы, а потым іх папраўляла пракуратура.

Не абышлося таксама без узнагарод лепшым супрацоўнікам.

Яна СВЕТАВА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 22.398. Нумар падпісаны ў 19.30 17 снежня 2013 года.

ПРАЎДА. НІЧОГА, АПРОЧ ПРАЎДЫ

Няма неабходнасці нагадваць пра тое, як часта беларуская літаратура звяртаецца да падзей Вялікай Айчыннай вайны, расказваючы пра мужнасць і гераізм савецкага народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, а разам тым раскрываючы і сапраўды звярыны воблік фашызму. Тым не менш, усё ж пра гэта нельга не гаварыць, бо, хоць і напісана пра самую вялікую вайну шмат ды, здавалася б, не засталося ў гісторыі яе ніводнай старонкі, якая не была б прачытана літаратарамі, гаварыць ёсць пра што. Прынамсі, нямала расказана і пра гераізм дзяцей, якія змагаліся з ворагам упоравень з дарослымі. Нямала можна прачытаць і пра зверствы гітлераўцаў у дачыненні да іх, у тым ліку і пра тое, што існавалі спецыяльныя лагеры, у якіх у малых пакутнікаў забіралі кроў, што потым ішла на лячэнне нямецкіх салдат і афіцэраў. Аднак...

Часцей згадваецца лагер у Парычах, а таксама на тэрыторыі вучэбнай гаспадаркі «Чырвоны Бераг», а гэта ўсё Гомельшчына, адпаведна, сённяшнія Светлагорскі і Жлобінскі раёны. Але ж былі і іншыя дзіцячыя донарскія лагеры, у прыватнасці, у вёсцы Сёмкава, што пад Мінскам, пра якія звестак захавалася не так і шмат. Тым больш ухвальна, што нарэшце заслона тайны ліквідавана. З гэтым, па сутнасці дзіцячым канцлагерам і звязаны асноўныя падзеі, што адбываюцца ў новым рамане Мікалая Чаргінца «Аперацыя «Кроў», выпушчаным выдавецтвам «Мастацкая літаратура». Але, безумоўна, гэта не значыць, што пісьменнік тым самым звужае дзеянне твора, прывязваючы яго толькі да таго, што адбывалася ў Сёмкаве і яго наваколіцах. Паколькі раманная прастора заўсёды шырокая, то і ахоп падзей вельмі шырокі, як і геаграфія дзеяння. Гэта і само Сёмкава, і акупаваны Мінск, ды нават Берлін. Гэта і дазволіла Мікалаю Чаргінцу аб'ёмна і шырока спасцігнуць тое, што звязана з падзеямі, які знайшлі адлюстраванне ў рамане.

Фота БЕЛТА.

Узнаўляючы гэтыя падзеі, аўтар рамана адштурхоўваецца ад лёсу трох сем'яў: Левіных, Рабіновічаў і Статкевічаў. Дзве яўрэйскія, адна — беларуская. Урэшце, гэта толькі па пашпарце. А так тры звычайныя мінскія сям'і. У многім падобныя між сабой, але ў чымсьці, зразумела, і розныя, са сваімі характарамі і лёсамі. Праўда, калі быць дакладным, дык у чымсьці розныя іх лёсы былі да вайны. У час жа акупацыі гэтыя сем'і, як і сотні іншых, сталі вельмі падобнымі між сабой, бо над усімі адналькава навісла бяда. Хоць лёсы Левіных, Рабіновічаў асабліва незайздросныя. Як і іншых яўрэяў. Тым самым у рамане з'яўляецца яшчэ адна тэма — вайна і яўрэі. Важна і тое, што ў рамане пераканаўча паказаны сапраўдны твар «чалавекалюбца» Кубэ, які прапанаваў сваё вырашэнне яўрэйскага пытання — з дапамогай саміх жа яўрэяў.

Ва ўсю стараецца нейкі «Абрам Липкович с улицы Беломорской». Сапраўды ўжо: сям'я не без выродка. Гэты Ліпковіч хутка зарыентаваўся і стаў фашысцкім паслугачом, не задумваючыся, знішчае сваіх супляменнікаў. У яго свая жыццёвая пазіцыя, якую ён не ўтойвае, дзеліцца сваёй «філасофіяй» нават з Левіным, з якім знаёмы яшчэ з даваенных гадоў.

Не спыніла Ліпковіча нават тое, што была знішчана яго сям'я.

Праўда, нічога, апроч праўды, — гэтым правілам кіраваўся Мікалай Чаргінец, пішучы свой раман, таму ў творы нямала эпізодаў, ад якіх становіцца не па сабе. Шмат якія з іх звязаны, безумоўна, з тым, што адбывалася ў Сёмкаве, калі з дзяцей цалкам выпампоўвалі кроў і яны тут жа паміралі. Прыгожыя дзяўчаткі, якім было гадоў дванаццаць, а то і меней, нярэдка паміралі па іншай прычыне: іх гвалтавалі. Такая «ўцеха» асабліва падабалася дырэктару інтэрната (так афіцыйна ён называўся яшчэ з даваеннага часу) Вайтовічу.

Не адыходзіць аўтар ад праўды і тады, калі імкнецца разабрацца, чаму некаторыя ішлі на службу ў паліцыю. Несумненна, тут аднабакавага падыходу быць не можа. Разумеючы гэта, пісьменнік стварыў цікавы вобраз аднаго з такіх паслугачоў — Леаніда Цвяткова. Леанід своечасова спыніўся. Адбылося гэта дзякуючы яго даваеннай знаёмай. Ягоны роздум — гэта роздум таго, хто аднойчы спатыкнуўся, але знайшоў у сабе сілы адумацца.

Апошнюю кропку ў лёсе Цвяткова аўтар, праўда, не ставіць. Адступаючы, фашысты вырашылі яго завербаваць і забраць з сабой. Тыя з партызанаў, з кім ён ужо супрацоўнічае, падтрымалі такое рашэнне...

Назва рамана — «Аперацыя «Кроў» — з'явілася невыпадкова. Яна блізкая да закадзіраванай аперацыі па вызваленні дзяцей, якія ўтрымліваліся ў Сёмкаве — «Аперацыя «Інтэрнат». Прадумана яна была вельмі старанна, і да яе падключылі не толькі партызанаў, а нават Цэнтральны штаб партызанскага руху ў Маскве. Несумненная ўдача пісьменніка — вобразы тых, хто асабліва шмат спрыяў таму, каб усё прайшло паспяхова. Гэта і перакладчыца Ірэна Караблёва, якая, наладзіўшы сувязь з партызанамі, перадавала ім сакрэтную інфармацыю. Асаблівая роля адведзена савецкай разведчыцы, якая выступае пад імем Ганны Фішэр, законнай спадчынніцы маёнтка ў Сёмкаве.

Новае слова аб Вялікай Айчыннай вайне абпальвае сэрца сваёй бескампраміснай праўдай, але без яе не абысціся. Тым больш цяпер, калі краіна рыхтуецца да 70-годдзя Вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а ў 2015 годзе гэтаксама ўрачыста мы будзем святкаваць 70-годдзе Вялікай Перамогі. У сувязі з гэтым лозунг «Ніхто не забыты, нішто не забыта» набывае асабліва актуальнае значэнне. Раман «Аперацыя «Кроў» пры ўсёй сваёй высокай мастацкай вартасці валодае і не менш важнай якасцю: гэта — кніга-ўчынак пісьменніка, які сам добра ведае, што такое мужнасць і гераізм, і не церпіць бесчалавечнасці, подласці, ніколі не даруе здрады.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

Попыт спарадзіў прапанову

У Беларусі з'явіцца профільная ВНУ для «айцішнікаў»?

Намер стварыць пры Парку высокіх тэхналогій (ПВТ) універсітэт, які стане адной з вядучых установаў адукацыі ў галіне інфармацыйных тэхналогій у Еўропе, агучыла адміністрацыя Парка. За 7 гадоў свайго існавання ПВТ стаў вядомым брэндам у вобласці інфармацыйных тэхналогій не толькі ў краінах СНД і Еўропы, але і ў свеце.

У склад заснавальнікаў універсітэта, акрамя адміністрацыі ПВТ, увойдуць вядучыя рэзідэнты Парка высокіх тэхналогій і буйныя сусветныя кампаніі — гэта дазволіць распрацоўваць праграмы, накіраваныя на фарміраванне неабходных для ІТ-галіны навыкаў і кампетэнцый. Зараз вядзецца пошук участка (непадалёку ад Парка высокіх тэхналогій), дзе будзе размяшчацца ўніверсітэт. Яго пабудуюць у выглядзе кампуса (гэта значыць, што вучэбныя корпусы, навукова-даследчыя лабараторыі, бібліятэкі, кафэ, апартаменты для замежных навукова-педагагічных кадраў і інтэрнаты для студэнтаў тэрытарыяльна будуць размешчаны блізка адзін ад аднаго).

На нядаўнім форуме «БанкІТ» адбыўся «круглы стол», прысвечаны пытанням падрыхтоўкі ІТ-спецыялістаў. Прагназуючы патрэбу ў новых ІТ-спецыялістах, намеснік дырэктара адміністрацыі Парка Аляксандр Марцінкевіч адзначыў, што на рынку інфармацыйных тэхналогій назіраецца ўсплеск попыту на спецыялістаў, якія працуюць з вялікімі аб'ёмамі даных. Штогод ён прырастае на 30-40%. Бум запатрабаванасці ІТ-спецыялістаў, здольных працаваць з вялікімі аб'ёмамі, пачнецца праз некалькі гадоў, таму сёння самы час распачаць іх падрыхтоўку. Тэарэтычна вырашэннем гэтай задачы мог бы заняцца факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Больш складана абстаяць справы з падрыхтоўкай спецыялістаў у галіне 2D- і 3D-графікі.

— Кампаніям патрэбны людзі, якія змогуць ствараць дызайн карыстальніцкай праграмы ці камп'ютарнай гульні з тэхналагічнага пункту погляду. На жаль, у нас, у адрозненне ад Італіі ці Швецыі, няма школы дызайну, затое ў нас ёсць класныя матэматыкі і інжынеры-праграмісты, — патлумачыў Аляксандр Марцінкевіч. — Зараз вядзецца пошук замежных спецыялістаў у галіне камп'ютарнага дызайну і графікі, якія маглі б выкладаць у Беларусі.

Трэба мець на ўвазе, што патрабаванні да ведаў і кампетэнцый ІТ-спецыяістаў пастаянна змяняюцца. Ужо сёння, каб быць запатрабаваным на рынку працы, недастаткова тых тэарэтычных ведаў, якія студэнты атрымліваюць у ВНУ. У сваю чаргу, вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны не могуць самастойна спрагназаваць, у якім напрамку будзе развівацца ІТ-сфера ў Беларусі і якія веды спатрэбяцца маладым спецыялістам праз 5-10 гадоў. Таму шукаць выйсце з сітуацыі трэба пры ўзаемадзеянні зацікаўленых бакоў.

Парк высокіх тэхналогій на працягу апошніх трох-чатырох гадоў прыклаў шмат намаганняў для вырашэння праблемы недахопу кадраў. Ва ўсіх вядучых ВНУ краіны кампаніямі-рэзідэнтамі ПВТ створана больш як 60 сумесных навукова-вытворчых лабараторый, каля 15 філіялаў кафедраў працуюць на вытворчых пляцоўках ІТ-кампаній. Кампаніямі-рэзідэнтамі ПВТ падпісана з ВНУ больш як 50 дагавораў аб узаемадзеянні.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ ПРАВАВЫМ РЭГУЛЯВАННІ ПАРАДКУ ВЫРАШЭННЯ СПРЭЧАК, ЗВЯЗАНЫХ З РАССЛЕДАВАННЕМ НЯШЧАСНЫХ ВЫПАДКАЎ НА ВЫТВОРЧАСЦІ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

на падставе часткі восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў

у парадку рэалізацыі права на ўнясенне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй прапаноў аб неабходнасці ўнясення ў акты заканадаўства змяненняў і (або) дапаўненняў

з удзелам прадстаўнікоў:

Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь — Забары А.А., намесніка Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь — Стука А.К., намесніка Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь — Старавойтава І.Р., намесніка Міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь — Шпак А.С., начальніка галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь;

Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — Шаўковіча У.І., начальніка галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі,

разгледзеў у судовым пасяджэнні пытанне аб наяўнасці прававой недакладнасці ў рэгуляванні парадку вырашэння спрэчак, звязаных з расследаваннем няшчасных выпадкаў на вытворчасці.

Прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Канстытуцыя), Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ПК), Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ГПК), Правіл расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 студзеня 2004 г. № 30 (далей — Правілы), і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, выкладзеныя ў пісьмовым выглядзе меркаванні зацікаўленых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, Канстытуцыйны Суд устанавіў наступнае.

1. Вывучэнне пазіцый дзяржаўных органаў і іншых арганізацый сведчыць аб розных падыходах да разумення палажэнняў заканадаўства, якое рэгулюе парадак вырашэння спрэчак, звязаных з расследаваннем няшчасных выпадкаў на вытворчасці.

Так, Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь адзначае, што часткай другой артыкула 241 ПК вызначаны катэгорыі працоўных спрэчак, якія разглядаюцца непасрэдна ў судзе, без звароту ў камісію па працоўных спрэчках, у ліку якіх спрэчкі па заявах работнікаў аб адмове наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або пры нязгодзе з яго зместам. Разам з гэтым з'яўляецца апраўданым устанаўленыя Правіламі папярэдні пазасудовы парадак разгляду скаргі на заключэнне дзяржаўнага інспектара працы, паколькі кантроль за стварэннем наймальнікам здаровых і бяспечных умоў працы, прыняццем мер да зніжэння прафесійнай рызыкі і ўзроўню вытворчага траўматызму ўскладзены на органы працы і сацыяльнай абароны. У сувязі з выкладзеным, па меркаванні Вярхоўнага Суда, прававой недакладнасці ў рэгуляванні парадку вырашэння спрэчак, звязаных з расследаваннем няшчасных выпадкаў на вытворчасці, не маецца.

Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь указвае, што зацікаўленыя асобы пры нязгодзе з адмовай наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або нязгодзе з яго зместам маюць права звяртацца за вырашэннем спрэчкі, якая ўзнікла, непасрэдна ў суд (пункт 6 часткі другой артыкула 241 ПК) або да дзяржаўнага інспектара працы (пункт 78 Правіл). Разам з тым заключэнне дзяржаўнага інспектара працы аб няшчасным выпадку на вытворчасці падлягае абскарджанню ў парадку падпрадкаванасці адпаведным службовым асобам дзяржаўнай інспекцыі працы, пасля чаго — у судзе. Неабходнасці ўнясення змяненняў у Правілы Генеральная пракуратура не бачыць.

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь лічыць, што ўстаноўлены заканадаўствам парадак вырашэння рознагалоссяў (спрэчак) па заявах работнікаў аб адмове наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або нязгодзе з яго зместам не прадугледжвае абавязковага папярэдняга пазасудовага вырашэння справы. Пунктам 78 Правіл вызначана права (а не абавязак) работніка на пазасудовае ўрэгуляванне спрэчкі аб адмове наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або нязгодзе з яго зместам, а пунктам 6 часткі другой артыкула 241 ПК — права на яго судовы разгляд, у сувязі з чым Міністэрства юстыцыі неабходнасці карэкціроўкі Правіл не бачыць.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь мяркуе, што недакладнасці ў прававым рэгуляванні парадку вырашэння спрэчак, звязаных з расследаваннем няшчасных выпадкаў на вытворчасці, не маецца. Пунктамі 78 і 79 Правіл вызначана права бакоў пры рознагалоссі ў пытаннях расследавання, афармлення і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці звярнуцца для іх разгляду на працягу трох гадоў з даты здарэння да дзяржаўнага інспектара працы, якая можа запатрабаваць ад наймальніка, страхавальніка ліквідацыі дапушчаных парушэнняў або пры неабходнасці правесці расследаванне няшчаснага выпадку і скласці заключэнне. Пры гэтым за работнікам захоўваецца прадугледжанае артыкулам 241 ПК права ў выпадку адмовы наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або пры нязгодзе з яго зместам звярнуцца з заявай у суд без папярэдняга пазасудовага вырашэння спрэчкі. Папярэдні ж пазасудовы парадак прадугледжаны ў Правілах у якасці абавязковай умовы толькі ў дачыненні да абскарджання заключэння дзяржаўнага інспектара працы аб няшчасным выпадку на вытворчасці і разгляду рознагалоссяў па пытаннях, звязаных з устанаўленнем і расследаваннем прафесійных захворванняў.

Па меркаванні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, устанаўленне ў нарматыўным прававым акце Урада Рэспублікі Беларусь норм аб магчымасці абскарджання зацікаўленымі асобамі ў суд адмовы наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку, а таксама звароту ў суд у выпадку нязгоды са звесткамі, што змяшчаюцца ў ім, з выкананнем папярэдняга пазасудовага парадку разгляду скаргі службовымі асобамі знаходзіцца ў супярэчнасці з артыкулам 241 ПК, які прадугледжвае разгляд такіх катэгорый спраў непасрэдна ў судзе, і часткай другой артыкула 229 ПК, якая дэлегуе Ураду права ўстанаўліваць толькі парадак расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў. Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі лічыць, што, вызначыўшы парадак вырашэння спрэчак, звязаных з расследаваннем няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, Урад тым самым выйшаў за рамкі сваёй кампетэнцыі.

Пазіцыя кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта заключаецца ў тым, што ўстаноўлены Урадам Рэспублікі Беларусь парадак вырашэння рознагалоссяў па пытаннях расследавання, афармлення і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці, які не прадугледжвае магчымасці непасрэднага звароту ў суд па заявах работнікаў аб адмове наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або нязгодзе з яго зместам, не адпавядае пункту 6 часткі другой артыкула 241 ПК, а ў выпадку, калі дзяржаўным інспектарам працы заключэнне не складаецца, у парушэнне артыкула 60 Канстытуцыі пазбаўляе работнікаў права на судовую абарону. Прызначаныя палажэнні Правіл вызначаюць пытанні судаводства, прававое рэгуляванне якіх адносіцца да кампетэнцыі заканадаўчых органаў.

2. Згодна з Канстытуцыяй Рэспубліка Беларусь — сацыяльная прававая дзяржава; чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадзянства і дзяржавы; дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы; дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры дзеля стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй (частка першая артыкула 1, частка першая артыкула 2, частка трэцяя артыкула 21, частка першая артыкула 59).

У Канстытуцыі вызначана, што грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы (частка першая артыкула 41), а таксама права на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці, страты карміцеля і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам (артыкул 47).

На забеспячэнне ўказаных канстытуцыйных палажэнняў накіраваны нормы ТК. Так, у адпаведнасці з пунктам 7 артыкула 11 ПК права на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, пенсійнае забеспячэнне і гарантыі ў выпадку прафесійнага захворвання, працоўнага калецтва, інваліднасці і страты работы датычыцца асноўных правоў работнікаў. Прыведзенай норме карэспандуюць палажэнні іншых артыкулаў ПК, якія абавязваюць наймальніка пры арганізацыі працы работнікаў прымаць неабходныя меры па прафілактыцы вытворчага траўматызму, прафесійных і іншых захворванняў работнікаў, пастаянна кантраляваць веданне і выкананне работнікамі патрабаванняў інструкцый па ахове працы і пажарнай бяспецы, своечасова і правільна праводзіць расследаванне і ўлік няшчасных выпадкаў на вытворчасці (пункт 6 часткі першай артыкула 55); ажыццяўляць абавязковае страхаванне работніка ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў у адпаведнасці з заканадаўствам (артыкул 224); забяспечваць ахову працы работнікаў, у тым ліку расследаванне і ўлік няшчасных выпадкаў на вытворчасці, прафесійных захворванняў, аварый, распрацоўку і рэалізацыю мер па іх прафілактыцы (пункт 12 артыкула 226).

На рэгуляванне грамадскіх адносін у галіне аховы працы і рэалізацыю канстытуцыйнага права грамадзян на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы накіраваны палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Об охране труда», якія прадугледжваюць абавязкі работадаўца па забеспячэнні аховы працы, у ліку якіх забеспячэнне ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці, прафесійных захворванняў, аварый, распрацоўкі і рэалізацыі мер па іх прафілактыцы (абзац сёмы часткі першай артыкула 13), а таксама ажыццяўленне дзяржаўнага нагляду і кантролю за выкананнем заканадаўства аб ахове працы (артыкул 34).

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 530 «О страховой деятельности» зацверджана Палажэнне аб страхавой дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь (далей — Палажэнне аб страхавой дзейнасці), у главе 14 якога рэгламентаваны парадак і ўмовы правядзення абавязковага страхавання ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што аднясенне заканадаўцам (артыкул 229 ПК, артыкул 25 Закона «Об охране труда», пункт 257 Палажэння аб страхавой дзейнасці) да кампетэнцыі Урада Рэспублікі Беларусь устанаўлення парадку расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў базіруецца на канстытуцыйных палажэннях аб ажыццяўленні дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь на аснове раздзялення яе на заканадаўчую, выканаўчую і судовую; аб ажыццяўленні выканаўчай улады Урадам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку забеспячэнні ім выканання Канстытуцыі, законаў і дэкрэтаў, указаў і распараджэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (артыкулы 6, 106 і 107 Канстытуцыі). У сувязі з гэтым Урад абавязаны ажыццяўляць прававое рэгуляванне ў адпаведнасці з нормамі Канстытуцыі і заканадаўчых актаў, не выходзячы за межы паўнамоцтваў, дэлегаваных яму заканадаўцам.

3. Згодна з Канстытуцыяй кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны (частка першая артыкула 60); судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належыць судам (частка першая артыкула 109).

У адпаведнасці з артыкулам 8 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека кожны чалавек мае права на эфектыўнае аднаўленне ў правах кампетэнтнымі нацыянальнымі судамі ў выпадках парушэння яго асноўных правоў, нададзеных яму канстытуцыяй або законам.

Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах замацаваны абавязак кожнай дзяржавы, што ўдзельнічае ў дадзеным Пакце, забяспечыць любой асобе, правы і свабоды якой парушаны, эфектыўны сродак прававой абароны, нават калі гэта парушэнне было здзейснена асобамі, якія дзейнічалі ў афіцыйнай якасці, а таксама развіваць магчымасці судовай абароны (падпункты «а» і «b» пункта 3 артыкула 2).

Часткай трэцяй артыкула 2 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў вызначана, што судовая ўлада ажыццяўляецца пры дапамозе канстытуцыйнага, грамадзянскага, крымінальнага, гаспадарчага і адміністрацыйнага судаводства.

Судаводства па грамадзянскіх справах рэгулюецца Канстытуцыяй, ГПК і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Грамадзянскае працэсуальнае заканадаўства рэгулюе парадак разгляду і вырашэння судом грамадзянскіх, сямейных, працоўных, іншых іскавых спраў, спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін, спраў асобай вытворчасці, спраў загаднага справаводства, а таксама іншых спраў і парадак выканаўчага справаводства (артыкулы 2 і 3 ГПК).

У адпаведнасці з часткай пятай артыкула 6 ГПК зацікаўленая асоба абавязана выканаць парадак папярэдняга пазасудовага вырашэння справы ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, аналіз норм ГПК у іх узаемасувязі з вышэйуказанымі палажэннямі Канстытуцыі, міжнародных прававых актаў і Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, якія замацоўваюць прававую аснову забеспячэння канстытуцыйнага права на судовую абарону, сведчыць аб тым, што ўстанаўленне абавязковасці выканання парадку папярэдняга пазасудовага вырашэння справы як умовы рэалізацыі канстытуцыйнага права на зварот за судовай абаронай магчыма толькі на ўзроўні заканадаўчых актаў. У сувязі з гэтым падзаконнымі прававымі актамі не могуць прадугледжвацца дадатковыя ў параўнанні з заканадаўчымі актамі ўмовы для рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на зварот у суд за абаронай сваіх правоў і законных інтарэсаў.

4. Непасрэдна ў судзе, без разгляду ў камісіях па працоўных спрэчках, разглядаюцца працоўныя спрэчкі па заявах работнікаў аб адмове наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або нязгодзе з яго зместам (пункт 6 часткі другой артыкула 241 ПК).

Неабходнасць выканання папярэдняга пазасудовага вырашэння справы была ўстаноўлена часткай трэцяй артыкула 229 ПК (у рэдакцыі ад 26 ліпеня 1999 года), якая прадугледжвала, што пры адмове наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або пры нязгодзе пацярпелага з выкладзенымі ў акце абставінамі няшчаснага выпадку пацярпелы мае права звярнуцца ў спецыяльна ўпаўнаважаны дзяржаўны орган нагляду і кантролю, пасля чаго — у суд.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2007 года «О внесении изменений и дополнений в Трудовой кодекс Республики Беларусь» артыкул 229 ПК выкладзены ў новай рэдакцыі, згодна з якой расследаванню і ўліку падлягаюць няшчасныя выпадкі на вытворчасці, якія адбыліся з работнікамі і іншымі асобамі, і прафесійныя захворванні (частка першая); парадак расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь (частка другая). Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь было даручана на працягу шасці месяцаў з дня афіцыйнага апублікавання ўказанага Закона забяспечыць прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з дадзеным Законам.

Такім чынам, унесенымі ў ПК змяненнямі выключаны абавязак работніка выканаць да звароту ў суд папярэдні пазасудовы парадак вырашэння спрэчкі пры адмове наймальніка ў складанні акта аб няшчасным выпадку або пры нязгодзе з яго зместам.

У пункце 243 Палажэння аб страхавой дзейнасці ўстаноўлена, што абавязковаму страхаванню ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў падлягае жыццё або здароўе грамадзян, якія выконваюць работу на падставе працоўнага дагавора (кантракта), а таксама іншых катэгорый працуючых грамадзян, указаных у дадзеным пункце.

Нормы пункта 295 Палажэння аб страхавой дзейнасці, што замацоўваюць права застрахаванай асобы або асобы, якая мае права на атрыманне страхавых выплат, удзельнічаць у расследаванні няшчаснага выпадку на вытворчасці або прафесійнага захворвання, абскардзіць рашэнне па пытаннях расследавання няшчаснага выпадку на вытворчасці і прафесійнага захворвання, абараняць свае правы і законныя інтарэсы, у тым ліку ў судзе, таксама не ўстанаўліваюць абавязку выканання ўказанымі асобамі папярэдняга пазасудовага парадку вырашэння спрэчкі.

Разам з замацаваннем у вышэйуказаных заканадаўчых актах судовага парадку вырашэння спрэчак, звязаных з расследаваннем няшчасных выпадкаў на вытворчасці, у Правілах, якія з'яўляюцца падзаконным актам, вызначана, што рознагалоссі па пытаннях расследавання, афармлення і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці (непрызнанне наймальнікам, страхавальнікам факта няшчаснага выпадку, адмова ў правядзенні яго расследавання і складанні акта ўстаноўленай формы, нязгода пацярпелага або асобы, якая прадстаўляе яго інтарэсы, асобы, якая дапусціла парушэнні актаў заканадаўства аб працы і аб ахове працы, тэхнічных нарматыўных прававых актаў, лакальных нарматыўных прававых актаў, што прывялі да няшчаснага выпадку, страхаўшчыка са зместам указанага акта, за выключэннем памеру ступені віны пацярпелага ў працэнтах, і іншае) на працягу трох гадоў з даты здарэння няшчаснага выпадку на вытворчасці разглядаюцца па іх звароце дзяржаўным інспектарам працы (пункт 78). Пры выяўленні факта ўтойвання няшчаснага выпадку ад расследавання і ўліку і іншых парушэнняў дадзеных Правіл Дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы патрабуе ад наймальніка, страхавальніка правядзення расследавання няшчаснага выпадку ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, а таксама ліквідацыі іншых парушэнняў; пры неабходнасці дзяржаўны інспектар працы праводзіць расследаванне няшчаснага выпадку на вытворчасці і па выніках расследавання складае заключэнне (пункт 79 Правіл).

Правіламі прадугледжана, што заключэнне дзяржаўнага інспектара працы аб няшчасным выпадку на вытворчасці можа быць абскарджана арганізацыяй, наймальнікам, страхавальнікам, пацярпелым або асобай, якая прадстаўляе яго інтарэсы, страхаўшчыкам, асобамі, якія дапусцілі парушэнні актаў заканадаўства аб працы і аб ахове працы, тэхнічных нарматыўных прававых актаў, лакальных нарматыўных прававых актаў, што прывялі да няшчаснага выпадку, у парадку падпарадкаванасці ў начальніка міжраённага аддзела, галоўнага дзяржаўнага інспектара працы вобласці або горада Мінска, Рэспублікі Беларусь (асоб, якія выконваюць іх абавязкі), пасля чаго — у судзе (пункт 80). У адпаведнасці з пунктам 84 Правіл у спрэчных выпадках, звязаных з устанаўленнем прафесійных захворванняў, рашэнне прымаецца Рэспубліканскім цэнтрам прафесійнай паталогіі і алергалогіі, пасля чаго — судом; рознагалоссі па пытаннях, звязаных з расследаваннем і ўлікам прафесійных захворванняў, разглядаюцца Міністэрствам аховы здароўя, прафесійных захворванняў са смяротным зыходам і групавых прафесійных захворванняў — Міністэрствам аховы здароўя сумесна з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, пасля чаго — судом.

Канстытуцыйны Суд мяркуе, што Урад Рэспублікі Беларусь, рэалізуючы дэлегаванае яму заканадаўчымі актамі паўнамоцтва ўстанаўліваць парадак расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, не меў права разам з гэтым ажыццяўляць прававое рэгуляванне пытанняў судаводства, уключаючы ўстанаўленне ўмоў рэалізацыі канстытуцыйнага права на зварот за судовай абаронай.

Акрамя таго, Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на тое, што ў адпаведнасці з Правіламі права пацярпелага і іншых зацікаўленых асоб на судовую абарону знаходзіцца ў залежнасці ад правядзення дзяржаўным інспектарам працы расследавання няшчаснага выпадку на вытворчасці і складання па яго выніках заключэння. Права на зварот у суд у выпадках, калі дзяржаўным інспектарам працы заключэнне не складаецца, Правіламі не прадугледжана, у сувязі з чым у адносінах да ўказаных асоб не забяспечваецца канстытуцыйнае права на судовую абарону.

5. У Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршэнства права; дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства (часткі першая і другая артыкула 7 Канстытуцыі).

У рашэннях Канстытуцыйнага Суда неаднаразова адзначалася, што рэалізацыя ў нарматворчасці прынцыпу вяршэнства права і заснаванага на ім прынцыпу прававой дакладнасці прадугледжвае стварэнне прававой сістэмы, у якой нарматыўныя прававыя акты знаходзяцца ва ўзаемасувязі, адпавядаюць адзін аднаму, а таксама забяспечваюцца яснасць, дакладнасць, несупярэчлівасць і ўзгодненасць прававых норм.

Прынцып вяршэнства права азначае ў тым ліку паўнату і дакладнасць норм аб правах і абавязках грамадзян, узгодненасць іх паміж сабой у розных нарматыўных прававых актах. Наяўнасць у заканадаўстве прабелаў, калізій прававых норм і прававой недакладнасці цягне неадназначнае разуменне нарматыўных прававых актаў і звязаную з гэтым супярэчлівую прававпрымяняльную практыку, што аслабляе гарантыі абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што рэгламентацыя ў падзаконным акце пытанняў, якія павінны рэгулявацца на ўзроўні закона, прывяло да неадназначнага разумення і рознага прымянення на практыцы прававых норм, якія вызначаюць парадак вырашэння спрэчак, звязаных з расследаваннем няшчасных выпадкаў на вытворчасці.

Так, Пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у абзацы другім пункта 8 пастановы ад

«ДАСЯГНІ СВАЁЙ МЭТЫ І ЗРАБІ ПЛАНКУ ВЫШЭЙ»

Гэтым прынцыпам у сваёй рабоце карыстаецца завуч магілёўскай школы № 34 Галіна Бяляева

Ёсць людзі, якія кідаюць выклік цяжкасцям, пераадольваюць іх і ідуць далей. Галіна Бяляева якраз з такіх. Гісторык па адукацыі, аптымістка па жыцці, яна сваёй энергіяй зараджае і тых, хто побач. Пакуль адны ставяць пытанні, яна шукае на іх адказы. Не таму, што ёй болей за ўсіх трэба. А таму, што ведае: калі не яна, гэтага, магчыма, не зробіць ніхто. А яшчэ яна ўпартая ў сваіх мэтах. Гэта, напэўна, і дапамагло ёй, тады яшчэ 25-гадовай настаўніцы, якая толькі выйшла з «дэкрэта», рызыкнуць прыняць удзел у галоўным прафесійным настаўніцкім конкурсе «Хрустальны журавель» і стаць першай у горадзе і трэцяй у вобласці.

Галіна Бяляева разам са сваімі «даследчыкамі» Дзіянай Марозавай і Максімам Бяляевым.

Нездарма пасля ўдзелу ў рэспубліканскім этапе гэтага конкурсу ёй даверылі пасаду завуча, бо не сумнявалі ся — справіцца. Яе дэвіз: «Дасягні мэты і зрабі планку вышэй». «Мая бабуля казала: калі ты нават і не дасягнеш яе, будзеш ведаць, што зрабіла ўсё магчымае і не пражыла жыццё дарэмна», — усміхаецца яна. Напэўна, таму і вынікі яе працы ўражваюць. Некалькі школьных даследчых работ, дзе яна з'яўляецца кіраўніком, сёння лічацца ўзорнымі і рэкамендаваны для ўкаранення ў навучальны працэс школ, ліцэяў і гімназій. А яе аўтарская праграма стала падставай для адкрыцця на базе 34-й школы рэспубліканскай інавацыйнай пляцоўкі па выхаванні навучэнцаў з дапамогай сродкаў музейнай педагогікі.

ВІРТУАЛЬНЫ МУЗЕЙ І ВАЙНА

— Што сёння можа захапіць вучня больш, чым камп'ютар? — задае рытарычнае пытанне Галіна Бяляева. — Мы прапанавалі навучэнцам школы дапамагчы перавесці ў электронную базу матэрыялы нашага музея баявой славы 290-й стралковай дывізіі, якая вызваляла Магілёў. Яны так захапіліся гэтай справай, што непрыкметна для сябе сталі цікавіцца гісторыяй абароны і вызвалення горада. Калі гэтая інфармацыя з'явілася на школьным сайце, да нас пачалі прыходзіць лісты з усіх краін свету. Адгукаліся нашчадкі тых байцоў, якім альбо нічога не было вядома пра іх бацькоў і дзядоў, альбо проста захацелася падзякаваць за тую справу, што мы зрабілі.

З 2010-га па 2012 год сайт наведала амаль 27 тысяч карыстальнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Латвіі, Узбекістана, Германіі, Нідэрландаў, ЗША і Панамы. Дзякуючы інтэрнэт-перапісцы з сем'ямі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны архівы школьнага музея сталі папаўняцца біяграфіямі і фотаздымкамі байцоў 290-й стралковай дывізіі. Аднойчы атрымалі ліст ад унучкі ўраджэнца Магілёўшчыны двойчы Героя Савецкага Саюза Сцяпана Шутава. Было вядома, дзе ён нарадзіўся і якімі подзвігамі праславіўся, але ніхто не ведаў, як склаўся яго лёс пасля вайны. Як высветлілася, сын героя таксама стаў танкістам, выкладаў у Кіеўскім вышэйшым танкавым інжынерным вучылішчы. Унук прадоўжыў дынастыю, сёння ён генерал-маёр ВС Украіны. А ўнучка — вядомы ў Кіеве архітэктар.

«ЭЛЕКТРОННАЯ» ГІСТОРЫЯ

Дарэчы, сваю першую электронную праграму Галіна Бяляева зрабіла, калі знаходзілася ў дэкрэтным водпуску, разам з такой жа няўрымслівай мамай. Прысвечана яна абароне Магілёва і аб'ядноўвае ў адну сістэму ўсю тую інфармацыю, якая ўжо была. Як кажа сама Галіна, захацелася стварыць зручны дапаможнік для навучэнцаў. Спатрэбілася 8 месяцаў, каб атрымаўся паўнавартасны фільм, дзе ў храналагічным парадку, па днях паказана, як вялося наступленне на Магілёў. З першых дзён вайны і да таго самага 26 ліпеня, калі абарона горада была зламаная. 7 ліпеня. Гараць Княжыцы, Рэчкі — гэта зусім блізка ад Магілёва… 15 ліпеня. Кальцо вакол Магілёва замкнулася. З гэтага дня па 26 ліпеня ўключна яно звужаецца — спачатку да граніц горада, потым да яго вуліц, канкрэтных дамоў… Вядома, што абарона Магілёва працягвалася 23 дні, але, калі адлічваць час па зробленай спецыяльнай «стужцы часу», з'яўляецца яшчэ адзін — дваццаць чацвёрты. У тых жахлівых умовах, калі кожная гадзіна мела вялікую цану, пратрымацца дзень было сапраўдным подзвігам. Галіна Бяляева лічыць, што гісторыкам ёсць сэнс пераглядзець гэты факт і зрабіць адпаведныя высновы. Дарэчы, гэты дыск зачапіў нават Прэзідэнта Беларусі. Аўтар прадстаўляла праект на сустрэчы з кіраўніком краіны, калі ён у сёлетнім кастрычніку прыязджаў на 100-гадовы юбілей сваёй альма-матар — Магілёўскага ўніверсітэта імя А. Куляшова. Ён нават папрасіў для сябе копію гэтага дыска.

Другой справай, на якую замахнулася Галіна Бяляева, было стварэнне электроннай энцыклапедыі Магілёва: тут змешчана ўся каштоўная інфармацыя — ад заснавання горада да сучаснага перыяду. На электронным носьбіце сабраны звесткі па гісторыі, культуры, архітэктуры, грамадскім жыцці Магілёва. А рубрыка «лінія часу» паказвае магілёўскую гісторыю ў разрэзе сусветнай. Тут сабрана шмат ілюстрацый і дакументальнага матэрыялу, каля тысячы біяграфій людзей, звязаных з гісторыяй Магілёва, апісваецца 417 помнікаў культуры і архітэктуры. Для праверкі ведаў па гісторыі горада ў канцы кожнага раздзела ёсць тэставыя заданні… Бяляевай спатрэбілася 4 гады, каб рэалізаваць гэты праект. Распрацоўваць праграмнае забеспячэнне ёй дапамагалі спецыялісты магілёўскага прадпрыемства «Цэнтр гарадскіх інфармацыйных сістэм». Праект быў прызнаны адным з лепшых на ўзроўні вобласці і рэкамендаваны для ўкаранення ў навучальны працэс школ, ліцэяў і гімназій.

КАРОТКІ ШЛЯХ — НЕБЯСПЕЧНЫ

Гэта работа і наогул размешчана на сайце Мінадукацыі як узорная. У аснову праекта, які Галіне Бяляевай дапамагла зрабіць у электронным выглядзе праграміст Ірына Галафаст, лягла даследчая работа вучаніцы 3 класа Ульяны Глазковай. Дзяўчынка паспрабавала высветліць… ці заўсёды самы кароткі шлях бяспечны. Разам з навуковым кіраўніком яна праводзіла даследаванні на час, кіламетраж і небяспеку. У выніку атрымалася, што самы кароткі шлях ад дома да школы — самы небяспечны! Галіна Бяляева пашырыла рамкі праекта і распрацавала карыснае кіраўніцтва па бяспецы для ўсіх навучэнцаў школы (Вядома, што ў горадзе, дзе шмат транспарту і нерэгуляваных пешаходных пераходаў, праблема дзіцячага траўматызму заўсёды актуальная).

— Мы апісалі ўсе дарожныя знакі, абышлі ўсе дамы вакол школы, замералі, колькі хвілін спатрэбіцца на дарогу, — расказвае Галіна Бяляева. — З-за адсутнасці крокамера прыйшлося вадзіць з сабой вучаніцу — каб усё было дакладна. Гэтую работу мы размясцілі на сайце школы, каб бацькі таксама падказвалі сваім дзецям, якая небяспека можа чакаць іх на дарозе. Наш вопыт перанялі яшчэ дзве школы з Магілёва і Бабруйска. А калі да нас звярнуліся з Мінадукацыі з прапановай дазволіць размясціць яе на міністэрскім сайце, мы з задавальненнем пагадзіліся. Гэтая работа нескладаная, але вельмі карысная. Наша школа нават атрымала падзяку ад ДАІ за супрацоўніцтва.

МАГІЛЁЎСКІ НЕКРОПАЛЬ

За апошняе стагоддзе класіфікацыяй месцаў пахавання ў Магілёве ніхто не займаўся. Па ініцыятыве Галіны Бяляевай гэты прабел быў запоўнены. У праекце ўдзельнічалі дзевяцікласніца 34-й школы Дзіяна Марозава, навуковым кіраўніком якой была Галіна Бяляева, і трэцякласнік 3-й гімназіі Максім Бяляеў пад кіраўніцтвам настаўніцы пачатковых класаў Ірыны Канапліцкай. Такі тандэм, дарэчы, таксама можна лічыць наватарскім. За паўгода яны абследавалі 6 могілак — Успенскія, Машакоўскія, яўрэйскія, польскае, Карабаноўскія, Уваскрасенскія і склалі спіс з 292 магіл. Усе пахаванні былі класіфікаваны па часе, палавой і ўзроставай прыкметах, асаблівасцях у афармленні магіл. Даследчыкі зрабілі ацэнку захаванасці помнікаў, склалі спісы імянных надмагілляў, вызначылі і неідэнтыфікаваныя магілы. Працу ацанілі на міжнароднай школьнай канферэнцыі ў Новасібірску і на XX Усерасійскіх чытаннях Вярнадскага ў Маскве. Яна выклікала інтарэс і ў вучоных Магілёўскага ўніверсітэта імя Куляшова. Такога, каб дзеці абаранялі сваю працу на ўніверсітэцкім узроўні, у Магілёве яшчэ не было.

Пасля таго, як гэтая работа з'явілася на школьным сайце, яе аўтары сталі атрымліваць цікавую інфармацыю. З імі звязаліся нашчадкі апошняга святара Іосіфаўскага сабора, які быў пабудаваны ў Магілёве ў XVIII веку ў знак сустрэчы імператрыцы Кацярыны II з аўстрыйскім імператарам Іосіфам. На жаль, у 1938 годзе храм быў разбураны. Ніякіх звестак аб тых, хто ў ім служыў, не засталося.

Але цяпер гэты прабел ліквідаваны. У пісьме, якое прыйшло на сайт школы з Санкт-Пецярбурга, паведамлялася, што святар Мікалай Іванавіч Гнядоўскі і яго жонка Алена Іосіфаўна былі арыштаваныя, але цудам пазбеглі расправы. Следчы так закахаўся ў іх пляменніцу, што зрабіў усё магчымае, каб іх вызваліць. Але тое, што ім прыйшлося перажыць, наклала свой адбітак — яны ў хуткім часе сышлі ў магілу. А іх дзеці вымушаны былі пераехаць у Ленінград. На Абухаўскім заводзе і па сёння працуе дынастыя Гнядоўскіх. Убачыць інфармацыю аб сваіх продках на сайце магілёўскай школы ім было вельмі цікава.

— Дзякуючы такім лістам мы спадзяёмся стварыць найбольш поўныя спіскі тых, хто быў пахаваны ў Магілёве, — кажа Галіна Бяляева. — На жаль, у савецкі час некалькі дарэвалюцыйных могілак было знесена. Адны з іх — Саборныя — знаходзілася бадай у сучасным цэнтры горада. Цяпер тут размешчаны жылыя і адміністрацыйныя будынкі, разбіты сквер. Але калі мы апытвалі людзей, знайшліся тыя, хто яшчэ памятае аб пахаваных тут. Адна жанчына — Святлана Шаблоўская — нават падзялілася старымі фотаздымкамі сваіх продкаў. Калі бачыш, які водгук выклікае твая праца, адчуваеш, што час патрачаны не дарэмна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Перадсвяточнае

У ЦАРСТВЕ СНЕЖНАЙ КАРАЛЕВЫ І МЫЛЬНЫХ БУРБАЛАК

Дабрачынныя навагоднія святы для дзяцей пачынаюцца на Міншчыне. Старт ім дасць баль у Мінскім абласным кадэцкім вучылішчы 24 снежня.

Усяго ж у цэнтральным рэгіёне пройдуць 33 дабрачынныя мерапрыемствы больш чым для 10000 дзяцей. Абласное свята «Навагодняе чараўніцтва» запланавана ў гарадскім Доме культуры Слуцка. На яго збяруцца 670 школьнікаў з усіх рэгіёнаў Міншчыны. Будуць запрошаны таксама адораныя дзеці, дзеці-інваліды і гадаванцы, што засталіся без апекі бацькоў. Малыя і падлеткі змогуць паўдзельнічаць у «Шоу мыльных бурбалак», майстар-класах «Маляванне мыльнымі бурбалкамі», наведаць краму «Мыловароff».

У Мядзеле плануецца свята «У гасцях у Снежнай Каралевы», у Мар'інагорскай гімназіі — мюзікл «Навагодняя ноч у музеі».

Але, бадай, самым галоўным стане свята, дзе лепшых вучняў павіншуе кіраўнік дзяржавы. Гонар трапіць сюды выпаў 300 хлопчыкам і дзяўчынкам сталічнай вобласці. Гэта пераможцы алімпіяд, міжнародных конкурсаў, юныя спартсмены, а таксама дзеці-сіроты і выхаванцы з малазабяспечаных сем'яў.

Мінскую абласную спецыялізаваную агульнаадукацыйную школу-інтэрнат для дзяцей з парушэннем слыху плануе наведаць міністр адукацыі Сяргей Маскевіч, Вілейскую спецыяльную адукацыйную школу-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы — міністр культуры Барыс Святлоў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

СВАБОДНЫХ СТОЛІКАЎ У КАВЯРНЯХ АМАЛЬ НЕ ЗАСТАЛОСЯ

З 20 снежня ў сталіцы павялічваецца зменнасць працы больш за 350 кандытарскіх і кулінарных цэхаў. Мяркуецца, што за перадсвяточныя і святочныя дні будзе дадаткова выпрацавана і рэалізавана каля 3 тысяч тон прадукцыі кулінарных, кандытарскіх і хлебабулачных вырабаў, паўфабрыкатаў, праведзена больш за 4 тысячы выстаў-продажаў кулінарнай прадукцыі.

Паводле інфармацыі Міністэрства гандлю, у шэрагу аб'ектаў грамадскага харчавання ў снежні будзе дзейнічаць гнуткая сістэма зніжак і акцый пры правядзенні мерапрыемстваў. Напрыклад, у некалькіх сталічных рэстаранах прадугледжана зніжка ў 10 працэнтаў: на банкетнае меню або пры папярэднім браніраванні правядзення карпаратыўнага мерапрыемства, або пры афармленні заказу на шэсць персон. У іншым рэстаране ўсю навагоднюю ноч будзе дзейнічаць прынцып «усё ўключана» ў дачыненні да спіртных напіткаў. У некаторых месцах пры правядзенні карпаратыўных мерапрыемстваў у пэўныя дні прадугледжана зніжка да 15 працэнтаў.

Увогуле, сёння ў 95% аб'ектаў грамадскага харчавання Мінска, а таксама ў большасці аб'ектаў рэстараннага бізнесу краіны прыняты заказы на правядзенне перадднавагодніх карпаратыўных вечароў. З 20 снежня ў аб'ектах грамадскага харчавання сталіцы адзначаць калядныя навагоднія святы штодня будуць каля 20 тысяч наведнікаў.

Кошт заказаў пры правядзенні банкетаў у перадднавагоднія дні ў залежнасці ад рэгіёна і сфарміраванага асартыменту страў і вырабаў складае ад 200 да 450 тысяч рублёў. Правесці навагоднюю ноч у аб'ектах грамадскага харчавання, па інфармацыі міністэрства, будзе каштаваць ад 500 тысяч рублёў і больш. У параўнанні з мінулым годам кошт перадднавагодніх карпаратыўных мерапрыемстваў практычна не зменіўся, у некаторых аб'ектах павялічыўся недзе на 10–15 працэнтаў, сцвярджаюць спецыялісты Мінгандлю.

З 20 снежня па 8 студзеня і 14 студзеня падаўжаецца работа аб'ектаў грамадскага харчавання да 2.00–3.00 гадзін, а ў навагоднюю ноч — да 6.00–7.00 (за выключэннем тых з іх, што размешчаны ў памяшканнях, убудаваных у жылыя дамы).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЗЕДА МАРОЗА ВЫКЛІКАЛІ? САМЫ ЧАС

Прадпрыемства «Белпошта» прапануе сваім кліентам, іх дзецям не толькі напісаць Дзеду Марозу ў Белавежскую пушчу пра свае запаветныя мары, не толькі замовіць ад яго лісты-падарункі, але і, што называецца, аформіць візіт…

— Наша прадпрыемства штогод (і гэта ўжо даўняя традыцыя!) усталёўвае на галоўных поштах сталіцы, абласных гарадоў адмысловыя скрынкі для лістоў Дзеду Марозу, — кажа намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства Таццяна Гвоздзева. — Мы дапамагаем бацькам, дзядулям-бабулям, усім ахвотным сустрэць яго дома, разам са Снягуркай, з іх рук атрымаць доўгачаканыя падарункі, расказаць падрыхтаваныя вершыкі, праспяваць песні, павадзіць карагоды… Іншымі словамі — зрабіць сапраўдны цуд, здзейсніць дзіцячую мару…

Замовіць візіт чароўных гасцей можна ў тэлеграфнай зале сталічнага паштамта (аперацыйнае акно № 1). Кошт паслугі — у залежнасці ад дня тыдня, ад даты — ад 240 да 420 тыс. рублёў. У пасылачнай зале працуе кірмаш навагодніх паштовак.

Валянціна ДОЎНАР.

НЕ СПАЗНІЦЦА ДАДОМУ Ў НАВАГОДНЮЮ НОЧ

У навагоднюю ноч праца шэрагу маршрутаў камунальнага пасажырскага транспарту ў сталіцы будзе арганізавана да 4.30 раніцы наступнага дня.

Гаворка, у прыватнасці, пра аўтобусныя маршруты № 1 «ДС «Вяснянка» — Вакзал», № 22 «ДС Ангарская-4» — ДС «Чыжоўка», № 73 «ДС «Сярова» — «Вяснянка», № 91 «АВ «Маскоўскі» — «Вяснянка», № 100 «АВ «Маскоўскі — Аэрапорт «Мінск-1», № 102 «ДС «Чыжоўка» — Вакзал». Інтэрвал руху на іх будзе ад 10 да 20 хвілін. Да 4.30 раніцы будуць таксама перавозіць пасажыраў наступныя тралейбусныя маршруты: № 26 «ДС «Чыжоўка» — Ст. м. «Аўтазаводская», № 30 «ДС «Малініна» — Вакзал», № 53 «ДС «Малінаўка-4 — ДС «Зялёны Луг-7». Інтэрвалы руху на іх будуць ад 10 да 16 хвілін.

Праца шэрагу маршрутаў камунальнага транспарту ў навагоднюю ноч будзе арганізавана да 2.30 1 студзеня (апошняе адпраўленне з канечнай станцыі метро ў напрамку мікрараёна — у 2.15). Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», у такім графіку (з інтэрваламі пераважна ад 15 да 20 хвілін) будуць працаваць 11 аўтобусных маршрутаў, 6 тралейбусных і два трамвайныя (№ 1 «Зялёны Луг» — «Пл. Мяснікова» і № 3 «Возера — «Серабранка» з інтэрваламі руху на абодвух у 16 хвілін).

Метрапалітэн у навагоднюю ноч будзе працаваць таксама да 2.30 (апошняе адпраўленне электрацягнікоў з канечных станцый). Станцыі «Няміга», «Кастрычніцкая» і «Купалаўская» закрыюць для ўваходу пасажыраў у 2.10. Пачатак працы — з 5.30.

ЗАЙШОЎ У КРАМУ? АДЧУЙ СЯБЕ ДЗЕДАМ МАРОЗАМ!

Гандлёвыя арганізацыі спажывецкай кааперацыі прапануюць пакупнікам удзел у дабрачыннай акцыі «Рабі дабро — стань Дзедам Марозам!».

Малюнкі дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, выхаванцаў рэгіянальных дзіцячых дамоў, інтэрнатаў, сацыяльных устаноў з пасланнямі Дзеду Марозу размешчаны ў крамах спажывецкай кааперацыі «Дзіцячы свет», «Універмаг» і іншых, што рэалізуюць тавары дзіцячага асартыменту. Кожны пакупнік у гэтых крамах можа выбраць малюнак з ёлкі, набыць падарунак і перадаць яго дзіцяці — аўтару таго малюнка.

Па інфармацыі Белкаапсаюза, напярэдадні калядных і навагодніх свят акцыя з поспехам праходзіць у многіх арганізацыях спажывецкай кааперацыі па ўсёй краіне.

Сяргей РАСОЛЬКА

ГУЛЬНЯ Ў АБЯЦАНКІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У цэнтры працуе 12 чалавек, за кожным замацавана 1000 асабовых рахункаў. У кожнага супрацоўніка свой участак, за які ён нясе адказнасць, — тлумачыць Галіна Мікалаеўна.

Аплачваць камунальныя паслугі можна да 25 чысла кожнага месяца. З гэтага дня пачынаецца ўзмоцненая работа з даўжнікамі. Першы захад — сістэма аўтадазвону, калі робат па тэлефоне папярэджвае аб неабходнасці заплаціць за кватэру. Апроч таго, неплацельшчыкаў чакаюць пісьмовыя нагадванні, прадпісанні, папярэджванні, вывешванні спісаў іх імёнаў каля пад'ездаў, званкі, надомныя візіты. На ўсё гэта супрацоўнікі РДЦ вымушаныя траціць свой вольны час, бо ў іх ёсць яшчэ і непасрэдныя працоўныя абавязкі — прыём і абслугоўванне грамадзян у цэнтры.

…Пакуль цёмнымі дварамі пераходзім да новага дома, бухгалтар і юрысконсульт распавядаюць мне пра сваіх «падапечных». Пры гэтым называюць яны іх звычайна ў такім парадку: спачатку вуліца, пасля нумар дома і кватэра, апошнім — прозвішча. Адчуваецца, што яны ўжо звыкліся з падобнымі паходамі. Я ж крыху хвалююся, бо перад рэйдам наслухалася рознага.

— Па адной мы ніколі не ходзім, — кажуць мае спадарожніцы. — Звычайна па два-тры чалавекі. Міліцыянеры з намі ходзяць рэдка і неахвотна, спасылаюцца на занятасць.

Ад супрацоўніц РДЦ я даведалася, што даўжнікі могуць і не адчыніць, і абразіць, і за дзверы выштурхнуць, і пагражаць, і нацкаваць сабаку… А ёсць жанчына, якая адразу без лішніх слоў кідаецца ў бойку.

«Я НЕ ПРАЦУЮ І МЯНЕ ХУТКА ПАСАДЗЯЦЬ»

Па другім адрасе трапляем у камунальную кватэру, дзе жывуць пяць сем'яў. Дзверы ў пакоі размешчаны ўздоўж вузкага калідора, асветленага «лямпачкай Ільіча». Па кутах стаяць нейкія гаспадарчыя рэчы, налева ад уваходу — агульная кухня. Некалі жыллё ў гэтай камуналцы атрымалі супрацоўнікі завода «Керамін», пасля ім дазволілі выкупіць сваё жыллё, і цяпер тутэйшыя жыхары з'яўляюцца долевымі ўласнікамі. Мы грукаемся ў дзверы аднаго з пакояў, адчыняе жанчына, узрост якой вызначыць складана з-за ўспухлага ад злоўжывання алкаголем аблічча. На пытанне аб аплаце спакойна адказвае: «Я яшчэ не працую, і мяне хутка пасадзяць». Я ад такой заявы слупянею, але саму даўжніцу, якая нядаўна выйшла з месца пазбаўлення волі і цяпер парушыла рэжым, гэты факт, відаць, зусім не засмучае. Як і той, што ў яе запазычанасць больш за дзесяць мільёнаў рублёў. Суседка, мажная кабета ў шэрым халаце, якая неназойліва прысутнічае пры размове, пачуўшы гэтую лічбу, акругляе вочы і прыкрывае рот рукой. Зрэшты, гаспадыня неаплачанай жылплошчы збіраецца здаць свой пакой і такім чынам зарабіць грошы на пагашэнне доўгу.

Наступны даўжнік таксама жыве ў падобнай камуналцы. Уваходзім у калідор, і ў нос ударае пах кошкі і нейкага рэзкага хімічнага рэчыва кшталту ацэтону. Кіруемся ў апошні па калідоры пакой, дзверы якога адчыняе мужчына-інвалід: няўзброеным вокам відаць, што ў яго праблемы з нагамі. З-за гэтага ён не працуе, і за жыллё плаціць брат. Зрэшты, той таксама цяпер толькі ў працэсе працаўладкавання, таму за жылплошчу ўжо назбіраўся доўг. Адметна, што нягледзячы на відавочную загану, наш суразмоўца не мае групы па інваліднасці і не прыкладае ніякіх намаганняў, каб яе атрымаць. «Цяпер гэта не мае сэнсу, бо мне з дзяцінства яе не далі,» — лічыць мужчына.

НЕ АДЧЫНЯЮЦЬ ДЗВЕРЫ — ГРУКАЙЦЕ Ў СЦЕНЫ!

У наступным доме ў агульны калідор нас упусціў малады мужчына — сусед



У калідоры сучаснай камунальнай кватэры.

Кемлівасці гаспадару не займаць: праз сцяну ў кватэру ад электрашчытка ідзе заматаны ізастужкай провад. «Зноў «падсілкаваўся»!» — наракаюць мае спадарожніцы.

даўжніка, да якога мы прыйшлі. Грукаемся ў дзверы, бо званка няма і электраэнергія ў гэтай кватэры адключана за няўплату. Тым не менш, відаць, кемлівасці гаспадару не займаць: праз сцяну ў кватэру ад электрашчытка ідзе заматаны ізастужкай провад. «Зноў «падсілкаваўся»!» — наракаюць мае спадарожніцы. «Вельмі цікава! А я ж думаю, чаму ў мяне лічыльнік столькі кілават накручвае?» — абураецца сусед. Тым часам працягваем грукаць у дзверы, але безвынікова. «Святло гарыць», — заўважаюць жанчыны. І распавядаюць пра выпадак, калі аднойчы суседзі паралі пастукаць у сцяну: маўляў, такі ўмоўны знак, які падае, прыйшоўшы, «сабутэльнік», якога адправілі ў краму па выпіўку. І — цуд: тады на грукат у сцяну дзверы сапраўды адчынілі. Зрэшты, мы паўтараць падобны эксперымент не сталі і пайшлі далей.

У наступнай кватэры ўсталяваныя даволі добрыя дзверы, ёсць нават званок, які працуе. Тым не менш, тут нас напаткала тая ж самая гісторыя з замкнёным замком. Звонім у суседнюю кватэру, адчыняе жанчына і кажа, што сваіх суседзяў не бачыла ўжо даўно і нічога пра іх не ведае.

— Баіцца, — пераканана Вера Крукоўская, — бо запужаюць яе, як пасля на вуліцу выйсці? А сам, відаць за дзвярыма сцішыўся і сядзіць, не адчыняе.

Адчыняе жанчына, узрост якой вызначыць складана з-за ўспухлага ад злоўжывання алкаголем аблічча. На пытанне аб аплаце спакойна адказвае: «Я яшчэ не працую, і мяне хутка пасадзяць».

У апошнюю кватэру мы зайшлі хутчэй з цікаўнасці, бо запазычанасць тут невялікая — «усяго» другі перыяд пайшоў, але даўгавы «хвост» тут з'яўляецца рэгулярна. Гаспадыня не працуе, за жыллёвыя паслугі плаціць муж. Мае спадарожніцы распавялі, што адну з неаплат жыхарка патлумачыла тым, што пасварылася з сужэнцам, і той адмовіўся плаціць.

Нона Краўцова набірае нумар кватэры на дамафоне. Пасля некалькіх гудкоў мужчынскі голас пытаецца: «Хто там?» — «Добры вечар, разлікова-даведачны, дайце, калі ласка, доступ да пад'езда». Але мужчына моўчкі кладзе трубку. Пакуль бухгалтар робіць другую спробу трапіць у пад'езд, набіраючы іншы нумар кватэры, юрыст заўважае, што больш за ўсё часу ідзе на прастойванне пад дзвярыма.

Нарэшце нас упускаюць. Падымаемся па лесвіцы і ціснем на званок. Адчыняе каротка стрыжаная жанчына гадоў 50–55. «Сяброўства» з алкаголем наклала бязлітасны адбітак на яе твар. На пытанне канцралёраў аб неаплаце жанчына рэагуе вельмі эмацыйна, пры гэтым актыўна жэстыкулюючы. «Мама, не гаруй! Дзяўчаты мае міленькія, з-за нейкіх ста «рублёў» вы ходзіце… Калі ў некага мільёны! Не надакучвае? Праз два дні аплацім!» — абяцае гаспадыня.

Фрагмент агульнай кухні, якой карыстаюцца пяць сем'яў.

ЦІ ЁСЦЬ ВЫЙСЦЕ З ЗАМКНЁНАГА КОЛА?

Выпраўляючыся ў рэйд па кватэрах неплацельшчыкаў, я ўсведамляла, з якой катэгорыяй людзей мне давядзецца сутыкнуцца, таму вялікага здзіўлення іх побыт і лад жыцця не выклікалі. Але ж тры рэчы сапраўды ўразілі, калі не сказаць шакіравалі. Нягледзячы на тое, што большасць даўжнікоў нідзе не працуюць і грошай на аплату жылля ў іх няма (затое на выпіўку ёсць), знайсці сабе якуюсьці працу яны і не імкнуцца. Даходзіць да абсурду: супрацоўнікі РДЦ самі шукаюць для іх работу на біржы, а ў адказ на прапанову чуюць нешта накшталт «буду я за два мільёны дворнікам працаваць, самі працуйце за такія грошы». А ў выпадку чаго яшчэ і скаргу могуць напісаць, маўляў, па якім праве з мяне нешта патрабуюць? У разлікова-даведачным цэнтры мне распавялі, што многія не разумеюць, што за жыллёва-камунальныя паслугі неабходна плаціць гэтак сама, як за прадукты ў краме.

Яшчэ адна праблема заключаецца ў тым, што, па сутнасці, змагацца з неплацельшчыкамі амаль ніяк немагчыма. Нават калі кватэра ідзе на адчужэнне, яе гаспадара проста перасяляюць на меншую жылплошчу, скажам, з агульнай кухняй. У выніку атрымліваецца наступнае: давёўшы сваё жыллё да стану разрухі і антысанітарыі і назапасіўшы значны даўгавы «хвост», даўжнік атрымлівае новы даволі прыстойны пакой, за які ізноў хутка назапашвае новую запазычанасць. Яшчэ больш сціплыя ўмовы для парушальніка знайсці амаль немагчыма, а выгнаць на вуліцу — нельга. Атрымліваецца замкнёнае кола…

А трэці момант, які засмуціў мяне ва ўсёй гэтай сітуацыі, датычыцца супрацоўніц РДЦ. Маючы не надта высокія заробкі, безабаронныя жанчыны вымушаны, апроч сваіх прамых абавязкаў, займацца справамі, якія патрабуюць не толькі фізічных, але і неверагодных маральных высілкаў. Хіба мусяць юрысткі, пашпартысткі і бухгалтары «выбіваць» аплату з, выбачайце за прамалінейнасць, алкаголікаў і крымінальнікаў? Пісаць лісты, некалькі разоў на дзень абходзіць кватэры, тлумачыць, прасіць, у адказ нярэдка чуць лаянку, а часам і ставіць пад пагрозу сваю бяспеку, не ведаючы нават, ці дасць плён іх праца? І пасля не атрымаць прэміі з-за невыканання плана, які залежыць зусім не ад іх, а ад нашай з вамі — спажыўцоў камунальных паслуг — свядомасці.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота аўтара.

Предложение о покупке акций

Открытое акционерное общество «Монтажлегмаш» (220004, г. Минск, ул. Короля, д. 18, комн. 1а-11а, 1 этаж; контактные телефоны +375-17-200-45-37, +375-29-706-03-13 (Покупатель, Эмитент) настоящим информирует о выкупе у акционеров 1675 акций собственного выпуска по цене 500 000 (пятьсот тысяч) белорусских рублей за 1 (одну) акцию на основании решения общего собрания акционеров (протокол № 4 от 17.12.2013) в целях сокращения их общего количества для последующего аннулирования.

Выкупленные по решению Общества акции будут оплачены денежными средствами из кассы Общества в течение 60 (шестидесяти) дней с момента регистрации договора профессиональным участником рынка ценных бумаг. Возможна досрочная оплата выкупаемых по требованию акционеров акций, в том числе посредством перечисления задатков и (или) авансов.

Заявления о выкупе акций необходимо направлять по адресу: 220004, г. Минск, ул. Короля, д. 18, комн. 1а-11а, 1 этаж. Договоры купли-продажи акций также будут заключаться по указанному адресу. Регистрация заключенных договоров купли-продажи будет осуществляться по адресу: 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 117А, пом. 12.

Срок представления акционерами предложений о продаже акций: начало – 17.12.2013, окончание – 16.05.2014.

Срок, в течение которого осуществляется приобретение акций (заключение договоров купли-продажи акций): начало – 20.05.2014, окончание – 17.06.2014.

УНП 100120218

К сведению акционеров ОАО «Технолит Полоцк»!

ОАО «Технолит Полоцк» извещает акционеров о том, что в связи с переоформлением акций дополнительного выпуска согласно требованиям законодательства Республики Беларусь список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, будет сформирован на основании данных реестра акционеров по состоянию на **19 декабря 2013 г.**

Наблюдательный совет ОАО «Технолит Полоцк»

УНП 300083521

KOSMETIKA AKTIV

ИТОГИ РОЗЫГРЫША РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«BOURJOIS. Путешествие в Париж!»

Организатор: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Косметика Актив», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190611991 (далее — «Организатор»). Местонахождение Организатора: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Амураторская, д. 4Б, пом. 22, каб. 17. Свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации № 0041971 выдано Минским горисполкомом 18 июня 2012 года.

Наименование Рекламной игры: «BOURJOIS. Путешествие в Париж!».

Территория проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.

Период проведения Рекламной игры: с 01 октября 2013 года по 14 января 2014 года включительно.

Сведения о государственной регистрации Рекламной игры: Свидетельство № 2239 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 27 сентября 2013.

Сведения о количестве участников Рекламной игры: 3 033 (три тысячи тридцать три) участника.

Призовой фонд разыгран полностью:

Наименование разыгранного приза	Количество (штук)
«Косметичка черно-белая Bourjois»	1 000
Туристическая поездка в Париж на 2 (двоих) продолжительностью 4 ночи в период с 01.12.2013 по 28.02.2014.	1

Победители Рекламной игры:

Номер участника	Фамилия Имя Отчество	Наименование приза
892	Кишкель Елена Владимировна	Туристическая поездка в Париж на 2 (двоих) продолжительностью 4 ночи в период с 01.12.2013 по 28.02.2014

С полным списком победителей Рекламной игры, выигравших приз «Косметичка черно-белая Bourjois» можно ознакомиться на сайте **www.kosmetika-aktiv.by.**

Информацию о месте, дате и необходимых документах для получения призов можно получить с понедельника по пятницу с 9.00 до 17.00 по телефону (017) 306-22-76 (кроме государственных праздников и праздничных дней, приходящихся на данный период).

УНП 190611991

■ Інфарм-укол

ХАРЧУЕМСЯ ПРАВІЛЬНА

Пры запаленні слізістай тонкага і тоўстага кішэчніка, парушэнні ператраўлівання і ўсмоктвання ежы хворы пакутуе ад болю ў жываце, бурчання, успушвання, хуткай стамляльнасці. Калі пакутуе ў асноўным тонкая кішка, балець пачынае вакол пупка, калі ў паталогію ўцягнуўся тоўсты кішэчнік, боль праяўляецца больш ярка, узмацняецца пры збіранні газаў. Стул, як правіла, няўстойлівы — то паслаблены, то запор. Агульны стан не змяняецца пры лёгкай і сярэдняй ступені цяжару захворвання, пры цяжкай жа ступені хворыя худзеюць.

Паводле слоў **урача-рэабілітолага 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Надзеі ЛАЎРЭНЦЬЕВАЙ,** у хранічнага захворвання кішэчніка шмат прычын. Дызентэрыя, глісная інвазія, вірусныя хваробы, хранічныя інфекцыі (туберкулёз, хворыя зубы, гнайнікі ў міндалінах), хібы ў харчаванні (злоўжыванне грубай, цяжкай для засваення ежай, вострымі, вэнджанымі стравамі, парушэнне рэжыму харчавання), хваробы органаў стрававання, алергія, спадчыннасць, злоўжыванне некаторымі медыкаментамі і інш.

Правільная дыетатэрапія спрыяе ў гэтым выпадку аднаўленню зменených функцый кішэчніка, парушанага абмену рэчываў. Харчаванне павінна быць максімальна збалансаваным і разнастайным.

Паўнацэнны бялок дапамагае хутчэй аднавіць парушаныя функцыі кішэчніка, печані, падстраўнікавай залозы, у цэлым абмен рэчываў.

Колькасць тлушчу пры энтэракаліце — 100–120 г за суткі, але каб ён не выклікаў паслаблення, яго неабходна размеркаваць на ўсе прыёмы ежы. Не рэкамендуецца ўжываць тлушч у свабодным выглядзе — лепей дадаваць у гатовыя стравы. У моманты абвастрэння захворвання, расстройстве кішэчніка тлушчы ў харчаванні на 4–5 дзён змяншаюцца да 60–70 г.

Пры хранічным энтэракаліце звычайна дрэнна ўсмоктваюцца вітаміны і мінеральныя солі (кальцый, фосфар, калій, жалеза і г.д.), што можа прывесці да змяненняў у нервовай і мышачнай сістэмах, карыесу зубоў, змены ў касцях. Таму вітаміны і мінералы трэба ўжываць дадаткова. Кальцый добра засвойваецца, калі ў дыеце дастаткова бялку, тлушчу і фосфару. Штодня, хоць бы раз на дзень, неабходна ўжываць **несалёны тварог** і **сыр.** Для папаўнення запасу жалеза і прафілактыкі малакроўя трэба ўжываць **мяса, яйкі, зярністую ікру, печань, гематаген** (яго нават дадаюць у кашы, печыва), з прадуктаў раслiннага паходжання — **пшанічную муку 2 гатунку, аўсяныя крупы, айву, яблыкі, кізіл.** З садавіны гатуюць адвары, кісялі, кампоты, варэнне, джэмы. Яблыкі і грушы можна запякаць у духоўцы. Пры заціханні непрыемных сімптомаў яблыкі можна есці сырымі.

Соль істотна абмяжоўваецца, паколькі раздражняе слізістую і паслабляе стул.

Яйкі таксама могуць дрэнна пераносіцца з-за амінакіслот, якія змяшчаюць серу і тым самым спрыяюць утварэнню серавадароду. Аднак калі ўжыванне яек не выклікае непрыемных адчуванняў, іх можна спакойна ўжываць.

Усе стравы варта гатаваць на пары, варыць ці запякаць.

Нельга ўжываць ежу падчас чытання, прагляду тэлепередач. Вельмі важна сканцэнтравацца на тым, што вы ясце, каб усе ферментатыўныя сістэмы пачалі працаваць у аптымальным рэжыме.

Катэгарычна нельга ўжываць гарачую ежу (вышэй за 40 градусаў). Ежа павінна быць крыху цяплейшай за пакаёвую тэмпературу. Гэта звязана з жыццём і аднаўленнем клетак стрававальнага тракта (яны аднаўляюцца праз кожныя тры дні). Калі ж тройчы на дзень ужываць гарачую ежу, то клеткі, якія загінулі, не паспеюць аднавіцца, з-за чаго пачнуць з'яўляцца эрозіі, гастрыты, энтэракаліты, каліты і язвы.

Нельга піць ваду падчас яды. Не пажадана піць і адразу пасля яе. Рэкамендуецца піць ваду за 1 гадзіну да яды, каб яна паспела накіравацца ў страўнік. У спякоту тэмпература вады павінна быць 23 градусы, у халодны час — 35.

Хворым на хранічны энтэракаліт у стадыі рэмісіі (калі няма абвастрэння) рэкамендуецца дыета з наяўнасцю бялкоў (100–120 г), тлушчаў (100–120 г), вугляводаў (400–450 г), солі (да 15 г), свабоднай вадкасці (1,5 л). Маса сутачнага рацыёну — 3 кг. Энергетычная каштоўнасць — 3000–3500 ккал за суткі. Тэмпература халодных страў не ніжэй за 15 градусаў, гарачых — не вышэй за 40. Харчаванне пяціразовае, пераважна ў выглядзе пюрэ.

Рэкамендуюцца:

— пшанічны хлеб учарашняй выпечкі, булачкі або пірагі з няздобнага цеста з вараным мясам, рысам, яйкамі, яблыкамі; ватрушка з тварагом;

— супы на абястлушчаным мясным ці рыбным булёне з рознымі крупамі (акрамя проса), вермішэллю, бульбай, морквай, кабачкамі, гарбузом, квяцістай капустай;

— нятлустыя гатункі мяса (ялавічына, цяляціна, трусяціна), птушкі (курацына, індычына) або рыбы (судак, траска, хек, акунь, навага), нятлустая вяндліна, вымачаны селядзец;

— яйкі ўсмятку, амлеты;



— сметанковае масла (не больш за 50 г на суткі);

— агародніна (морква, бульба, кабачкі, гарбуз, пры добрай пераносна-сці — капуста, зялёны гарошак, маладая фасоля, буракі);

— рассыпчатыя кашы (акрамя прасяной і ячнай), гатаваныя на вадзе з дабаўленнем 1/3 малака або вяршкоў, пудынгі паравыя або запечаныя, вермішэль;

— печаныя яблыкі і грушы, салодкія плады і ягады ў кісялях, кампотах, жэле, джэмах, варэнні. Клубніцы, суніцы, маліны, яблыкі і грушы без лупін дапускаюцца ў сырым выглядзе;

— свежыя сокі з яблык, клубніц, вішань;

— неразведзенае малако ў стравах, чыстым выглядзе, кісламалочныя прадукты, свежы тварог натуральны або ў пудынгах, запяканках, ватрушках, нявостры сыр, свежая смятана (да 15 г у стравах);

— зяленіва пятрушкі, кропу, ваніль, лаўровы ліст у малой колькасці, малочны соус без падсмажвання мукі з дабаўленнем смятаны, масла, таматнага соку, фруктовыя соусы;

— чай, кава з малаком, адвары шыпшыны і чорных парэчак.

Абмяжоўваюцца стравы, багатыя на халестэрын: яечны жаўток, печань, язык, сэрца, лёгкія, мазгі. Булёны лепш за ўсё гатаваць на адвары з круп ці агародніны.

Выдаляюцца:

тлустае мяса (свініна, бараніна), птушка (качаціна, гусяціна), рыба (асятрына, сяўруга, бялуга), рыбныя і мясныя кансервы, варанае ўкрутую яйка, свіны тлушч, бабовыя, ячныя крупы, радыска, часнок, цыбуля, перац, агуркі, грыбы, вэнджанае, тлустыя і вострыя соусы, гарчыца, хрэн, вінаградны сок.

Супрацьпаказаны прадукты, багатыя на арганічныя кіслоты: кіслыя ягады і плады (лімон, журавіны, агрэст, чорныя і чырвоныя парэчкі, чырвоныя вішні, кіслыя яблыкі), а таксама кіслыя малочныя прадукты.

Падчас абвастрэння (акрамя асноўнага меню на дыеце):

✓ соль абмежаваць да 5–8 г;
✓ вада — 1,5 л;
✓ вітаміны А, С групы В;
✓ прыём ежы праз кожныя 2–3 гадзіны ў вадкім і паўвадкім выглядзе;
✓ нават пры паляпшэнні стану рэкамендуецца шасціразовае харчаванне;
✓ катэгарычна забараняецца ўжыванне алкаголю.

Хвораму, які пакутуе ад некалькіх захворванняў, лячэбнае харчаванне прызначаецца з улікам патрабаванняў і абмежаванняў усіх дыет. Таму неабходна выконваць рэкамендацыі ўрача з улікам спадарожных захворванняў і індывідуальных асаблівасцяў.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Святочны настрой

КАЛЯДНЫЯ БАЛІ

У Мірскім замку пройдуць калядныя балі для дзяцей і дарослых, паведамілі БЕЛТА ў дырэкцыі музея.

«Мірскі баль» у Партрэтнай зале 3 студзеня дасць магчымасць гасцям акунуцца ў рамантыку эпохі, калі балі былі неад'емнай часткай свецкага жыцця. Госці правядуць вечар ля Каляднай ёлкі пад гукі вальса і паланэза, будуць гуляць у свецкія, настольныя і рухавыя гульні. Дамы на гэтым вечары павінны быць у вячэрняй сукенцы, а мужчыны — у касцюме. А 4 студзеня ў замку адкрыецца рэтра-салон XX стагоддзя. У праграме іскрамётныя танцы пад жывое гучанне джаз-бэнда, фотаздымкі ў інтэр'еры 20–30-х гадоў, прагляд нямога кіно, пачастунак і начная экскурсія па раскошных залах. Па выніках вечара будзе вызначана самая стыльная і элегантная пара, якую чакае сюрпрыз.

Дзіцячы Калядны баль пройдзе 5 студзеня ў Сталовай зале. Гасцей ад 6 да 13 гадоў чакаюць танцы, гульні, падарункі і казачны паказ. Калядныя мерапрыемствы вельмі папулярныя. Так, на дзіцячы баль білеты практычна ўжо раскуплены.

Напярэдадні навагодніх свят у Мірскім замку прадставяць таксама ўнікальную экспазіцыю адзення і аксесуараў.

Выстаўка «Дух часу і раскошы: мода і стыль 1820–1920 гадоў» з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага адкрыецца 20 снежня ў Слановай зале. Тут можна будзе ўбачыць вячэрнія, бальныя, вясельныя сукенкі, абутак, упрыгажэнні і аксесуары, у якіх жанчыны Парыжа, Лондана, Вены, Прагі і Нью-Ёрка пакаралі сэрцы мужчын. Выстаўка стане выдатным упрыгажэннем замка ў перыяд зімовых свят, адзначылі ў музеі.

■ Безгаспадарчасць

І ДЗЕ Ж МАРКЕТЫНГ?

Аб неабходнасці граматнай маркетынгавай палітыкі на прадпрыемствах гаворыцца шмат, а на справе… Паказальныя факты прывялі на калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці, дзе абмяркоўваліся меры па рэалізацыі Праграмы развіцця птушкагадоўлі ў Беларусі на 2011–2015 гады.

Летам адбываецца сезонны спад попыту на яйка і, адпаведна, скарачаецца ўзровень рэнтабельнасці ад рэалізацыі прадукцыі. Каб пазбегнуць псавання апошняй, Бераставіцкая птушкафабрыка ў маі — верасні сёлетняга года накіравала на экспарт 2116 тысяч штук яек. Сярэдняя цана склала 497 тысяч рублёў за 1000 штук пры сабекошце 600 тысяч рублёў. Увогуле эканамічныя паказчыкі наступныя: страты ад экспартных паставак — 218 мільёнаў рублёў, рэнтабельнасць продажу — мінус 20,7%. Аналагічная сітуацыя адзначана на Шчучынскай племянной птушкагадоўчай рэпрадуктарнай фабрыцы.

Няўжо гэта ад бязвыхаднасці? Але вось другі бок медаля. У вобласці ёсць магутнасці, каб знайсці альтэрнатыву стратнаму экспарту. На птушкафабрыцы «Слонімская» два гады таму ажыццявілі інвестыцыйны праект па будаўніцтве цэха глыбокай перапрацоўкі яек. Прадугледжвалася перапрацоўка за змену 150 тысяч яек у выглядзе вадкіх пастэрызаваных сепарыраваных яйкапрадуктаў (меланж, жаўток і бялок), затрачана 617 тысяч еўра. І што ў выніку? У 2012 годзе цэх быў загружаны толькі на … 12%. У той час як на большасці птушкафабрык са стратамі рэалізоўвалі прадукцыю за межы краіны. Істотных змяненняў няма і сёлета: за 11 месяцаў загружанасць склала 12,5%. Гэта звязана з адсутнасцю дакладнай каардынацыі дзеянняў птушкафабрык па пастаўцы яек, непрадуманай маркетынгавай і цанавой палітыкай, лічыць Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 0745219-0745220 **считать недействительными**.

УНП 101883943

Считать недействительными страховые свидетельства обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии АЖ № 8824093; серии ВС № 5452474; серии ВР № 3457521; № 3458874, № 3460785; страховой полис добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серии БМ № 0539307 СООО «Белкоопстрах» филиал в г. Могилеве.

УНП 100706519

Открытое акционерное общество «Монтажлегмаш» (220004, г. Минск, ул. Короля, д. 18, комн. 1а-11а, 1 этаж; контактные телефоны +375-17-200-45-37, +375-29-706-03-13, УНП 100120218) настоящим в соответствии с требованиями ст.ст. 28, 75 Закона Республики Беларусь № 2020-XII от 09.12.1992 (ред. от 15.07.2010) «О хозяйственных обществах» информирует своих кредиторов об уменьшении уставного фонда на 24 570 000 рублей. На основании решения общего собрания акционеров (протокол № 4 от 17.12.2013) новый размер уставного фонда Общества составляет 75 460 000 рублей.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 20.01.2014 в 10.00
по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.
Организатором аукциона является республиканское унитарное предприятие

«Отель «Минск»,

находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

1. Помещение № 315 арендуемой площадью 23,8 кв.м на третьем этаже в здании по просп. Независимости, 11/2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 511 700 рублей; размер задатка – 51 200 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 258 000 рублей.

2. Помещение № 425 арендуемой площадью 24,8 кв.м на четвертом этаже в здании по просп. Независимости, 11/2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 533 200 рублей; размер задатка – 53 300 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 258 000 рублей.

3. Помещение № 517 арендуемой площадью 23,6 кв.м на пятом этаже в здании по просп. Независимости, 11/2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с водо- и электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 507 400 рублей; размер задатка – 50 750 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 258 000 рублей.

Документы на участие в аукционе принимаются с 18.12.2013 по 16.01.2014 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 229. Документы, поданные после 16.00 16.01.2014, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

- перечисляет задаток на р/с № 3012000006014 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо *предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

- индивидуальный предприниматель *– копию свидетельства о государственной регистрации;*

- юридическое лицо *(резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Телефон для справок: (8-017) 209-92-78, (8-029) 642-52-64.

ОАО «Гомельоблреклама»

филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)
извещает о проведении 31 декабря 2013 года
повторного открытого аукциона по продаже имущества
в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-8

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
	Местонахождение: Гомельская область, г. Гомель, ул. Борисенко, 7		
	Информация о земельном участке: Земельный участок для организации проезда общего пользования площадью 0,2010 га.		
1	капитальное строение, инв. № 350/С-42580, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **главный корпус пл. 3236,0 кв.м.** Ограничения (обременения): договор № 01 безвозмездного пользования от 04.04.2008 г. Информация о земельном участке: предмет торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000006004801 площадью 1,0851 га, доля в праве 61/100 условного земельного участка. **ворота 2** (инв. № 117); **забор железобетонный** (инв. № 114); **забор металлический** (инв. № 115); **железнодорожный путь** (инв. № 11). Ограничения (обременения): договор № 02 безвозмездного пользования от 04.04.2008 г. Информация о земельном участке: предмет торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000006004801 площадью 1,0851 га, доля в праве 28/100 условного земельного участка.	2 652 540 000	200 000 000
2	капитальное строение, инв. № 350/С-85654, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **открытый склад № 2 пл. 2049,0 кв.м.** Информация о земельном участке: предмет торгов расположен на земельном участке: - с кадастровым номером 340100000006001521 площадью 0,1906 га; - с кадастровым номером 340100000006004749 площадью 0,0008 га; - с кадастровым номером 340100000006004748 площадью 0,0009 га; - с кадастровым номером 340100000006004743 площадью 0,0008 га. - **пропарочная камера** (инв. № 118); - **пропарочная камера** (инв. № 119); капитальное строение, инв. № 350/С-42581, назначение – здание спец. складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад эмульсола пл. 12,5 кв.м.**	861 600 000	80 000 000
3	капитальное строение, инв. № 350/С-44482, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **известегасительная пл. 209,5 кв.м.** Информация о земельном участке: предмет торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000006004742 площадью 0,2437 га. капитальное строение, инв. № 350/С-44483, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **растворный узел № 2 пл. 255,8 кв.м.**	281 400 000	28 000 000
4	капитальное строение, инв. № 350/С-42579, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание автоматизированного склада цемента площадью 232,7 кв.м.** Информация о земельном участке: предмет торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000006004801 площадью 1,0851 га, доля в праве 4/100 условного земельного участка.	596 400 000	59 000 00
5	емкость металлическая (эмульсола) 2 м.куб. (инв. № 3109)	1 680 000	100 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельоблреклама». Контактный тел. (0232) 74 17 34.

Шаг аукционных торгов – 5%.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет продавца (ОАО «Гомельоблреклама») р/с № 3012087360317 в ЗАО «Дельта Банк», УНП 400071204, код 153001281.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-8, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 30 декабря 2013 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 158(27523) от 24.08.2013 г.

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 029 694 43 89; 8 (0232) 74-17-34, 74-59-73 и на сайте gomeloblreklama.by

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ОАО «МАПИД»

В опубликованную 05 ноября 2013 г. в газете «Звязда» № 209 проектную декларацию (о проекте строительства «Жилая многокварти рная застройка со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого в г. Минске. 3-я очередь строительства. Жилой дом № 2» по генплану) внести дополнения и изменения в раздел «Характеристика объекта», изложив его в следующей редакции:

Характеристика объекта.

Объект – 126-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-111-90 со встроенным административным помещением и помещением товарищества собственников на первом этаже.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска и осуществляющих строительство по направлениям администраций районов г. Минска:

- с выполнением полного комплекса отделочных, сантехнических и электротехнических работ:

1) без государственной поддержки для нормативной площади – **7 487 000 руб.**

- для площади, превышающей нормативную площадь, – **11 200 000 руб.**

2) с государственной поддержкой для нормативной площади – **7 002 000 руб.;**

- для площади, превышающей нормативную площадь, – **10 858 000 руб.**

- без выполнения в полном объеме комплекса отделочных, сантехнических и электротехнических работ:

3) без государственной поддержки для нормативной площади – **6 759 000 руб.**

- для площади, превышающей нормативную площадь, – **10 646 000 руб.**

4) с государственной поддержкой для нормативной площади – **6 322 000 руб.;**

- для площади, превышающей нормативную площадь – **10 209 000 руб.**

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других, не зависящих от застройщика, причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

УНП 100008115.

Сакральны каляндар Беларусаў

«МІКОЛЬСКАЯ СВЯЧА» ДОРЫЦЬ НАДЗЕЮ, або Феномен абрадавай практыкі

У апошнія некалькі гадоў мы актыўна супрацоўнічаем з калектывам Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, які дбайна клапоціцца пра захаванне, міжнародную прэзентацыю і вылучэнне элементаў традыцыйнай культуры на статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. У 2009 г. па ініцыятыве Цэнтра мы распачалі эксклюзіўны праект па даследаванні мясцовай абрадавай традыцыі пад агульнай назвай «Свяча».

Трэба адзначыць, што абрад гэты практычна ўсюды існуе ў непарыўным адзінстве з ушанаваннем іконы святога, якога вяскоўцы выбіралі ў якасці нябеснага заступніка. Напрыклад, у в. Басценавічы Мсціслаўскага раёна існуе даволі закрыты саюз мясцовых жанчын (прынамсі, мужчыны не дапускаюцца да ўдзелу ў абрадавых падзеях), нябесным ахоўнікам якіх лічыцца святая пакутніца Варвара, дзень ушанавання якой прыпадае на 18 снежня.

А вось у в. Чарапы некалі існаваў мужчынскі саюз (сёння ў «саюзе» і мужчыны, і жанчыны), а яго нябесным ахоўнікам лічыцца св. Мікалай Цудатворац («зімовы» Мікола, які ўшаноўваецца 19 снежня). Гаспадыня хаты, у якой разгортваліся асноўныя абрадавыя падзеі, Кацярына Дзмітрыеўна Ярмоленка, расказала нам пра некаторыя моманты існавання «Свячы».

Зразумела, сёння немагчыма дакладна акрэсліць той час, калі ўзнікла гэта незвычайная мясцовая традыцыя, аднак жанчына спасылаецца на ўспаміны роднай бабулі, якая нарадзілася ў 1920 г. і абапіралася на словы сваёй бабулі, а тая прыйшла ў гэты свет яшчэ ў 1870 г. і сцвярджала, што неаднаразова ў дзявоцкія гады прысутнічала на «Свячы». Падсумоўваючы рэканструкцыю гістарычных падзей, жанчына прамовіла цудоўную фразу аб глыбіні родавай памяці: ***«Дзяды нашы гулялі, прадзяды, яшчэ прадзедадзей гэта было!»***

Абрад «Свяча» ў в. Чарапы доўжыцца чатыры дні. Перадсвяточныя падзеі распачыналіся 18 снежня, людзі збіраліся для таго, каб абмеркаваць шэраг арганізацыйных пытанняў. Галоўны абрадавы абярэг вёскі — свечку — аддавалі на захаванне таму, хто сутыкнуўся са складанымі абставінамі: муж або сын сталі моцна піць, у некага была спроба суіцыду, у кагосьці паміралі дзеці. Здаралася, што нехта з членаў саюза не жадаў уголас гаварыць пра свае набалелыя праблемы, а проста прасіў людской міласці, спадзеючыся на падтрымку ў складанай жыццёвай сітуацыі.

Далей падзеі разгортваліся ў двух напрамках. З аднаго боку, гаспадыня запрашала да сябе дзяцей, якія павінны былі абысці хаты ўсіх членаў згуртавання і запрасіць іх на святочную бяседу. Другой важнай абрадавай падзеяй быў выраб вялікай аброчнай свечкі. Да гэтага на працягу года ў хаце побач з іконай святога Мікалая Угодніка стаялі дзве вялікія свечкі памерам каля 40 см у вышыню і прыкладна 5—6 см у таўшчыню. Калі ж надыходзіла 18 снежня, гаспадыня павінна была зрабіць своеасаблівую ахвяру — новую свечку. Лічылася за гонар, калі трэцяя свечка будзе самай вялікай. Зробленую свечку з асаблівай павагай ставілі ў посуд з жытам або ўтыкалі ў бохан хлеба.

Асноўныя абрадавыя падзеі разгортваліся на другі дзень, 19 снежня. Па папярэдняй дамоўленасці збор усіх удзельнікаў быў прызначаны на поўдзень. Людзі збіраліся каля сядзібы на вуліцы, а затым усе разам рушылі ў хату. Гаспадыня сустракала іх у вялікіх сенцах. Мужчыны і некаторыя жанчыны прыносілі з сабой на вядры жыта. Збожжа акуратна ссыпалі ў мяшок. На наша пытанне: «А навошта жыта?» мужчыны заўважылі: «Гаспадарам на хазяйства. Каб было што куркам даць. Каб было з чаго самагонку гнаць. Трэба ж для нас стол накрываць».

Госці распраналіся, няспешна кіраваліся да печы. Затым эпіцэнтрам абрадавых падзей станавілася покуць, у якой знаходзіўся прыгожы складаны абраз з выявай Мікалая Угодніка і святых Варвары і Георгія Пераможца.

Пад абразамі была невялікая шуфляда, у якой захоўваліся ахвяраваныя святому Мікалаю грошы: «А можа, ён захоча выпіць, дык каб было за што», — жартавалі мужчыны. Побач у лубцы са збожжам жыта стаялі тры вялікія самаробныя свечкі.

Кожны з гасцей па чарзе падыходзіў да абраза, тройчы хрысціўся (а жанчыны яшчэ і цалавалі выяву святога), а затым пакрываў складзень «намёткай» — кавалкам аднатоннай тканіны даўжынёй прыкладна каля 2 м (каб хапіла на ўсю велічыню складзеня). Адна з жанчын прынесла з сабой сапраўдны саматканы ручнік, які некалі і выконваў ролю жаночага галаўнога ўбору — намёткі.

Пасля той, хто прынёс ахвяру (намётку, грошы, цукеркі, яблыкі і да т.п.), рабіў крок назад, прыпыняўся, і ўголас (каб усе чулі) дзякаваў св. Мікалаю за дапамогу і прасіў падтрымкі ў сямейных і гаспадарчых справах на будучы год. Затым зноў тройчы хрысціўся і адыходзіў да печы. Яго месца займаў наступны ўдзельнік згуртавання.

Гаспадыня хаты запрасіла гасцей за стол. За стол госці заходзілі ад печкі. Мужчыны расселіся па той бок стала, які быў бліжэй да сцяны з вокнамі (а значыцца, вуліцы), а жанчыны — насупраць, бліжэй да печы. Пры гэтым аказалася, што мужчыны селі ў адпаведнасці з узростам: старэйшыя бліжэй да покуці. Менавіта такі прынцып размяшчэння заўсёды быў за памінальным сталом.

Распачаў абрадавую трапезу адзін са старэйшых членаў згуртавання — Віктар Макаравіч Яцкоўскі, які нагадаў, што ўжо на працягу доўгага часу існуе традыцыя шанаваць «свячу» і абраз Міколы Угодніка, накрываць святочны стол і ладзіць бяседу. Перш чым распачынаць святочную трапезу, усім, хто сядзеў за сталом (і нам, гасцям з Мінска), неабходна было прычасціцца трыма невялічкімі долькамі «праскуры»: «Трыма — таму што Бог Тройцу любіць». Аказалася, раніцай многія з прысутных былі на службе ў царкве ў в. Нічыпаровічы, што за тры кіламетры ад в. Чарапы, і ўзялі асвячоную «праскуру».

Людзі налівалі кілішак, гаварылі словы ўдзячнасці, аднак святочнай весялосці не адчувалася. Адзін з прысутных мужчын пачаў павольна расказваць, што раней, «калі Мікола быў у іх хаце», збіралася 70—80 чалавек — столькі, што не хапала месца за сталом, і людзі павінны былі стаяць каля печы. Кожны пачаў успамінаць нешта сваё, стваральчы больш поўную карціну абраду:

Зімовы дзень кароткі, таму бяседа доўжылася крыху больш за дзве гадзіны. Закончылася яна спяваннем некалькіх «псальмаў», якія выконвалі жанчыны. Прыйшоў час, калі гаспадыні неабходна было развітацца з тым, хто на працягу года апекаваўся сямейным шчасцем і хатнім дабрабытам.

Мужчыны паставілі на сярэдзіну хаты невялікі стол, жанчыны заслалі яго абрусам, паставілі непачатую бутэльку гарэлкі і сподачак, на які паклалі два кавалачкі хлеба.

Пасля гэтага ў хаце стала шумна і мітусліва. Да покуці рушылі двое мужчын, асцярожна ўзялі на рукі даволі цяжкі складаны абраз... Далей пачалося запаволенае рытуальнае шэсце вакол пастаўленага ў сярэдзіне хаты стала...

Хата, у якой будзе знаходзіцца абраз Міколы Цудатворца на працягу наступнага года, аказалася зусім недалёка, амаль што насупраць, цераз дарогу.

Метра за паўтара ад брамкі стаялі маладыя муж і жонка (новыя гаспадары «свячы», сын і нявестка той самай жанчыны, у якой захоўвалася свечка дагэтуль): мужчына трымаў у руках непачаты бохан хлеба, а жанчына — кажух.

Тыя, хто нёс абраз, зрабілі некалькі крокаў наперад і прыпынніліся так, што кажух апынуўся пад абразом. У той жа час новы гаспадар «свячы» апусціўся на калені і, трымаючы ў руках бохан хлеба, пачаў пралазіць пад іконай, за ім апусцілася на калені жонка і таксама пайшла ўслед за мужам.

Мы, некалькі чалавек з Мінска, у тым ліку і студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, папрасілі дазволу далучыцца да выканання гэтага незвычайнага рытуальнага дзеяння. Укленчыўшы, мы, хто паўзком, хто на каленях, таксама тройчы «прайшлі» пад абразом (скажам шчыра, што ў гэты момант мы зусім забыліся на свой узрост, сацыяльны статус, хвароbы і ўсё астатняе). Незвычайнае абрадавае дзеянне адначасова зачароўвала і прываблівала, паядноўвала і згуртоўвала сваёй сакральнасцю.

Бясконца шчоўкалі фотаапараты — усім хацелася зафіксаваць сваю нябесна-зямную далучанасць да шматгадовай традыцыі і ціха, пра сябе, таксама папрасіць у Божага ўгодніка Мікалая дапамогі і спагады...

Мужчыны, што трымалі абраз на руках, рушылі далей, у хату новых гаспадароў. Там паставілі абраз на покуць, перахрысціліся і выйшлі на вуліцу. Людзі зноў вярнуліся за святочны стол у тую хату, з якой вынеслі «свячу».

Мы ж дзякавалі Богу, што ў чарговы раз дакрануліся да жывой традыцыі нашага народа. Традыцыі, якая з'ядноўвае людзей, дае ім веру і спадзяванне на тое, што запаветныя мары заўсёды збываюцца. Няхай іх веру асвячае полымя аброчнай свечкі, а галоўная святыня — абраз Міколы Угодніка — мацуе дух і радуе надзеяй на тое, што ўнукі будуць здаровыя і шчаслівыя. Няхай і праз дзесяць гадоў на беларускім застоллі прагучыць тост: «За святога Мікалая Цудатворца! Каб цуды ў нас не пераводзіліся!»

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

P.S.

На заканчэнне хочацца звярнуцца да нашых чытачоў з просьбай: калі ў вашай вёсцы існаваў або да нашых дзён захаваўся абрад «Свячы» (Мікольскай, Варвараўскай, Спасаўскай, Ільінскай, Петрапаўлаўскай або яшчэ якой-небудзь), напішыце ліст на адрас рэдакцыі, у якім хаця б контурна раскажыце пра асаблівасці яе ўшанавання. Мы будзем удзячныя вам, калі вы запросіце нас на яе святкаванне, каб можна было ўсё запісаць на відэакамеру і пакінуць гэты відэазапіс на добры ўспамін нашым нашчадкам. Няхай «Свяча» Мікалая Цудатворцы творыць цуды для ўсяго беларускага народа.

На падставе таго, што нам давялося пачуць у в. Чарапы, у якой да апошняга часу шануюць «свячу», склалася ўражанне, што Мікола Цудатворац з'яўляецца самым галоўным ахоўнікам і заступнікам мясцовага насельніцтва. Вось некалькі прыкладаў таго, аб чым прасілі святога і якую дапамогу ад яго атрымалі (запісана ад жыхароў в. Чарапы):

«Я ўжо пяцёра дзяцей вывучыла, хацела, каб і шостая ўнучка паступіла ва ўніверсітэт. Цяпер і яна вучыцца».

«Мая маці мяне вучыла маліцца святому Мікалаю. Молімся аб перасцярозе ад пажару, калі над вёскай пачынаецца навальніца».

«Калі мужчыны ходзяць на рыбалку, таксама просяць у яго ўдачы. Увогуле, усё, што звязана з вадой — купанне, плаванне, лоўля рыбы, мыццё бялізны — апякуецца гэтым святым».

«Мікола Угоднік спрыяе захаванню здароўя. Калі чалавек пакутуе ад якой-небудзь цяжкай хваробы, ён абавязкова імкнецца пралезці пад іконай святога ў час яе пераносу з хаты ў хату і ў гэты момант просіць Міколу Цудатворца «забраць» хваробу».

«Па дапамогу да яго звяртаюцца пры пасадцы бульбы, гуркоў, цыбулі, капусты».

«Калі якая-небудзь дзяўчына доўгі час не можа выйсці замуж, яна таксама просіць дапамогі ў Міколы Угодніка».

«Здароўе дае Мікалай, але толькі калі ты ў душы Бога носіш. ***Не хрысціся, не маліся, але ў душы Бога насі».***

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

Лясныя мелодыі

Па гарызанталі: 1. Калонка лічбаў, кароткіх радкоў у газеце, часопісе. 6. Лазовы хмызняк; паводле беларускіх паданняў, у ... селяцца чэрці, якія выходзяць з вады пасля асвячэння яе на Вадохрышча. 11. Сукупнасць мерапрыемстваў па арганізацыі і вядзенні лясной гаспадаркі. 12. Зарасняк ясакар. 13. Гатунак белай гліны, што ідзе на выраб фаянсу. 15. Лёгкая лодка або платформа з ветразем для катання на лёдзе. 16. Дзе ... — там і грыбы (прык.). 17. Перапісаны тэкст чаго-небудзь. 18. У сваёй хаце і качарга ... (прык.). 19. Дрэва сямейства кляновых; у беларускіх легендах і паданнях ... — маладзец, ператвораны ў дрэва праз праклён маці. 20. Лісцевае дрэва; у беларускіх павер'ях — апякунка маці і дзяўчат у пытаннях, звязаных са шлюбам і нараджэннем дзяцей. 21. Невялікая рыба сямейства карпавых, якая водзіцца ў чыстых водах рэк і азёр. 22. Месца, памяшканне, дзе зімуюць або спыняюцца зімой людзі. 29. Рабочы, спецыяліст, заняты вырабам інструментаў. 30. Дрэва, якое ў беларусаў лічылася помслівым — хто яго ссячэ, той неўзабаве памрэ; паводле беларускай легенды, ... выраслa з крывавых слёз Евы, калі яе Бог выгнаў з раю. 31. «Ой, бярозы вы сосны\\ Партызанскія ...,\\Ой, шумлівы ты лес малады». З верша — песні «Лясная песня».

Па вертыкалі: 2. «Палац мой — лес буйны, вяцвісты — \\рдзіцца брыльянтамі скрозь,\\Мне воўк і мядзведзь у паслугах,\\Мне служаць вавёрка і ...». З верша Я. Купалы «Мароз». 3. Фаза Месяца, калі відаць увесь яго дыск. 4. Харaство, прыгажосць. 5. «... табе, вольха!\\Ты самая мужная і адданая\\ Захавальніца нашых рэчак». З верша П. Панчанкі «Раўнапраўе дрэў». 6. Кучаравая пасма валасоў. 7. Недагляд, промах (разм.). 8. Дзіцяня авечкі. 9. Прыстасаванне для здымання пладоў з дрэў. 10. Участак, дзе вядзецца нарыхтоўка лесу. 14. «Пад тым дубам ... стаяла,\\Там дзяўчына ваду набірала». З беларускай народнай песні «Туман ярам». 15. Птушаня бусла. 22. «Ой, дзядуля, Дзед Мароз,\\ Сып на ёлку ...!». З верша І. Цітаўца «Карагод». 23. Чорная .... Ядавітая афрыканская змяя. 24. Прадмет, з якім ходзяць у лазню; лічылася, што бярозавы ... увасабляе мужчынскую моц, здароўе. 25. ... -капітан. У царскай рускай арміі афіцэрскі чын у пяхоце, артылерыі і інжынерных войсках. 26. Трапічная расліна з тоўстым мясістым лісцем; выкарыстоўваецца ў медыцыне. 27. На Новы год ... — будзе ў гумне цясна (прык.). 28. Невялікая птушка сямейства юрковых.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Сугрок. 6. Лазняк. 11. Лесаўтварэнне. 12. Маці-і-мачыха. 19. Явар. 20. Лілія. 21. Лінеј. 22. Зімаваціца. 29. Інструмент. 30. Радіна. 31. Сістры.

Па вертыкалі: 2. Лось. 3. Поўня. 4. Краса. 5. Слава. 6. Лоскан. 7. Завок. 8. Ліпа. 9. Плаціхвост. 10. Лесагаспадарка. 14. Крыніца. 15. Бусляня. 22. Зорка. 23. Мамба. 24. Венік. 25. Штабс. 26. Альбіс. 27. Ясна. 28. Шчур.

Веру Іванаўну ПАТОЦКУЮ з горада Новалукомля калегі віншуюць з 55-гадовым юбілеем!

Зычым табе моцнага здароўя без лекаў, шчасця і поспехаў!

■ Беларускія напоі

ТУТ І ПІВА, ТУТ І ЗБІЦЕНЬ, І МЯДУХА З МЕДАВУХАЙ

Моладзевы конкурс «Летапіс напояў у цэнтры Еўропы» завяршыўся ўручэннем пераможцам грашовых прызоў у 18 мільёнаў рублёў (першыя месцы ў намінацыях «Напоі без градуса» і «Напоі з градусам») і 6 мільёнаў рублёў (другое месца ў абедзвюх намінацыях). Паўгода беларуская моладзь шукала цікавыя звесткі, звязаныя з культурай ужывання напояў на тэрыторыі роднага краю. Арганізатарам такога спаборніцтва выступіла ААТ «Лідскае піва» пры навуковай падтрымцы Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі.

У аргкамітэт паступілі 23 работы з Мінска, Гомеля, Гродна, Віцебска, Магілёва, Слоніма ад студэнтаў, аспірантаў і працоўнай моладзі. **Летапіс у намінацыі «Напоі без градуса» напоўнілі рэцэпты і легенды пра квас, збіцень, расол, кісель, морс, кляновік, бярозавік, іван-чай, каву, мядуху. У намінацыю «Напоі з градусам» паступілі гістарычныя факты і хатнія гісторыі пра піва, слабаалкагольнае віно, збіцень, медавуху.**

— Наша кампанія, якой вось ужо 137 гадоў, не першы год займаецца аднаўленнем гісторыі, — адзначыла **дырэктар па маркетынгу ААТ «Лідскае піва», член журы конкурсу Людміла ЛЫТКІНА.** — Сёлета ўжо выйшаў летапіс завода — кніга «Гісторыя Лідскага бровара: 1876—2012 гг.», быў зняты фільм, у якім паказана, як гатуюцца нашы прадукты. Летась прадпрыемства аб'явіла першы конкурс па зборы легендаў аб піваварэнні ў Беларусі. Усё ж такі некалі піваварэнне было вельмі папулярным у нашай краіне. Піўныя бровары размяшчаліся досыць шчыльна. Паступова, з перасяленнем людзей у буйныя населеныя пункты, гарады, гэтыя традыцыі пачалі адміраць і губляцца. Але гэта наша гісторыя, частка культуры, якую трэба ведаць. Падчас збору інфармацыі пра піва высветлілася, што цікавыя звесткі збіраюцца і пра іншыя папулярныя напоі. Таму сёлета было вырашана пашырыць тэматыку да безалкагольных і слабаалкагольных напояў...

У намінацыі **«Напоі без градуса»** перамагла работа «Іван-чай і яго чароўныя вартасці» студэнткі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аліны Берасневіч. Аліна «раскапала» ў адным з мястэчкаў цікавае паданне пра Яніну-прыгажуню і Івана — яе жаніха. Не дапусціць вяселля задумала злая вядзьмарка, якая напаіла Івана шкодным зеллем, і забыўся той на сваю каханую. Калі ж Яніна да вядзьмаркі па дапамогу прыйшла, тая і параіла: знайдзі кветку запаветную, перадай кветцы ўсю сваю любоў ды напаі Івана адварам з яе. А як напоіш, дык уся твая прыгажосць птушкай у неба адляціць. Піў Іван адвар, і моц да яго вярталася, а Яніна слабела на вачах. Калі ж Іван цалкам ачуняў ды захацеў пацалаваць каханую, тая... ператварылася ў сінічку, якая знікла пад аблокамі. Любоў жа Яніны дагэтуль у іван-чаі жыве...

У намінацыі «Напоі з градусам» перамагла работа «Вытворчасць піва ў маёнтках князёў Радзівілаў» студэнта Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Арцёма Дамуця. Арцём знайшоў апісанне інвентару броварaў у маёнтках Радзівілаў (**Данюшава**, 1640 г., цяпер Смаргонскі р-н; Іўе, 1598 г., цяпер Гродзенская вобл.; **Крывічы**, 1606 г., цяпер Мядзельскі р-н; **Любча**, 1601, 1663, 1754 гг. (каля г. Навагрудак); **Смаргонь**, 1621, 1689, 1788 гг.; **Холхла**, 1646 г., цяпер Маладзечанскі р-н; Цімкавічы, 1691, 1713, 1761 гг., цяпер Капыльскі р-н; Чашнікі, 1629 г., цяпер Віцебская вобл.).

Вось як апісваецца, напрыклад, інвентар у Цімкавічах (1730):

«Гаспадарскі двор... Далей знаходзіцца саладоўня, новапабудаваная, з сасновага лесу, крытая гонтай. Вароты ў сені дашчатыя, з драўлянымі запорамі. Налева памяшканне для заліўкі соладу. Туды вядуць дзверы з дошак, на стрыжні, з драўляным замком. Незашклёнае акно з засаўкай. Простая глінабітная печка і паліцы з дошак для рашчэння соладу. Столь з дошак. Насупраць гэтага памяшканне для замочвання соладу другое памяшканне — сушыльня. Туды вядуць дзверы з дошак на стрыжні. На земляной падлозе нізкая цагляная печка з навесам. Насціл з дошак. На насціле сушыльня або сцелаж для прасушкі соладу. Кадка для заліўкі соладу. Наверх вядзе шырокая лесвіца з брусоў і дошак. У сярэдзіне сенцаў калода для кавадла. Проста за ёй драўляная піварня, крытая гонтай. Дашчатыя вароты з драўлянымі запорамі. Печ з цэглы і гліны. 2 кадкі, 1 дзяжа, 1 чан, 2 піўныя карыты. У святліцу дзверы на стрыжні. У ёй пабіта незашклёнае акно з засаўкай. Печка проста на земляной падлозе. Жолаб 1. Перад броварам студня з драўляным зрубам і журавом...».

Кожная з дасланых работ была па-свойму цікавай. Аспірантка кафедры этналогіі, музеялогіі і мастацтвазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Алена Антановіч вось як распавядала сваю гісторыю парэчкавага віна: «...мае бабуля з дзядулем пасля таго, як пабудавалі дом (на тыя часы ў невялікім мястэчку Чырвоная Слабада, цяпер гэта ўжо даволі вялікі пасёлак у Салігорскім раёне Мінскай вобласці), пасадзілі новы прыгожы сад. Кусты парэчак раслі вельмі хутка і давалі добры ўраджай. У пачатку 50-х гадоў XX стагоддзя, як узгадвала бабуля, парэчак урадзіла столькі, што яна і не ведала куды іх дзець. Тады вырашыла паспрабаваць прыгатаваць уласнае парэчкавае віно. Прапорцыі яна ўзяла... «на вока». Дзеду адразу не сказала, бо баялася, што будзе наракаць за тое, што ягады і цукар (які ў тыя часы быў вельмі дарагі) дарэмна пераводзіць. На бабуліна шчасце, віно атрымалася вельмі добрым, прыгожага колеру, духмяным, мяккім і не моцным. Віно спадабалася усёй сям'і, менавіта з тых часоў яго гатуюць у нас кожны год...».

Святлана БАРЫСЕНКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.24	16.48	7.24
Віцебск	9.22	16.30	7.08
Магілёў	9.15	16.38	7.23
Гомель	9.02	16.43	7.41
Гродна	9.38	17.05	7.27
Брэст	9.30	17.14	7.44

Месяц

Поўня 17 снежня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Генадзя, Захара, Савы, Сяргея.*
К. *Ларысы, Багуслава, Віктара, Паўла.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



…у суседзяў

ВАРШАВА	+1..+3°С	КІЕЎ	0..+2°С
ВІЛЬНЮС	0..+2°С	МАСКВА	-4..-2°С
РЫГА	+1..+3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-2..0°С

УСМІХНЕМСЯ

Мой прыехаў з камандзіроўкі. І адразу і ў шафу зазірнуў, і пад ложак залез, і балкон абмацаў.

Я ляжу і ўсміхаюся... Шукай-шукай, дарагі... Я сама першы дзень дома.

У прыродзе ёсць тры віды істот, якія пры мінус 25 ніколі не мерзнуць:
1) пінгвіны;
2) белыя мядзведзі;
3) дзяўчаты ў міні-спадніцах і без шапак.

Самая вялікая памылка ў жанчын — «Ён зменіцца».

Самая вялікая памылка ў мужчын — «Возьмем літр, павінна хапіць».

Сусед злавіў Вовачку ў сябе на яблыні.

— Вовачка! Ты зноў за сваё? Вось я з тваім бацькам пагавару!...

Вовачка ўздымае галаву ўгору:

— Тата, злазь! Тут з табой дзядзька Коля пагутарыць хоча...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.398. Індэкс 63850. Зак. № 5456.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 снежня 2013 года.